Б.А. МАНАК

# НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

## рэгіянальныя асаблівасці развіцця і рассялення



Б.А. МАНАК

# НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

## рэгіянальныя асаблівасці развіцця і рассялення

Мінск
«Універсітэцкае»
1992

ББК 60.7
М 23
УДК 911.3

Рэцэнзент *Я. І. Рубін,* доктар эканамічных навук

1805060000—062
М————————41—91
М 317(03)—92

ISBN 5-7855-0420-0

© Б. А. Манак, 1992

## ЗМЕСТ


Ад аўтара . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

1. РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ДЭМАГРАФІЧНАЙ СІТУАЦЫІ . . . . . . . . . . . . . . . 7

1.1. Характар дынамікі насельніцтва . . . . . . 9
1.2. Новыя рысы ў характары дынамікі насельніцтва ў 80-я гг. . . . . . . . . . . . . 11
1.3. Характар узнаўлення насельніцтва . . . . . . 15
1.4. Эвалюцыя полаўзроставай структуры . . . . . 22
1.5. Дэмаграфічная сітуацыя ў гарадах . . . . . . 26
1.6. Дэмаграфічная сітуацыя ў сельскіх пасяленнях . . 35

2. ХАРАКТАР МІГРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ . . . . . 45

2.1. Агульныя тэндэнцыі . . . . . . . . . . 45
2.2. Геаграфія міграцыйных перамяшчэнняў у 70—80-я гг. 50
2.3. Асноўныя рысы і праблемы ўнутранай міграцыі . . 61
2.4. Канцэпцыя міграцыйнай палітыкі . . . . . . 71

3. САЦЫЯЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ НАСЕЛЬНІЦТВА І ПРАЦОЎНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГАРАДСКІХ І СЕЛЬСКІХ ПАСЯЛЕННЯЎ . . . . . . . . . . . . . . . 77

4. РАЗМЯШЧЭННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА І ЎЗРОВЕНЬ ЗАСЕЛЕНАСЦІ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ . . . . . . . 88

4.1. Тэрытарыяльнае размеркаванне насельніцтва . . . . 88
4.2. Узровень заселенасці тэрыторыі Беларусі . . . . . 99

5. ХАРАКТАР РАССЯЛЕННЯ І ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ . . . . . . . . . . . . . . . 111

5.1. Сутнасць працэсу і агульныя рысы . . . . . . 111
5.2. Тэндэнцыі дынамікі рассялення . . . . . . . 124
5.3. Уплыў рэгіянальных фактараў на працэс рассялення . 128

6. УЗДЗЕЯННЕ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ НА ГЕАГРАФІЮ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ . . . . . 134

Спісак рэкамендуемай літаратуры . . . . 152

Дадатак 1. Дынаміка насельніцтва Беларусі ў XX стагоддзі 155
Дадатак 2. Колькасць насельніцтва сельскіх раёнаў Беларусі 156
Дадатак 3. Колькасць насельніцтва ў гарадскіх пасяленнях Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . 162
Дадатак 4. Пералік гарадскіх пасяленняў, утвораных у Беларусі за перыяд з 1944 па 1990 г. . . . . . . . . 168
Дадатак 5. Размеркаванне сельскіх раёнаў і гарадскіх пасяленняў Беларусі па колькасці насельніцтва ў 1992 г. . . 169

## АД АЎТАРА

На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праяўляюцца агульныя заканамернасці і тэндэнцыі развіцця народанасельніцтва, уласцівыя на сучасным этапе ўсім развітым краінам. Разам з тым маюць месца многія адметныя рысы, характэрныя толькі для гэтага рэгіёну. Яны склаліся паступова пад уздзеяннем розных фактараў. Так, да цяперашняга часу ў развіцці ўсіх дэмаграфічных працэсаў адчуваюцца тыя надзвычайна вялікія страты насельніцтва, якія мела рэспубліка ў гады другой сусветнай вайны.

Вельмі вялікі ўплыў на геаграфію насельніцтва Беларусі аказалі розныя формы міграцыі, якія былі выкліканы не толькі эканамічнымі, але і палітычнымі прычынамі. Таму міграцыю неабходна разглядаць як асаблівы фактар дынамікі насельніцтва рэспублікі.

У сучасны момант непрадбачаныя зрухі ў развіцці і размяшчэнні насельніцтва выклікаюць экалагічныя фактары, сярод якіх выключным па ўздзеянню з'яўляецца радыяцыйнае забруджванне тэрыторыі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

Такім чынам, аб'ектыўны ход развіцця насельніцтва рэспублікі ўвесь час парушаецца, што патрабуе дадатковых чалавечых намаганняў, каб выправіць становішча, каб выжыць і ўзнавіць страчаны патэнцыял. Без уліку гэтых асаблівасцей нельга растлумачыць многія рысы сучаснага сацыяльна-дэмаграфічнага развіцця на тэрыторыі Беларусі, прадбачыць іх тэндэнцыі ў будучым.

Нягледзячы на невялікую плошчу, Рэспубліка Беларусь мае вельмі выразныя ўнутраныя адрозненні ў геаграфіі насельніцтва, якія таксама патрабуюць дасканалага вывучэння дзеля таго, каб больш абгрунтавана весці гаспадарчую дзейнасць і ажыццяўляць меры сацыяльнай палітыкі.

У адрозненне ад многіх публікацый, напісаных галоў-

ным чынам у дэмаграфічным плане, прапанаваная чытачу кніга носіць геаграфічны характар і мае мэтай з дапамогай метадаў параўнальнага аналізу адлюстраваць унутраныя і знешнія асаблівасці тых ці іншых працэсаў у развіцці і рассяленні насельніцтва Беларусі, выявіць іх дадатныя і адмоўныя рысы.

Матэрыял кнігі размешчаны як бы ў два паверхі. Першы паверх — гэта тая дэмаграфічная аснова, той каркас у размяшчэнні насельніцтва, якія сфарміраваліся да сярэдзіны 80-х гг. ва ўмовах мірнага пасляваеннага 40-годдзя. Гэта быў асаблівы перыяд у гісторыі развіцця рэспублікі ў XX стагоддзі. Яго можна назваць перыядам «зацішша» і мірнай стваральнай працы паміж двума разбуральнымі катастрофамі — ваенна-палітычнай у пачатку 40-х гг. і атамна-экалагічнай у канцы 80-х гг.

Другая палавіна 80-х гг. ужо не ўпісваецца ў склаўшуюся карціну сацыяльна-дэмаграфічнага развіцця двух пасляваенных пакаленняў. Трэцяе пакаленне пачынае жыць у новых умовах. 1986 год у геаграфіі насельніцтва Беларусі выступае як своеасаблівы рубеж, які аддзяляе усталяваныя заканамернасці і тэндэнцыі ад новай сітуацыі, выкліканай непрадбачанай экалагічнай катастрофай. Яна ў першую чаргу закранула жыхароў рэспублікі, стварыла на яе тэрыторыі надзвычайную экалагічную абстаноўку. З гэтага рубяжа адлік часу вядзецца як «да і пасля аварыі». Другая палавіна 80-х гг. XX стагоддзя ўвойдзе ў гісторыю Беларусі як перыяд экалагічнай дэпрэсіі, у выніку якой нанесены цяжкі ўрон тэрыторыі рэспублікі, яе прыродным, людскім і матэрыяльным рэсурсам, парушаны ход развіцця эканамічных, дэмаграфічных і нават прыродных працэсаў.

У палітычным і сацыяльна-эканамічным плане другая палавіна 80-х гг. таксама адрозніваецца ад мінулых. Яна ўвойдзе ў гісторыю як перыяд перабудовы, які суправаджаецца ўзмацненнем нацыянальнага суверэнітэту, дэмакратызацыяй сацыяльнага развіцця, пераўтварэннямі ў эканамічным базісе. Гэтыя змены выступаюць у якасці асаблівай рухаючай сілы ў геаграфіі насельніцтва. У першую чаргу сваё ўздзеянне яны аказалі на працэс міграцыйнага перамяшчэння людзей, атрымаўшых больш свабоды і магчымасцей. Паступова закранаецца характар занятасці працоўных рэсурсаў, што ў сваю чаргу выклікае змены ў размяшчэнні насельніцтва і яго ўзнаўленні.

Такім чынам, з другой палавіны 80-х гг. пачынаецца новы этап у геаграфіі насельніцтва Беларусі. Некаторыя яго рысы па магчымасці адлюстраваны ў выглядзе «другога паверху» пры размеркаванні матэрыялу кнігі.

Усе тыя асаблівасці ў развіцці і размяшчэнні насельніцтва Беларусі, якія ўдалося адлюстраваць на старонках кнігі, на працягу многіх гадоў вывучаліся аўтарам сумесна са студэнтамі геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта ў садружнасці з такімі вядучымі навуковымі і праектнымі арганізацыямі, як Акадэмія навук, Беларускі інстытут горадабудаўніцтва. Цесныя сувязі былі з Маскоўскім цэнтрам па вывучэнню праблем народанасельніцтва. Аўтар выказвае ўдзячнасць усім тым, з кім яму пашанцавала супрацоўнічаць і давесці да чытача свае думкі.

Гэта кніга — плён падвіжніцтва, бо напісана яна ў вольны ад нялёгкай педагагічнай працы час. Сілы і сродкі аддадзены ёй дзеля таго, каб не перарывалася нітачка часу, каб наступныя пакаленні ведалі, як выглядала геаграфія насельніцтва Беларусі ў 70—80-я гг. XX стагоддзя. Яна як бы фатаграфуе тое асяроддзе, у якім жыў і працаваў аўтар. Да гэтага часу абагульняючая характарыстыка насельніцтва рэспублікі была толькі ў кнізе А. А. Ракава, якая была надрукавана ў 1969 г.

Прапанаваная чытачу кніга з'яўляецца вынікам крапатлівай шматгадовай навукова-даследчай працы. Таму пісалася яна лёгка, як подых душы, якой не было спакою і хацелася падзяліцца накопленымі ведамі з нашчадкамі. На развітанне хочацца сказаць: «Вось Вам, дарагія суайчыннікі, плён маёй працы, бярыце яго, карыстайцеся і не забудзьце прадоўжыць у наступныя гады».

## 1. РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ДЭМАГРАФІЧНАЙ СІТУАЦЫІ

Дэмаграфічная сітуацыя характарызуецца станам дынамікі, натуральнага руху, міграцыі і структуры насельніцтва ў адпаведны перыяд на адпаведнай тэрыторыі. Дэмаграфічная сітуацыя — гэта вынік не толькі натуральных працэсаў узнаўлення пакаленняў людзей, у аснове якіх ляжыць нараджальнасць і смяротнасць, але і аб'ектыўна дзеючых сацыяльна-эканамічных заканамернасцей. Той ці іншы стан дэмаграфічных працэсаў у дадзены момант у многім дэтэрмінаваны тымі падзеямі, якія адбываюцца ці адбываліся ў мінулым. Пад іх уплывам могуць быць змены ў структуры насельніцтва па полу і ўзросту, у стане яго здароўя, дэмаграфічных паводзінах і адносінах, напрыклад, да шлюбу ці разводу, планаванню сям'і, удзелу ў той ці іншай форме міграцыі і г. д. Пад уплывам розных фактараў дэмаграфічная сітуацыя можа змяняцца, паляпшацца ці пагаршацца.

Перш чым характарызаваць рысы сучаснай дэмаграфічнай сітуацыі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, неабходна адзначыць некаторыя асаблівасці яе развіцця на працягу XX стагоддзя, якія ўплывалі на ход дэмаграфічных працэсаў.

На працягу XX стагоддзя развіццё ўсіх працэсаў, якія адлюстроўваюць геаграфію насельніцтва Беларусі, ішло вельмі складана, часта перарывалася, парушалася, рэзка мянялася пад уздзеяннем розных палітычных, сацыяльна-эканамічных і іншых фактараў (рыс. 1.1). Рэзка парушаны ход крывых на рысунку — наглядны доказ таму.

Усе фактары ўздзеяння на развіццё насельніцтва рэгіёна можна падзяліць на стваральныя і разбуральныя. Разбуральныя — гэта тыя, якія вядуць да страт насельніцтва ці рэзка парушаюць стваральны ход яго развіцця.

Асаблівасць Беларускага рэгіёну заключаецца ў тым, што на яго тэрыторыі вельмі выразна праявілася ўздзеянне іменна разбуральных фактараў. У іх ліку першая і другая сусветныя войны і неаднаразовыя лакальныя ваенныя падзеі; хвалі голаду, эпідэмій, бежанства, міграцый; палітычныя рэпрэсіі, дэпартацыі; тэхнічныя, экалагічныя катастрофы і г. д. У выніку з усіх гадоў, пражытых у XX стагоддзі, палавіна характарызуецца або




Рыс. 1.1. Дынаміка гарадскога і сельскага насельніцтва Беларусі ў XX стагоддзі

вялікімі стратамі насельніцтва, або іх кампенсацыяй (1915—1925, 1941—1972, 1986—1991, гл. Д 1).

У сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі таксама ёсць шмат асаблівасцей, якія паскорылі дэмаграфічную рэвалюцыю, у выніку чаго ад расшыранага тыпу ўзнаўлення насельніцтва вельмі хутка перайшло да простага і наблізілася да «нулявога» варыянту. Сярод асаблівасцей гэтага тыпу трэба адзначыць, што рэспубліка перажыла рэзкія зрухі ў сацыяльна-эканамічным развіцці і ў кароткі перыяд, у асноўным за 60—80-я гг., перайшла ў разрад індустрыяльна развітых краін. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што іменна на гэтыя 30 гадоў прыпадае бум індустрыяльнага развіцця рэспублікі і як вынік — бум урбанізацыі. Ужо той факт, што колькасць гараджан за гэты час павялічылася амаль у 3 разы, гаворыць сам за сябе. Адсюль вынікае рэзкі і масавы пераход усё большай часткі насельніцтва да несельскагаспадарчых відаў дзейнасці, да гарадскога ладу жыцця.

Гэта ў сваю чаргу суправаджалася хуткім развіццём адукацыі, павелічэннем узроўню занятасці насельніцтва, у тым ліку жанчын, актывізацыяй тэрытарыяльных і сацыяльных перамяшчэнняў працоўных рэсурсаў. Адбылася змена прыярытэтаў у сям'і, дзе асаблівае месца заняў прэстыж сацыяльнага становішча ў грамадстве. Дамінуючай стала маладзетная сям'я, рэзка зніжаецца ўзровень нараджальнасці.

Змены ў дэмаграфічнай сітуацыі адбыліся за вельмі кароткі тэрмін і так выразна, што гэты факт можна аднесці да галоўнай дэмаграфічнай асаблівасці Беларусі. Яе нават называюць «фенаменальнай», як, напрыклад, у Японіі.

Ніжэй будуць разгледжаны рэгіянальныя асаблівасці развіцця асноўных дэмаграфічных працэсаў у перыяд 60—80-х гг.

## 1.1. ХАРАКТАР ДЫНАМІКІ НАСЕЛЬНІЦТВА

Адметнай асаблівасцю дэмаграфічнай сітуацыі гэтага перыяду з'яўляецца рэзкі спад у тэмпах росту насельніцтва. Беларусь разам з краінамі Прыбалтыкі, Украінай і Расіяй увайшла ў лік тых рэгіёнаў, дзе паказчыкі прыросту насельніцтва вельмі нізкія. У 1990 г. сярэднегадавы прырост знізіўся амаль да нуля (табл. 1.1).

Па гэтай прычыне Беларусь па колькасці насельніцт-

*Табліца 1.1*

**Сярэднегадавыя тэмпы прыросту насельніцтва, %**

| Краіны | 1959—1969 | 1970—1978 | 1979—1988 | 1990 |
|---|---|---|---|---|
| Расійская Федэрацыя | 0,9 | 0,7 | 0,7 | 0,3 |
| Украіна | 1,1 | 0,6 | 0,4 | 0,2 |
| Беларусь | 1,0 | 0,7 | 0,7 | 0,01 |
| Узбекістан | 3,5 | 3,0 | 2,2 | 1,9 |
| Казахстан | 3,1 | 1,4 | 1,2 | 0,6 |
| Грузія | 1,4 | 0,8 | 0,8 | 0,1 |
| Азербайджан | 3,0 | 1,9 | 1,6 | 1,1 |
| Літва | 1,3 | 0,9 | 0,8 | 0,1 |
| Малдова | 2,0 | 1,1 | 0,9 | 0,1 |
| Латвія | 1,1 | 0,7 | 0,6 | —0,2 |
| Кыргызстан | 3,3 | 2,1 | 2,0 | 1,3 |
| Таджыкістан | 3,5 | 3,1 | 3,0 | 2,1 |
| Арменія | 3,2 | 2,2 | 0,8 | 0,3 |
| Туркменія | 3,3 | 2,8 | 2,5 | 2,5 |
| Эстонія | 1,2 | 0,9 | 0,7 | —0,06 |

*Табліца 1.2*

**Параўнальная дынаміка сельскага насельніцтва**

| Рэспублікі, рэгіёны | Колькасць сельскага насельніцтва, млн. чал. | | Змяненне (прырост (+), змяншэнне (—)) |
|---|---|---|---|
| | 1940 г. | 1989 г. | |
| Расія | 72,2 | 39,0 | —46,0% |
| Украіна | 27,3 | 17,1 | —37,4% |
| Беларусь | 7,1 | 3,5 | —50,7% |
| Казахстан | 4,3 | 7,1 | +1,6 раза |
| Малдова | 2,2 | 2,3 | +4,4% |
| Прыбалтыйскі (Літва, Латвія, Эстонія) | 4,1 | 2,4 | —41,5% |
| Сярэднеазіяцкі | 8,2 | 19,8 | +2,4 раза |
| Закаўказскі | 5,6 | 6,7 | +1,2 раза |

ва з трэцяга месца, якое яна займала да рэвалюцыі і ў даваенны перыяд, перамясцілася на пятае сярод краін Садружнасці, уступіўшы Казахстану і Узбекістану.

Асаблівасць дынамікі насельніцтва заключаецца таксама ў тым, што Беларусь вызначаецца найбольшым змяншэннем колькасці сельскага насельніцтва. У параўнанні з 1940 г. гэта колькасць зменшылася на палавіну. За гэты ж перыяд колькасць сельскага насельніцтва ў Сярэдняй Азіі і Казахстане павялічылася ў 2 разы (табл. 1.2).

Пры гэтым тэмп змяншэння колькасці сельскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ўвесь час павялічваецца: у 60-я гг. ён складаў 0,8% у год, у 70-я павялічыўся да 1%, а ў 80-я дасягнуў 2% у год. Нарастаючая інтэнсіўнасць працэсу абумоўлена адначасовым дзеяннем наступных фактараў: цяжкіх вынікаў вайны, вялікімі міграцыйнымі стратамі, рэзкім падзеннем натуральнага прыросту і стратамі, выклікаными чарнобыльскай катастрофай. За пасляваенныя гады сельскія пасяленні забяспечылі 2/3 прыросту насельніцтва гарадоў рэспублікі, аддаўшы ім амаль 3 млн. чалавек. Акрамя таго, яны пастаянна давалі мігрантаў за межы рэспублікі, у розныя раёны былага СССР. Паколькі абсалютная большасць сельскіх мігрантаў — асобы маладога ўзросту, то іх страты прывялі да старэння сельскага насельніцтва, якое пазбавілася свайго ранейшага ўзнаўленчага патэнцыялу.

У тэрытарыяльным плане прырост насельніцтва мелі ў асноўным прамысловыя цэнтры, якія хутка раслі, і зоны іх бліжэйшага акружэння. Вакол іх утварыліся зоны змяншэння насельніцтва, якія пашыраюцца па меры аддалення ад гарадоў і транспартных магістралей. Самая вялікая зона змяншэння насельніцтва ўтварылася ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі, у межах Віцебскай і Магілёўскай абласцей, дзе толькі пяць раёнаў (Віцебскі, Полацкі, Аршанскі, Магілёўскі, Бабруйскі) мелі ў апошнія 10 гадоў прырост насельніцтва.

У цэнтральнай зоне вакол Мінска становішча больш спрыяльнае, а затым зноў утвараецца зона рэзкага змяншэння па лініі: Астравец—Іўе—Дзятлава—Зэльва—Камянец, дзе асноўнымі палюсамі прыцягнення насельніцтва сталі Гродна, Баранавічы, Брэст. На поўдні і паўднёвым усходзе таксама ўзніклі зоны змяншэння насельніцтва там, дзе аказалі свой уплыў Гомель, Мазыр, Пінск, Салігорск.

Раёны, дзе адбылося самае вялікае змяншэнне насельніцтва, маюць найбольш складаную дэмаграфічную сітуацыю і абмежаваныя магчымасці фарміравання працоўных рэсурсаў, што неспрыяльна адбіваецца на эканамічным развіцці. Іх тэрыторыі «разушчыльніліся», павялічылася зямельная нагрузка на кожнага працаўніка сельскай гаспадаркі, і калі яна не кампенсуецца больш высокай прадукцыйнасцю працы, ствараюцца цяжкасці ў выкананні сельскагаспадарчых работ. У гэтых раёнах моцна парушылася структура насельніцтва, яно працягвае «старэць» і не забяспечвае замену старых пакаленняў новымі.

### 1.2. НОВЫЯ РЫСЫ Ў ХАРАКТАРЫ ДЫНАМІКІ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 80-я гг.

Пачынаючы з другой палавіны 80-х гг. фарміраванне і развіццё насельніцтва Беларусі адбываецца ў новых сацыяльна-эканамічных, палітычных і нават экалагічных умовах. У сувязі з гэтым змяніліся рухаючыя сілы і характар дынамікі насельніцтва. Гэтыя змены маюць адлюстраванне ў наступным.

Зрухі ў колькасці насельніцтва атрымоўваюць усё больш выразны напрамак у бок змяншэння, якое адбываецца з прычыны натуральных страт, міграцыі, у тым ліку ў замежныя краіны, прамых і ўскосных вынікаў чарнобыльскай катастрофы, ад уздзеяння розных знеш-

а


ПОЛАЦК
ВІЦЕБСК
ГЛЫБОКАЕ
ОРША
МАЛАДЗЕЧНА
БАРЫСАЎ
ЛІДА
МАГІЛЕЎ
ГРОДНА
МІНСК
КРЫЧАЎ
БАРАНАВІЧЫ
СЛУЦК
БАБРУЙСК
ЖЛОБІН
БРЭСТ
ЖЫТКАВІЧЫ
ГОМЕЛЬ
ПІНСК
МАЗЫР

б


1
2
3
4
5
6
ПОЛАЦК
ВІЦЕБСК
ГЛЫБОКАЕ
ОРША
МАЛАДЗЕЧНА
БАРЫСАЎ
ЛІДА
МАГІЛЕЎ
ГРОДНА
МІНСК
КРЫЧАЎ
БАРАНАВІЧЫ
СЛУЦК
БАБРУЙСК
ЖЛОБІН
ГОМЕЛЬ
БРЭСТ
ПІНСК
ЖЫТКАВІЧЫ
МАЗЫР

ніх прычын (узброеных канфліктаў, траўматызму, злачынства, самагубства і г. д.).

У мінулым, калі мелі месца страты ў колькасці насельніцтва, Беларусь магла кампенсаваць іх за кошт значнага натуральнага прыросту. На сучасным этапе натуральны прырост знізіўся да такога ўзроўню, што не можа кампенсаваць нарастаючыя страты. У гэтым заключаецца асноўнае адрозненне сучаснага этапу ад мінулых.

Дынаміка сельскага насельніцтва Беларусі на працягу ўсяго XX стагоддзя суправаджалася стратамі і вяла да змяншэння яго колькасці. Сама па сабе гэта з'ява не новая. Іншымі з'яўляюцца толькі фактары дынамікі. Раней страты сельскага насельніцтва выклікалі або войны, або міграцыі (унутраныя і знешнія). Цяпер жа ў змяншэнні колькасці сельскага насельніцтва ўдзельнічаюць два новыя фактары: дэпапуляцыя, ахапіўшая паступова амаль усю сельскую мясцовасць, і вынікі чарнобыльскай катастрофы, закрануўшыя ў першую чаргу сельскіх жыхароў. Таму дабавіліся страты ад эвакуацыі, адсялення, вымушанай міграцыі, новых захворванняў.

Адметнай рысай у характары сучаснай дынамікі насельніцтва з'яўляецца небывалая дыферэнцыяцыя як паміж раёнамі, так і паміж населенымі пунктамі (рыс. 1.2). Пасля 1986 г. сярод сельскіх раёнаў выдзелена толькі адна невялікая група, якая мае нязначны прырост насельніцтва, і 6 груп раёнаў, у якіх штогадовае змяншэнне колькасці насельніцтва вагаецца ў інтэрвале ад 0 да 10%. Да сярэдзіны 80-х гг. двух апошніх градацый (ад 4 да 6; ад 6 да 10%) наогул не было. Яны з'явіліся за кошт самых пацярпеўшых ад аварыі раёнаў. Такіх страт сельскага насельніцтва Беларусь фактычна не ведала на працягу ўсяго стагоддзя. Выяўленая нераўнамернасць у працэсе дынамікі насельніцтва будзе негатыўна ўздзейнічаць на магчымасці далейшага эканамічнага развіцця адпаведных раёнаў. У адносінах да іх можна прымяніць наступную тыпалогію:

— раёны, якія маюць параўнаўча спрыяльную дынаміку насельніцтва, захоўваюць свой жыццёвы патэнцыял

Рыс. 1.2. Рэгіянальны характар дынамікі сельскага насельніцтва да чарнобыльскай аварыі (1975—1985 гг.) *(а)* і пасля аварыі (1986—1991 гг.) *(б)*:
сярэдняе штогадовае змяншэнне колькасці насельніцтва, %:
*1*—мінімальнае (0—1); *2*—ніжэй сярэдняга (1,1—1,5); *3*—сярэдняе (1,6—2,5); *4*—вышэй сярэдняга (2,6—4); *5*—максімальнае (4,1—6); *6*—празмернае (6,1—10)

і магчымасці для далейшага эканамічнага развіцця;

— раёны з вялікімі стратамі сельскага насельніцтва, жыццёвага і працоўнага патэнцыялу, з абмежаванымі магчымасцямі для развіцця гаспадаркі;

— раёны, якія перайшлі ў стадыю стагнацыі, страціўшы свой асноўны ўзнаўленчы, жыццёвы і працоўны патэнцыял.

Да кожнай з гэтых груп раёнаў павінен быць адпаведны падыход урада рэспублікі, адпаведныя меры эканамічнай, міграцыйнай і сацыяльнай палітыкі.

У характары ўсталяванай дынамікі насельніцтва гарадоў таксама выяўляюцца рэзкія парушэнні. Перш за ўсё яны закранулі тыя гарады паўднёвай Беларусі, якія апынуліся ў зонах радыеактыўнага забруджвання. З эпіцэнтраў прыцягнення насельніцтва, якімі яны былі да аварыі, гэтыя гарадыператварыліся ў эпіцэнтры масавага выбыцця. У іх ліку і буйнейшы горад Гомель, на долю якога ў 1990 г. выпала 1/4 частка ўсёй эміграцыі з Беларусі.

Як і сельскія раёны, гарады рэспублікі па характару дынамікі насельніцтва дзеляцца на некалькі груп (гл. Д 3):

— з масавым міграцыйным адтокам у выніку аварыі на ЧАЭС і рэзкім змяншэннем прытоку (гарады Гомельскай вобласці);

— з рэзкім змяншэннем прытоку і прыпыненнем прыросту насельніцтва (гарады Магілёўскай вобласці);

— без змен у колькасці насельніцтва ці нязначным змяншэнні ў выніку неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі (многія малыя гарады па ўсёй тэрыторыі);

— з мінімальным прыростам насельніцтва (большасць малых гарадоў);

— са значным павелічэннем колькасці насельніцтва ў выніку натуральнага і механічнага прыросту (большасць гарадоў цэнтральнай, заходняй і паўночнай частак Беларусі).

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што аб'ектыўны ход дэмаграфічнага развіцця на тэрыторыі Беларусі зноў рэзка парушыўся, умовы фарміравання гарадскога і сельскага насельніцтва пагоршыліся, усталяваны за пасляваенныя гады працэс дынамікі атрымлівае новыя рысы.

Больш падрабязны аналіз дэмаграфічных працэсаў, якія вызначаюць характар дынамікі насельніцтва Беларусі, даецца ў наступных раздзелах кнігі.

## 1.3. ХАРАКТАР УЗНАЎЛЕННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь уваходзіць у лік тых рэгіёнаў свету, дзе працэс узнаўлення насельніцтва за кароткі перыяд гістарычнага развіцця істотна змяніўся і наблізіўся ад расшыранага тыпу да простага. Дэмаграфічная рэвалюцыя на гэтай тэрыторыі прайшла за




Рыс. 1.3. Дынаміка натуральнага руху гарадскога і сельскага насельніцтва:

*а*—колькасць: *1*—нарадзіўшыхся, *2*—памёршых; *б*—каэфіцыент, у разліку на 1000 чалавек, ‰: *1*—нараджальнасці, *2*—смяротнасці

небывала кароткі тэрмін і суправаджалася карэннымі зменамі ў працэсах нараджальнасці і смяротнасці. Цяпер Беларусь уваходзіць у групу краін з самым нізкім узроўнем нараджальнасці і натуральнага прыросту насельніцтва.

Агульны каэфіцыент нараджальнасці ў гарадах, дзе насельніцтва больш маладое, стабілізаваўся на ўзроўні 16—18‰, а ў сельскай мясцовасці ўпаў да 12—13‰ (рыс. 1.3). Гэты факт можна аднесці да ліку дэмаграфічных асаблівасцей рэспублікі, паколькі ў сярэднім у свеце нараджальнасць вышэйшая ў сельскай мясцовасці. Сусветную дэмаграфічную сітуацыю ў цэлым да гэтага часу вызначаюць рэпрадуктыўныя паводзіны дамінуючага сельскага насельніцтва.

Працэс нараджальнасці насельніцтва Беларусі мае яўна выражаны хвалепадобны характар, што звязана з уплывам вынікаў другой сусветнай вайны на колькасць дзетароднага кантынгенту (40, 60, 80-я гг.).

Але не толькі ад колькасці дзетароднага кантынгенту залежыць інтэнсіўнасць нараджальнасці. Галоўнай прычынай яе зніжэння да мінімальнага ўзроўню з'яўляецца пераход абсалютнай большасці сямей да маладзетнасці. Гэта ў сваю чаргу ёсць вынік уздзеяння цэлага рада сацыяльна-эканамічных фактараў. Галоўныя з іх маюць таксама спецыфічны, рэгіянальны характар і знайшлі найбольш выражанае праяўленне ў 60—80-я гг. У іх ліку: высокія тэмпы ўрбанізацыі, якія суправаджаліся масавым перамяшчэннем мнагатысячных людскіх мас з сельскіх пасяленняў у гарады і пераходам іх да новага гарадскога складу жыцця; узрослая працоўная і сацыяльная актыўнасць насельніцтва, якая суправаджалася незвычайна высокай занятасцю жанчын; рост культурна-адукацыйнага ўзроўню з праяўленнем працоўнай, тэрытарыяльнай і прафесійнай рухомасці насельніцтва.

У гэтых новых умовах жыццядзейнасці абсалютная большасць маладых сямейных пар перайшла да свядомага планавання і рэгулявання сям'і, з тым каб спалучыць старую і вечную ўзнаўленчую функцыю сям'і з новымі складанымі функцыямі яе членаў, у першую чаргу жанчыны-маці, якая стала нараўне з мужчынамі носьбітам сацыяльна-эканамічнага прагрэсу.

У апошнія гады меры дэмаграфічнай палітыкі, накіраваныя на павелічэнне нараджальнасці, садзейнічалі нязначнаму зруху яе ў бок лепшых паказчыкаў, але вы-

нікі чарнобыльскай катастрофы зноў парушылі гэтыя пазітыўныя змены.

Рэспубліка Беларусь адносіцца да ліку краін не толькі з нізкім узроўнем нараджальнасці, але і дзетнасці сямей; 80% з іх — маладзетныя, г. зн. маюць адно ці двое дзяцей, або наогул іх не маюць (рыс. 1.4).

У выніку маладзетнасці сямей паказчыкі брута- і нета-ўзнаўлення насельніцтва рэзка знізіліся. Калі такі




Рыс. 1.4. Састаў сямей, %:
*а*—велічыня, чалавек; *б*—тып; *в*—дзетнасць простых сямей; *г*—дзетнасць няпоўных сямей

рэжым захаваецца на працяглы перыяд, то магчыма нават змяншэнне колькасці насельніцтва, інакш кажучы — дэпапуляцыя.

Значныя зрухі выяўляюцца і ў *сямейнай структуры* насельніцтва. Колькасць сямей расце даволі хутка і апераджае агульныя тэмпы росту насельніцтва. Гэта тлумачыцца драбленнем складаных сямей на простыя, павелічэннем колькасці новых маладых сямейных пар, а таксама паўторных шлюбаў пасля разводаў ці аўдавення.

Назіраецца хуткае змяншэнне велічыні сям'і, якая стала фактычна аднолькавай у горадзе і сельскай мясцовасці і зменшылася да 2—3 чалавек. Гэты працэс адбываецца пад уплывам многіх фактараў: фарміраванне маладых сямей, у якіх яшчэ няма дзяцей, маладзетнасці, раздзялення складаных сямей на простыя, павелічэння колькасці няпоўных сямей (без аднаго з бацькоў) у выніку разводаў і аўдавення. Пры такой сямей-

най структуры, дзе не больш 1—2 дзяцей, не можа быць забяспечана нават простая замена пакалення, для якой неабходна, каб на 100 сямей прыходзілася як мінімум 270 дзяцей. Толькі ў такім выпадку магчыма колькасная замена бацькоў, а таксама тых, хто наогул не ўступіў у шлюб і не мае сям'і ці пазбаўлены магчымасці нарадзіць дзяцей па прычыне бяздзетнасці.

Трэба адзначыць і ўрбаністычны зрух у сямейнай структуры. У мінулым, калі рэспубліка была сельскай, рэпрадуктыўныя паводзіны яе насельніцтва вызначалі сельскія сем'і. У сучасны момант дамінуючымі сталі гарадскія сем'і, якія забяспечваюць увесь прырост новых сямейных пар і вызначаюць рэжым узнаўлення насельніцтва ўсёй рэспублікі, ствараюць свой стэрэатып узнаўленчых паводзін і распаўсюджваюць яго на сяло.

У новым сацыяльным асяроддзі вельмі актыўна ідзе працэс нуклеарызацыі (спрашчэння) сямей: 3/4 усіх сямей — простыя, г. зн. сямейная пара з дзецьмі або без дзяцей. Дамінуючыя ў мінулым складаныя (многапакаленныя) сем'і сталі вялікай рэдкасцю не толькі ў гарадах, але і ў сельскай мясцовасці. Пры гэтым большасць складаных сельскіх сямей распалася іменна з прычыны выбыцця іх дзяцей у гарады. У выніку старыя галіны сямей засталіся на вёсцы, а маладыя стварылі новыя галіны ў гарадах. Адбылося рэзкае дэмаграфічнае «старэнне» сельскіх пасяленняў і амаладжэнне гарадоў. Па сямейнай структуры і ўзросту насельніцтва беларускія гарады ў сучасны перыяд перажываюць «стадыю маладосці». Але гэта з'ява часовая. Паступова, па меры скарачэння міграцыйнага прытоку з вёскі, зніжэння нараджальнасці ў саміх гарадах пад уплывам усё нарастаючага ўрбаністычнага ўздзеяння і поўнага знікнення стэрэатыпу сельскага складу жыцця, насельніцтва гарадоў таксама пачне старэць. Гэта прывядзе да рэжыму ўзнаўлення насельніцтва, уласцівага ўсім гарадам высокаразвітых краін, калі нараджальнасць і смяротнасць амаль аднолькавыя.

Да ліку негатыўных з'яў у сямейнай структуры адносіцца павелічэнне долі няпоўных сямей. У сучасны момант кожная дзесятая сям'я — без аднаго з бацькоў, як правіла, без бацькі, што выклікана разводамі ці выпадкамі смерці аднаго з бацькоў. Абсалютная большасць такіх сямей — аднадзетныя, рэдка двухдзетныя, што вядзе да зніжэння паказчыкаў нараджальнасці. Становішча дзяцей у няпоўных сем'ях выклікае асаблівую тры-

*Табліца 1.3*

**Знаходжанне ў шлюбе мужчын і жанчын Беларусі, чалавек (перапіс 1989 г.)**

| Узрост | Асобы 16 гадоў і больш, усяго | У тым ліку* | | |
|---|---|---|---|---|
| | | замужнія жанатыя | удаўцы удовы | знаходзяцца ў разводзе |
| | | *Мужчыны* | | |
| 16—19 | 281 703 | 5 348 | 39 | 65 |
| 20—29 | 781 887 | 461 460 | 466 | 17 022 |
| 30—39 | 779 828 | 665 925 | 2 037 | 43 281 |
| 40—49 | 517 075 | 452 659 | 4 483 | 36 705 |
| 50—59 | 578 989 | 521 466 | 16 889 | 28 214 |
| 60 і старэй | 545 254 | 460 312 | 67 056 | 10 822 |
| Усяго | 3 484 816 | 2 567 193 | 91 971 | 136 172 |
| | | *Жанчыны* | | |
| 16—19 | 279 659 | 27 642 | 159 | 575 |
| 20—29 | 781 241 | 566 377 | 2 879 | 33 431 |
| 30—39 | 782 771 | 659 972 | 12 001 | 66 703 |
| 40—49 | 548 719 | 433 830 | 33 563 | 61 864 |
| 50—59 | 703 467 | 500 328 | 109 199 | 59 825 |
| 60 і старэй | 1 088 483 | 394 639 | 580 781 | 42 500 |
| Усяго | 4 184 419 | 2 582 806 | 738 587 | 265 030 |

* Астатнія ніколі не знаходзіліся ў шлюбе: мужчын — 683,5 тыс. чал., жанчын — 591,8 тыс. чал.

вогу і патрабуе дадатковых клопатаў з боку дзяржавы і грамадства.

Разглядаючы сямейную структуру, неабходна адзначыць, што прыкладна пятая частка дарослага насельніцтва не знаходзіцца ў шлюбе, нягледзячы на дадатныя зрухі ў структуры па полу. Да гэтага трэба дадаць тых асоб, што засталіся адзінокімі пасля разводу ці аўдавення; іх асабліва многа сярод жанчын (табл. 1.3).

Сярод насельніцтва Беларусі, асабліва сельскага, вельмі высокі ўзровень аўдавення. Кожная чацвертая сельская жанчына — удава. Удовых жанчын у 8 разоў больш, чым мужчын. У гэтым выяўляюцца вынікі вайны і цяперашняя павышаная смяротнасць мужчын, якія жывуць у сярэднім на 9—10 гадоў менш, чым жанчыны. Заўважаецца ўстойлівая тэндэнцыя павелічэння інтэрвалу ў працягласці жыцця мужчын і жанчын. Так, у

1896—1897 гг. сярэдняя працягласць жыцця жанчын была на 1 год большая, чым мужчын; у 1926—1927 гг. гэта розніца ўжо складала 4 гады; у 1969—1970 гг.— 8 гадоў; у 1988—1989 гг.— 9 гадоў. Таму праблема аховы здароўя мужчын уваходзіць у лік асаблівых рэгіянальных праблем Беларусі.

На працягласць жыцця ўплывае ўзровень смяротнасці, у тым ліку дзіцячай, паколькі пры ўмове выжывання дзяцей да 1 года ёсць магчымасць захаваць жыццё да глыбокай старасці. З вялікімі намаганнямі Беларусі ўдалося знізіць дзіцячую смяротнасць да ўзроўню многіх развітых краін Еўропы — 12—13‰, што адзначаецца як дадатная рыса дэмаграфічнай сітуацыі. У той жа час паказчыкі такіх краін, як Швецыя, Японія, Фінляндыя, сведчаць аб тым, што рэальна магчымым стаў яшчэ больш нізкі ўзровень дзіцячай смяротнасці (5—7‰), які раней лічыўся недасягальным.

Працэс змяншэння нараджальнасці, а разам з ім і старэння насельніцтва, уплыў розных знешніх фактараў, у першую чаргу экалагічных, абмяжоўваюць магчымасці зніжэння агульных паказчыкаў смяротнасці. Як сведчыць рыс. 1.3, іх узровень нават павялічыўся. Так, з 1960 г. колькасць нарадзіўшыхся фактычна не змянілася, а колькасць памёршых удвоілася, таму натуральны прырост знізіўся амаль да нулявой адзнакі.

Першае месца сярод прычын смерці па-ранейшаму займаюць хваробы сістэмы кровазвароту — 2/3 усіх выпадкаў смерці. Усё часцей гэта прычына выяўляецца сярод сельскага насельніцтва, дзе пераважаюць пажылыя і старыя людзі. На другім месцы застаюцца розныя формы злаякасных новаўтварэнняў. Разам з гэтымі прычынамі, асабліва сярод працаздольнага насельніцтва, смяротнасць выклікаюць няшчасныя выпадкі, траўмы і іншыя знешнія прычыны.

На стан здароўя насельніцтва Беларусі ўсё большае негатыўнае ўздзеянне аказвае экалагічная абстаноўка, у тым ліку радыяцыйнае забруджванне многіх раёнаў пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС (больш падрабязна гл. раздзел 6). Таму праблемы аховы жыцця і здароўя насельніцтва выклікаюць асаблівую трывогу.

Тэрытарыяльны аспект узнаўлення насельніцтва таксама заслугоўвае ўвагі. Па-першае, адзначаецца анамальны зрух у размеркаванні натуральнага прыросту паміж горадам і сялом (рыс. 1.5). У канцы 50-х гг. сельскае насельніцтва забяспечвала ўдвая большы пры-




Рыс. 1.5. Размеркаванне натуральнага прыросту насельніцтва паміж абласцямі ў сярэднім за год, тыс. чалавек:

*1*—50-я гг.; *2*—80-я гг.; *3*—доля вобласці ў натуральным прыросце насельніцтва рэспублікі; *а*—натуральны прырост гарадскога насельніцтва; *б*—сельскага; *в*—мужчын, *г*—жанчын

рост, чым гарадское, а ў канцы 80-х гг. яно ўжо несла натуральныя страты, якія нарастаюць з кожным годам. Па-другое, усё большая нераўнамернасць праяўляецца ў размеркаванні натуральнага прыросту паміж абласцямі. Мінская вобласць дае 40% усяго прыросту насельніцтва рэспублікі, з іх 30% — г. Мінск. Яшчэ 1/3 забяспечваюць пакуль што паўднёвыя вобласці — Брэсцкая і Гомельская, астатнія тэрыторыі значна знізілі свой уклад у агульны прырост насельніцтва Беларусі, асабліва гэта датычыць Віцебскай вобласці.

Такім чынам, новыя сацыяльна-эканамічныя працэсы ў спалучэнні з экалагічнай абстаноўкай вызываюць не толькі дадатныя, але і негатыўныя зрухі ў дэмаграфічнай сітуацыі на тэрыторыі Беларусі. Усе гэтыя зрухі не застаюцца бясследнымі. Калі іх не ўлічваць, то можна чакаць яшчэ большага напружання ў сацыяльна-экана-

мічнай сітуацыі, бо з імі звязаны праблемы працаўладкавання, рэсурсавыкарыстання, размеркавання нацыянальнага даходу і сродкаў існавання.

### 1.4. ЭВАЛЮЦЫЯ ПОЛАЎЗРОСТАВАЙ СТРУКТУРЫ

Насельніцтва Беларусі характарызуецца далейшым пастарэннем, г. зн. зніжэннем удзельнай вагі дзяцей і моладзі, павелічэннем долі пажылых і старых людзей. Па ўзроставай структуры насельніцтва рэспубліка прыблізілася да катэгорыі старэючых рэгіёнаў Еўропы. За тры дзесяцігоддзі колькасць дзяцей і падлеткаў фактычна не змянілася, колькасць працаздольных узрасла на 1/3. Але самыя істотныя змены адбыліся ў групе, якая выбывае з працаздольнага ўзросту. Яе колькасць павялічылася амаль у 2 разы (табл. 1.4, рыс. 1.6).

Змяншэнне долі дзяцей і моладзі абмяжоўвае магчымасці папаўнення працоўных рэсурсаў, паколькі выбыццё на пенсію не будзе ў поўнай меры кампенсавацца за кошт моладзі, якая ўступае ў працаздольны ўзрост. Гэта становішча асабліва пагаршаецца з другой палавіны 80-х гг.

Разам з тым, маючы высокую долю працаздольнага насельніцтва (56%), Беларусь мае адносна большы працоўны патэнцыял і меншую нагрузку ўтрыманцаў у разліку на кожнага працаздольнага. Значыць, пры іншых роўных умовах гэта стварае лепшыя магчымасці для ўзнаўлення валавага нацыянальнага прадукта і павялічвае размер яго спажывання на душу насельніцтва.

Пастарэнне насельніцтва выклікае дадатковыя затраты на пенсіі, розныя віды дапамог і паслуг (дэмаграфічныя інвестыцыі). Так, у параўнанні з 1960 г. колькасць пенсіянераў у Беларусі павялічылася амаль у 4 разы і дасягнула лічбы 2,4 млн. чалавек — кожны пяты жыхар.

Характар узроставай структуры насельніцтва аказвае вялікі ўплыў на эканамічнае ўзнаўленне, у многім вызначаючы велічыню нацыянальнага даходу і нацыянальнага спажывання. Як пацвярджаюць матэрыялы спецыяльных даследаванняў, больш палавіны нацыянальнага даходу ствараецца насельніцтвам ва ўзросце ад 25 да 45 гадоў, а максімальная аддача прыпадае на ўзроставую групу 35—40 гадоў, якая вызначаецца самай высокай прадукцыйнасцю працы. Значыць, чым вышэй доля гэтай групы ў саставе насельніцтва, тым адносна большым працоўным патэнцыялам яно валодае. Напрыклад,

*Табліца 1.4*

**Дынаміка ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі (даныя перапісаў)**

| Узроставыя групы | 1959 г. | | 1970 г. | | 1979 г. | | 1989 г. | | Змены за 1959—1989 гг. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | тыс. чал. ± | ±% |
| Усё насельніцтва | 8055 | 100 | 8992 | 100 | 9533 | 100 | 10152 | 100 | +2097 | +26,0 |
| у тым ліку: | | | | | | | | | | |
| маладзей працаздольнага ўзросту | 2518 | 31,2 | 2781 | 30,9 | 2380 | 25,0 | 2483 | 24,5 | —35 | —1,4 |
| у працаздольным узросце | 4447 | 55,2 | 4747 | 52,8 | 5546 | 58,2 | 5685 | 56,0 | +1238 | +27,8 |
| старэй працаздольнага ўзросту | 1090 | 13,5 | 1460 | 16,3 | 1603 | 16,8 | 1984 | 19,5 | 894 | +82,0 |
| Гарадское насельніцтва | 2480 | 100 | 3891 | 100 | 5234 | 100 | 6642 | 100 | 4161 | +167,8 |
| у тым ліку: | | | | | | | | | | |
| маладзей працаздольнага ўзросту | 717 | 28,9 | 1092 | 28,1 | 1316 | 25,1 | 1747 | 26,3 | 1030 | +143,7 |
| у працаздольным узросце | 1533 | 61,8 | 2402 | 61,7 | 3362 | 64,2 | 4013 | 60,4 | 2480 | +161,8 |
| старэй працаздольнага ўзросту | 230 | 9,3 | 396 | 10,2 | 555 | 10,7 | 882 | 13,3 | 652 | +283,5 |
| Сельскае насельніцтва | 5575 | 100 | 5102 | 100 | 4298 | 100 | 3510 | 100 | —2065 | —37,0 |
| у тым ліку: | | | | | | | | | | |
| маладзей працаздольнага ўзросту | 1800 | 32,3 | 1690 | 33,1 | 1064 | 24,8 | 736 | 21,0 | —1064 | —59,1 |
| у працаздольным узросце | 2914 | 52,3 | 2348 | 46,0 | 2184 | 50,8 | 1672 | 47,6 | —1242 | —42,6 |
| старэй працаздольнага ўзросту | 861 | 15,4 | 1064 | 20,9 | 1048 | 24,4 | 1102 | 31,4 | 242 | +28,0 |




Рыс. 1.6. Полаўзроставыя піраміды насельніцтва Беларусі ў 1959 г. *(а)*, 1989 г. *(б)*:
*1*—працаздольны ўзрост; *2*—павелічэнне колькасці групы; *3*—змяншэнне колькасці групы

*Табліца 1.5*

**Узроставая структура насельніцтва Беларусі (па перапісу 1989 г., тыс. чал.)**

| Узрост, гадоў | Мужчыны | | Жанчыны | |
|---|---|---|---|---|
| | гарадскія | сельскія | гарадскія | сельскія |
| 0—5 | 358 | 148 | 342 | 142 |
| 6—9 | 225 | 88 | 217 | 86 |
| 10—15 | 308 | 138 | 297 | 134 |
| 16—19 | 198 | 83 | 220 | 60 |
| 20—24 | 247 | 103 | 270 | 86 |
| 25—29 | 311 | 121 | 328 | 97 |
| 30—34 | 306 | 113 | 327 | 91 |
| 35—39 | 267 | 93 | 287 | 78 |
| 40—44 | 188 | 70 | 199 | 68 |
| 45—49 | 169 | 90 | 181 | 100 |
| 50—54 | 176 | 125 | 202 | 151 |
| 55—59 | 135 | 142 | 170 | 180 |
| 60—64 | 114 | 113 | 167 | 186 |
| 65—69 | 56 | 66 | 105 | 133 |
| 70—74 | 33 | 37 | 68 | 92 |
| 75—79 | 25 | 41 | 63 | 105 |
| 80 і старэй | 19 | 40 | 62 | 108 |
| Маладзей працаздольнага | 890 | 374 | 856 | 362 |
| Працаздольны | 1999 | 941 | 2015 | 731 |
| Старэй працаздольнага | 248 | 297 | 634 | 805 |
| Усяго | 3137 | 1612 | 3505 | 1898 |

сярод гарадскога насельніцтва Беларусі найбольш працаздольная група (25—45 гадоў) складае каля 40%, а сярод сельскага насельніцтва менш за 20%. Гэта значыць, што пры іншых роўных умовах ад гарадскіх працоўных рэсурсаў можна чакаць адносна большай працоўнай аддачы, чым ад сельскіх (табл. 1.5).

Разам з тым група 30-гадовых вызначаецца і найбольш высокім узроўнем спажывання нацыянальнага даходу. Іменна к гэтаму часу яна завяршае фарміраванне сям'і, шырока карыстаецца ўсімі відамі грамадскага абслугоўвання, атрымлівае добраўпарадкаванае жыллё, розныя формы выплат і льгот з грамадскіх фондаў, якія ідуць у дадатак да асноўнай зарплаты.

Самая маладая група працаздольнага насельніцтва, ад 16 да 25 год, у сувязі з працягам вучобы ўносіць вельмі нязначны ўклад у вытворчасць нацыянальнага

багацця, але вызначаецца высокімі патрабаваннямі. Яна «бярэ ў доўг» у сям'і і дзяржавы масу сродкаў на задавальненне патрэб у вучобе, сацыяльна-культурным развіцці, прадметах спажывання. Гэта група сярод гарадскога насельніцтва па колькасці ў 3 разы большая, чым сярод сельскага. Значыць, гарады нясуць асобыя расходы сацыяльна-дэмаграфічнага характару.

## 1.5. ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў ГАРАДАХ

Улічваючы рэзка выражаныя адрозненні ў дэмаграфічным развіцці, якія ўласцівы гарадскім і сельскім пасяленням, узнікае неабходнасць больш падрабязнага аналізу сітуацыі, якая склалася ў тых і другіх.

У горадабудаўнічай практыцы і сацыяльна-эканамічным планаванні асабліва важныя такія параметры дэмаграфічнага развіцця гарадоў, як велічыня і тэмпы росту насельніцтва, інтэнсіўнасць працэсаў узнаўлення і міграцыі, характар узроставай і сямейнай структур.

Колькасць насельніцтва і тэмпы яго росту вызначаюць колькасць спажыўцоў, а тыя ў сваю чаргу ўплываюць на аб'ём спажываемых даброт і паслуг: жылля, прадуктаў, тавараў, шматлікіх элементаў сацыяльнай інфраструктуры (ясляў, садоў, школ, бальніц, гандлёвых арганізацый, сістэмы грамадскага харчавання, адпачынку, культурнага правядзення часу, пасажырскага транспарту).

Ад колькасці і росту насельніцтва залежаць колькасць працоўных рэсурсаў, г. зн. вытворцаў матэрыяльных даброт і паслуг, магчымасці нарошчвання эканамічнага патэнцыялу горада.

Колькасць насельніцтва вызначае клас горада па велічыні: малыя, сярэднія і буйныя. Да малых гарадоў адносяцца тыя, у якіх менш чым 50 тыс. жыхароў; сярод іх вылучаюцца паўсярэднія — ад 20 да 50 тыс. і зусім малыя — менш за 10 тыс. чалавек. Сярэднія гарады маюць ад 50 да 100 тыс., а буйныя — звыш 100 тыс. чалавек. Сярод іх можна яшчэ вылучыць буйнейшыя — звыш 500 тыс. і гарады-мільянеры. Частка невялікіх гарадскіх пасяленняў, якія яшчэ не адпавядаюць рангу горада, але якія ўжо выйшлі з катэгорыі сельскіх (ці па колькасці насельніцтва, ці па роду яго занятнаў), утварае асобую групу — гарадскія пасёлкі.

Клас горада па велічыні — гэта не проста колькасная характарыстыка. У залежнасці ад прыналежнасці да

*Табліца 1.6*

**Класіфікацыя гарадскіх пасяленняў Беларусі па велічыні**

| Год | Клас гарадскіх пасяленняў па велічыні, колькасць у групе | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | мільянеры | буйнейшыя (500—1000) | буйныя (100—500) | сярэднія (50—100) | паўсярэднія (20—50) | малыя | |
| | | | | | | 10—20 | менш 10 |
| 1940 | — | — | 3 | 2 | 11 | 14 | 143 |
| 1959 | — | 1 | 3 | 6 | 7 | 15 | 152 |
| 1970 | — | 1 | 8 | 4 | 15 | 20 | 156 |
| 1979 | 1 | — | 9 | 9 | 14 | 17 | 157 |
| 1990 | 1 | 1 | 10 | 10 | 17 | 47 | 125 |

*Табліца 1.7*

**Дынаміка ўзбуйнення гарадоў Беларусі**

| Гарады | Колькасць насельніцтва, тыс. чал. | | | Прырост, разы |
|---|---|---|---|---|
| | 1959 г. | 1970 г. | 1989 г. | |
| Мінск | 506 | 907 | 1589 | 3,1 |
| Гомель | 168 | 277 | 501 | 3 |
| Віцебск | 148 | 231 | 350 | 2,4 |
| Магілёў | 122 | 202 | 359 | 2,9 |
| Бабруйск | 98 | 138 | 223 | 2,4 |
| Гродна | 73 | 133 | 270 | 3,7 |
| Брэст | 74 | 122 | 258 | 3,5 |
| Орша | 64 | 101 | 123 | 1,9 |
| Баранавічы | 58 | 102 | 159 | 2,7 |
| Барысаў | 59 | 84 | 144 | 2,4 |
| Полацк | 44 | 64 | 77 | 1,7 |
| Пінск | 42 | 62 | 119 | 2,8 |
| Мазыр | 26 | 49 | 101 | 3,9 |
| Салігорск | — | 38 | 93 | 2,4 да 1970 г. |
| Наваполацк | — | 40 | 93 | 2,3 да 1970 г. |
| Маладзечна | 26 | 50 | 92 | 3,5 |
| Ліда | 29 | 48 | 91 | 3,1 |
| Рэчыца | 31 | 48 | 69 | 2,2 |
| Светлагорск | 6 | 40 | 69 | 11,5 |
| Слуцк | 23 | 36 | 57 | 2,5 |
| Жлобін | 19 | 25 | 57 | 3 |
| Жодзіна | 7 | 22 | 54 | 7,7 |

таго ці іншага класа на гарады распаўсюджваюцца розныя меры дзяржаўнай горадабудаўнічай палітыкі. Пачынаючы з 60-х гг. прыярытэт у размяшчэнні новага прамысловага будаўніцтва аддаецца сярэднім і малым гарадам. У адносінах да буйных і асабліва звышбуйных гарадоў палітыка іншая — стрымліванне іх росту шляхам абмежавання новага прамысловага будаўніцтва.

Як відаць з табл. 1.6, на тэрыторыі Беларусі прадстаўлены ўсе пералічаныя вышэй групы гарадскіх пасяленняў. Гэта значыць, што сацыяльна-эканамічная аснова ў іх розная, а таму не можа быць аднолькавай і дэмаграфічная сітуацыя.

Пад уплывам сацыяльна-эканамічнага развіцця гарады паступова пераходзяць з аднаго класа ў другі. Напрыклад, гарады-новабудоўлі Наваполацк і Салігорск за кароткі перыяд свайго існавання (пачатак 60-х гг.) «пераступілі» чатыры класы па велічыні: рабочы пасёлак, малы, паўсярэдні, сярэдні горад — і наблізіліся да рангу буйных гарадоў. Гэта ж можна сказаць пра Барысаў, Маладзечна, Баранавічы, Мазыр і многія іншыя гарады рэспублікі. Дынаміка росту іх насельніцтва паказана ў табл. 1.7.

У цэлым выразна праяўляецца тэндэнцыя пераразмеркавання гарадскога насельніцтва ў карысць буйных гарадоў. Яшчэ 30 гадоў назад на тэрыторыі Беларусі было толькі 4 буйных і 6 сярэдніх гарадоў. Амаль палавіна гараджан пражывала ў малых гарадскіх пасяленнях. У 1990 г. налічвалася 11 буйных гарадоў на чале з горадам-мільянерам Мінскам і 10 сярэдніх гарадоў. У іх пражывала 3/4 усіх гараджан і амаль палавіна ўсяго насельніцтва Беларусі (табл. 1.8).

Паколькі буйныя гарады ўяўляюць сабой цэнтры эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця цэлых народаў і дзяржаў, з'яўляюцца галоўнымі рухавікамі навукова-тэхнічнага прагрэсу, яны канцэнтруюць асноўную частку гарадскога насельніцтва. Гэта заканамернасць праяўляецца ва ўсім свеце, нягледзячы на розныя

*Табліца 1.8*

**Размеркаванне гарадскога насельніцтва паміж гарадамі**

| Клас горада па велічыні | 1959 г. | | 1970 г. | | 1979 г. | | 1989 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % |
| Буйныя і буйнейшыя | 954,3 | 38,5 | 2201,6 | 56,4 | 3144,4 | 59,8 | 4208 | 62,8 |
| Сярэднія | 425,9 | 17,2 | 260,2 | 6,6 | 622,5 | 21,8 | 753 | 11,3 |
| Паўсярэднія і малыя | 1100,3 | 44,3 | 1446,0 | 37,0 | 1496,5 | 28,4 | 1718 | 25,9 |
| Усяго | 2480,5 | 100 | 3907,8 | 100 | 5263,4 | 100 | 6679 | 100 |

меры па стрымліванню іх росту. Іменна буйныя гарады вызначаюць дынаміку насельніцтва ў Беларусі. Так, у параўнанні з 1959 г. насельніцтва рэспублікі павялічылася толькі на 27%, колькасць гараджан — у 2,7 раза, а колькасць жыхароў буйных гарадоў — у 4,4 раза. Гэта значыць, што буйныя гарады нарошчвалі насельніцтва ў 12 разоў хутчэй, чым рэспубліка ў цэлым, а праз гэта ўплывалі і на агульную дэмаграфічную сітуацыю.

У лік хуткарастучых уключылася група так званых паўсярэдніх гарадоў (ад 20 да 50 тыс. чалавек), за кошт якіх ідзе папаўненне сярэдніх, а затым і буйных гарадоў. У бліжэйшым будучым гэта папаўненне складуць Кобрын, Рагачоў, Калінкавічы, Жодзіна, Вілейка, Ваўкавыск і інш. Такімі ж хуткімі тэмпамі расце насельніцтва некаторых малых гарадоў, якія актыўна развіваюць сваю эканамічную базу, напрыклад Смаргонь, Мікашэвічы, Іванава, Ганцавічы, Івацэвічы, Бяроза, Мядзел, Заслаўе, Капыль і інш. Гэтыя гарады бяруць на сябе частку прамысловых функцый найбольш экалагічна перагружаных буйных прамысловых цэнтраў, у першую чаргу сталічнага горада Мінска і абласных цэнтраў.

Абсалютная большасць малых гарадскіх пасяленняў мае ўмераны прырост насельніцтва (ад 1 да 3% у год), а некаторыя нават як бы спыніліся ў сваім росце і ўжо многія гады не змяняюць колькасць насельніцтва (гл. Д 3). Ёсць група такіх гарадскіх пасяленняў, у якіх назіраецца нават змяншэнне колькасці жыхароў. Яна налічвае каля 30 самых малых гарадскіх пасёлкаў, у якіх пражывае ад 1 да 3 тыс. чалавек. Вынікі чарнобыльскай аварыі дабавілі ў гэтую групу некаторыя гарадскія пасяленні Гомельскай і Магілёўскай абласцей (Хойнікі, Брагін, Камарын, Ветка, Карма, Лоеў, Краснаполле і інш.).

У тэрытарыяльным плане можна адзначыць, што найбольш дынамічна, без асаблівых дэпрэсій, развіваюцца гарады і пасёлкі Мінскай вобласці. У стадыі рэгрэсіі тут знаходзяцца толькі 4 самыя малыя гарадскія пасёлкі: Свір, Бобр, Халопенічы, Крывічы.

Параўнаўча стабільная і ўмерана дынамічная сітуацыя на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Рэзкія зрухі характэрны для дынамікі насельніцтва многіх гарадоў Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

На тэрыторыі паўночнай Беларусі дэмаграфічная сітуацыя пагоршылася не толькі ў сельскай мясцовасці,

але і ў гарадах. Гэты працэс асабліва закрануў малыя гарадскія пасяленні. Абсалютная большасць з іх мае нізкія або мінімальныя тэмпы росту (ад 0 да 1%). На гэтай тэрыторыі самая вялікая група пасяленняў, дзе працягваецца змяншэнне колькасці жыхароў. Сярод іх у першую чаргу тыя, якія больш за ўсё пацярпелі ў гады вайны і не атрымалі дастатковага імпульсу для развіцця ў пасляваенныя гады: Сураж, Янавічы, Асвея, Друя, Відзы, Дзісна. Затухае паступова жыццё ў пасёлках Асінторф, Арэхаўск, Ветрына, Лынтупы і інш. Многія з пасяленняў Віцебшчыны пры стварэнні адпаведнай інфраструктуры маглі б стаць цэнтрамі адпачынку насельніцтва, іншыя з пераводам у разрад сельскіх занялі б сваё месца сярод аграпасяленняў.

Розныя тэмпы росту насельніцтва выклікаюць у кожнай групе свае праблемы. У хутка растучых гарадах канцэнтрацыя насельніцтва адбылася за кароткі тэрмін. Гэта прывяло да парушэння раўнавагі як у дэмаграфічным, так і ў сацыяльным плане. Побач з эканамічнымі і вытворчымі задачамі прыходзіцца рашаць цэлы комплекс унутраных сацыяльных задач: забеспячэння маладых сямей жыллём, дашкольнымі і школьнымі ўстановамі; развіцця культурна-бытавога абслугоўвання, гандлёвай сеткі, прафесіянальнай падрыхтоўкі моладзі і г. д. Гэтым гарадам больш за іншыя патрэбна пастаяннае нарошчванне і ўдасканаленне комплексу паслуг, пачынаючы з элементарных, паўсядзённых.

Пастаяннага ўдасканалення патрабуе і горадаўтваральная група, у якой павінна быць збалансаванасць мужчынскіх і жаночых працоўных месц. У прапорцыі, адпавядаючай тэмпам росту насельніцтва, неабходна планаваць вытворчую і сацыяльную інфраструктуру, унутрыгарадское рассяленне, планіроўку і забудову.

У цэлым абсалютная большасць гарадоў, якія фарміруюць апорны каркас рассялення, вызначаецца інтэнсіўным ростам як горадаўтваральнай, так і горадаабслугоўваючай груп насельніцтва, павялічваючы свой дэмаграфічны патэнцыял у агульнай колькасці насельніцтва прылягаючай тэрыторыі.

Разам з тым каля 60 малых гарадскіх пасяленняў утвараюць асобую групу з вельмі нізкім прыростам або змяншэннем насельніцтва. Сярод іх ёсць і апорныя цэнтры мясцовых сістэм рассялення. Адным з вынікаў такой дынамікі з'яўляецца ўскладненне працэсу фарміравання працоўных рэсурсаў. Гэта ў сваю чаргу стала абмяжоў-

ваць магчымасці размяшчэння новай вытворчасці і далейшага развіцця існуючай. У такіх умовах працягваецца міграцыйнае змяншэнне, паколькі ўмовы жыцця і магчымасці працаўладкавання намнога горшыя, чым у іншых гарадах, а сродкаў на ўзнаўленне патэнцыялу практычна няма. Таму ў адносінах да некаторых гарадоў трэба ставіць пытанне аб пераводзе іх у разрад сельскіх, дзе б яны былі роўнымі сярод роўных; у іншых можна ўскладніць гаспадарчы комплекс, знайсці дадатковы эканамічны стымул развіцця, здольны актывізаваць усе формы жыццядзейнасці і замацаваць на месцы насельніцтва, інакш яны не змогуць выконваць функцыі апорных цэнтраў нават мясцовых сістэм рассялення.

*Полаўзроставая структура,* як элемент дэмаграфічнай сітуацыі, складваецца пад уплывам натуральнага і міграцыйнага руху насельніцтва і выразна адрозніваецца ў гарадах рознага тыпу. Буйныя і сярэднія гарады, а таксама частку малых, якія актыўна растуць, можна аднесці да катэгорыі «маладых», з прагрэсіўнай полаўзроставай структурай. Дзякуючы хуткім тэмпам эканамічнага развіцця, у якім да цяперашняга часу дамінаваў экстэнсіўны фактар пры наяўнасці багатых крыніц рабочай сілы ў сельскай і дамашняй гаспадарцы, гэтыя гарады прыцягнулі вялікую масу маладога працаздольнага насельніцтва. Яны маюць аптымальны рэжым узнаўлення і, можна сказаць, ідэальную структуру па ўзросту. Працэс старэння насельніцтва яшчэ толькі ў пачатковай стадыі (6—10%), а доля працаздольнага ўзросту дасягае 60—65%.

Самыя малыя гарады, асабліва з тэндэнцыяй змяншэння насельніцтва, маюць іншую дэмаграфічную структуру. У іх рэзка скарацілася доля дзяцей і моладзі, павялічыўся працэнт пажылых і старых людзей, пагоршыліся магчымасці ўзнаўлення пакаленняў. Іншымі словамі, малыя гарады «пастарэлі», у асобных складваецца нават рэгрэсіўны тып узроставай структуры: дзяцей менш, чым пажылых і старых людзей.

Структура па полу дыферэнцыравана ў залежнасці ад узросту гараджан, пры гэтым заўважаецца такая заканамернасць: найбольш нестабільнай з'яўляецца структура па полу ва ўзросце ад 15 да 25 гадоў, дзе галоўную ролю адыгрывае міграцыя, якая прыцягвае мужчынскае або жаночае насельніцтва ў залежнасці ад профілю гаспадаркі і навучальных устаноў горада. Паступова ў сярэдніх, найбольш стабільных узростах суадносіны выраў-

ноўваюцца, а па меры павелічэння ўзросту структура па полу зноў парушаецца пад уплывам смяротнасці. Рэгуляваць суадносіны па полу можна шляхам мэтанакіраваных мер прытоку мужчынскага ці жаночага насельніцтва праз фарміраванне адпаведнай колькасці рабочых або вучнёўскіх месц.

Параметры *натуральнага руху* насельніцтва таксама істотна адрозніваюцца ў розных тыпах гарадоў. Агульны вывад зводзіцца да таго, што самыя спрыяльныя паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці маюць буйныя і сярэднія гарады рэспублікі, што тлумачыцца маладым складам іх насельніцтва. Але гэта не заканамернасць, а хутчэй за ўсё асаблівасць беларускіх гарадоў, «бум» развіцця якіх прыпаў на 60—70-я гг. Абмежавальныя меры па іх росту пакуль яшчэ не адбіліся на дэмаграфічных працэсах. Акрамя таго, захоўваюць свае традыцыі і псіхалагічныя ўстаноўкі сельскія жыхары, якія далі асноўны прырост колькасці гараджан. Па меры развіцця ўрбанізацыі, уздзеяння гарадскога складу жыцця на дэмаграфічныя працэсы, яны набываюць тыпова гарадскія рысы. Такія рысы ўласцівы ўсім буйнейшым і старэйшым гарадам. Напрыклад, у 1988 г. у Маскве, дзе пражывала амаль 9 млн. чалавек, лічба абсалютнага натуральнага прыросту (25 тыс. чал.) толькі нязначна перавышала прырост у Мінску (18 тыс. чал.), а ў Санкт-Пецярбургу ён нават меншы, чым у Мінску (15 тыс. чал.). На сучасным этапе па асноўных параметрах дэмаграфічнага развіцця Мінск і іншыя буйныя гарады Беларусі бліжэй да такіх жа гарадоў Сярэдняй Азіі: адносна высокая нараджальнасць (15—25‰), нізкая смяротнасць (6—7‰) і высокі натуральны прырост (10—20‰). Тэмпы натуральнага прыросту насельніцтва ў беларускай сталіцы ў 5 разоў вышэйшыя, чым у Маскве. Гэта значыць, што ў разліку на кожную тысячу жыхароў неабходна ў 5 разоў інтэнсіўней нарошчваць усе элементы сацыяльнай інфраструктуры, пачынаючы ад жылля і канчаючы сістэмай адпачынку. Дэмаграфічныя інвестыцыі ў даным выпадку патрабуюць значных адлічэнняў у фонды грамадскага спажывання. Карацей кажучы, усе буйныя гарады Беларусі яшчэ доўгі час будуць паскоранымі тэмпамі нарошчваць сацыяльную інфраструктуру ўслед за прыростам насельніцтва, у гэтым іх асноўныя эканамічныя цяжкасці. Затое ўмовы ўзнаўлення і папаўнення працоўных рэсурсаў за кошт падрастаючай моладзі ў такіх гарадах больш спрыяль-

ныя. Яны могуць расшыраць вытворчасць і сферу паслуг на аснове ўласных працоўных рэзерваў.

Як ужо адзначалася, пачынаючы з другой палавіны 70-х гг. увесь натуральны прырост насельніцтва рэспублікі забяспечваюць толькі гарады (табл. 1.9). Тут таксама ёсць свае плюсы і мінусы, якія ствараюць новыя жыццёвыя праблемы. Трэба памятаць, што гараджане — асаблівая катэгорыя насельніцтва. У адрозненне ад

*Табліца 1.9*

**Параўнальныя паказчыкі натуральнага прыросту гарадскога і сельскага насельніцтва Беларусі**

| Гады | Гарадское насельніцтва | | Сельскае насельніцтва | |
|---|---|---|---|---|
| | натуральны прырост | | натуральнае змяншэнне | |
| | тыс. чал. | ‰ | тыс. чал. | ‰ |
| 1979 | 66,3 | 12,4 | —5,4 | —1,2 |
| 1980 | 67,3 | 12,3 | —8,4 | —2,0 |
| 1981 | 70,9 | 12,6 | —6,1 | —1,5 |
| 1982 | 71,6 | 12,4 | —6,0 | —1,5 |
| 1983 | 80,1 | 13,5 | —4,4 | —1,1 |
| 1984 | 74,1 | 12,2 | —9,6 | —2,5 |
| 1985 | 71,5 | 11,4 | —12,2 | —3,2 |
| 1988 | 70,1 | 10,5 | —7,9 | —2,2 |

сельскіх жыхароў яны патрабуюць больш увагі з боку дзяржаўных органаў кіравання, паколькі склад іх жыцця амаль поўнасцю залежыць як ад сістэмы вытворчасці, так і размеркавання жыллёвых каштоўнасцей (прадуктаў харчавання, прадметаў спажывання, жылля, абслугоўвання, працаўладкавання). Калі сельскі жыхар больш залежыць ад прыроднага асяроддзя, то гараджанін — ад сацыяльна-эканамічнага. Сельскі жыхар непасрэдна можа выкарыстоўваць прадукты сваёй працы, а гараджанін у большасці выпадкаў стварае адно, а выкарыстоўвае другое, або наогул нічога не стварае, а толькі абслугоўвае. Таму ён вельмі залежыць ад сістэмы сувязей. Калі ў гэтай сістэме парушаецца хоць адно звяно, пачынаюцца цяжкасці і расце сацыяльная напружанасць. Невыпадкова ў аснове сацыяльна-палітычных канфліктаў у першую чаргу ляжаць нявырашаныя праблемы гараджан.

Акрамя натуральнага прыросту ў фарміраванні га-

*Табліца 1.10*

**Роля міграцыі ў фарміраванні гарадскога і сельскага насельніцтва Беларусі**

| Паказчыкі міграцыі | Гарадское насельніцтва | | | Сельскае насельніцтва | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1975 г. | 1980 г. | 1988 г. | 1975 г. | 1980 г. | 1988 г. |
| Колькасць, тыс. чалавек | | | | | | |
| прыбыўшых | 339 | 329 | 345 | 133 | 117 | 150 |
| выбыўшых | 251 | 253 | 266 | 213 | 196 | 228 |
| сальда міграцыі | | | | | | |
| дадатнае (+) | +88 | +76 | +79 | | | |
| адмоўнае (—) | | | | —80 | —79 | —78 |
| Інтэнсіўнасць міграцыі ў разліку на 1000 жыхароў, ‰ | | | | | | |
| прыбыцця | 71 | 60 | 55 | 28 | 28 | 39 |
| выбыцця | 53 | 46 | 42 | 46 | 46 | 60 |
| сальда (+, —) | +18 | +14 | +13 | —18 | —18 | —21 |

радскога насельніцтва надзвычайна вялікую ролю адыгрывае *міграцыя,* асабліва на ранняй стадыі ўрбанізацыі. На працягу амаль усяго пасляваеннага часу гарады рэспублікі мелі даволі стабільныя паказчыкі міграцыйнага абароту (прыбыцця і выбыцця) з пастаянным дадатным вынікам міграцыі і высокай інтэнсіўнасцю міграцыйнага руху (табл. 1.10).

За 80-я гг. у дынаміцы гэтага працэсу намецілася некаторае паслабленне, у выніку чаго зменшылася папаўненне гарадскога насельніцтва за кошт міграцыі. Калі ў 60-я гг. кожная тысяча гараджан за год атрымлівала 30 чалавек у выніку міграцыйнага прыросту, то ў канцы 80-х гг. гэта лічба знізілася да 10 чалавек. Аднак міграцыя працягвае складаць каля палавіны агульнага прыросту гарадскога насельніцтва Беларусі, аб чым больш падрабязна гл. раздзел 2.

*Адміністрацыйныя пераўтварэнні*, як крыніца росту гарадскога насельніцтва, ва ўмовах Беларусі ігралі нязначную ролю. За ўвесь пасляваенны перыяд з ліку сельскіх у ранг гарадскіх было пераведзена каля 50 пасяленняў. Але паколькі гэта былі невялічкія пасёлкі, то яны далі не больш 3% агульнага прыросту гараджан. Пералік гарадскіх пасяленняў, утвораных за перыяд з 1944 па 1990 г., прыведзены ў дадатку 4. Пры гэтым трэба адзначыць, што асноўныя пераўтварэнні адбыліся

ў 50-я і 60-я гг., а за апошнія 20 гадоў утворана толькі 6 гарадскіх пасёлкаў. У той жа час па меры развіцця гарадскіх агламерацый і тэрытарыяльнага пашырэння гарадскіх граніц усё большая колькасць сельскіх пасяленняў механічна ўключаецца ў мяжу гарадоў, а іх жыхары становяцца гараджанамі.

Урбаністычнае ўздзеянне на сельскага жыхара праяўляецца і праз маятнікавыя міграцыі, калі сельскім для яго застаецца толькі жыллё, а склад жыцця і працы прыбліжаецца да гарадскіх стандартаў. Такой катэгорыі насельніцтва становіцца ўсё больш і больш, яе называюць «скрытыя гараджане», якія не ўлічваюцца як жыхары гарадоў, але з'яўляюцца часткай іх працоўных рэсурсаў, спажыўцамі матэрыяльных каштоўнасцей і сацыяльных паслуг, удзельнікамі дэмаграфічных працэсаў.

Такім чынам, дэмаграфічная сітуацыя ў гарадах фарміруецца вельмі складана, яе ўздзеянне самае мнагагgranнае і павінна быць аб'ектам пастаяннага вывучэння і рэгулявання.

### 1.6. ДЭМАГРАФІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў СЕЛЬСКІХ ПАСЯЛЕННЯХ

Як ужо адзначалася, характар дэмаграфічнага развіцця ў сельскіх пасяленнях рэспублікі мае рад адметных асаблівасцей не толькі ў рэгіянальных адносінах, але і ў разрэзе розных тыпаў населеных пунктаў. Гэта выклікае неабходнасць спецыяльнага разгляду пытання.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што развіццё аграпрамысловага комплексу на тэрыторыі Беларусі ўжо многія гады адбываецца ва ўмовах рэзкага змяншэння колькасці сельскага насельніцтва і пагаршэння яго дэмаграфічнай структуры. Такі тэмп змяншэння колькасці сельскага насельніцтва, які назіраецца ў цяперашні час, можна лічыць празмерным і негатыўным як з эканамічнага, так і дэмаграфічнага пунктаў гледжання. Этнічны аспект таксама немалаважны, улічваючы, што сельскае насельніцтва з'яўляецца карэннай асновай беларускага этнасу.

У характары ўзнаўлення сельскага насельніцтва дамінуючую ролю стала іграць узроставая структура. Сельскія пасяленні амаль удвая ўступаюць гарадскім па агульнай колькасці жыхароў, колькасці асоб працаздольнага ўзросту і дзяцей, але ў іх жыве больш палаві-

*Табліца 1.11*

**Размеркаванне асноўных узроставых груп паміж горадам і сялом (перапіс насельніцтва 1989 г.)**

| Узроставыя групы | Агульная колькасць, тыс. чал. | Пасяленні | | | | Доля групы ў складзе насельніцтва, % | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | гарадскія | | сельскія | | | |
| | | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | гарадскога | сельскага |
| Дзеці і падлеткі да 16 гадоў | 2483 | 1746 | 70,3 | 736 | 29,7 | 26,3 | 21,0 |
| Асобы працаздольнага ўзросту | 5685 | 4013 | 70,6 | 1672 | 29,4 | 60,4 | 47,6 |
| Асобы пенсіённага ўзросту | 1984 | 882 | 44,5 | 1102 | 55,5 | 13,3 | 31,4 |

ны жыхароў пенсіённага ўзросту (гл. рыс. 1.6, табл. 1.11).

Па суадносінах самай маладзейшай узроставай групы (дзеці) і самай старэйшай (пенсіянеры) у сельскіх пасяленнях складваецца рэгрэсіўны тып структуры, пры якой не забяспечваецца замена старых (адыходзячых) пакаленняў падрастаючымі. У 90-я гг. сельскія пасяленні ўступаюць з такой структурай, калі кожны іх трэці жыхар будзе ў пенсіённым узросце, а нагрузка ўтрыманцамі на аднаго працаздольнага ў 3 разы большая, чым у гарадах. Калі ў гарадах на пяць працаздольных прыпадае тры ўтрыманца, то ў сельскіх пасяленнях на кожнага працаздольнага прыпадае 1 утрыманец. Таму сярод праблем сацыяльнай перабудовы вёскі, акрамя праблем сацыяльнага забеспячэння старэйшага пакалення, стаіць праблема працоўнага балансу.

Суадносіны, якія склаліся ў 70-х гг., у наступныя гады выклікалі яшчэ большую дыспрапорцыю паміж выбыццём на пенсію і ўступленнем у працаздольны ўзрост. Фарміраванне кантынгентаў працаздольнага насельніцтва адбываецца пад уздзеяннем замены пакаленняў, міграцыі і смяротнасці. Міграцыяй ахоплены ў асноўным больш маладыя ўзроставыя групы, а смяротнасць скарачае колькасць старэйшых узростаў. Аднак за апошнія гады ўзрасла колькасць смяротных выпадкаў сярод маладога мужчынскага насельніцтва ад траўмаў, атручванняў і няшчасных выпадкаў. Страт працаздольнага

насельніцтва ад знешніх прычын можа наогул не быць. Гэтыя прычыны заключаюцца і ў п'янстве, і ў тэхнізацыі сельскага жыцця без дастатковай да яе падрыхтоўкі, і ў адсутнасці службы рэанімацыі, хуткай медыцынскай дапамогі і ў цэлым радзе недахопаў у сістэме аховы здароўя і прафілактыкі захворванняў. Страта кожнага працаздольнага чалавека абыходзіцца для дзяржавы стратамі ў вытворчасці нацыянальнага багацця. Таму ўмацаванне здароўя насельніцтва, барацьба з усякага роду з'явамі, якія яго пагаршаюць, павінна быць аб'ектам пастаяннай, дзейснай увагі. Органы аховы здароўя павінны інфармаваць мясцовыя органы ўлады аб стане здароўя насельніцтва так рэгулярна, як даюць справаздачы ўсе гаспадарчыя арганізацыі аб выніках сваёй дзейнасці. Кожны факт заўчаснай смяротнасці неабходна расцэньваць як з'яву незвычайную, як недахоп у рабоце сістэмы аховы здароўя і выхавання насельніцтва. Санітарна-гігіенічнае і экалагічнае выхаванне сельскага насельніцтва застаецца на нізкім узроўні, зусім адсутнічае яно сярод жыхароў малых вёсак.

Змяншэнне колькасці сельскіх дзяцей працягвалася і ў 80-я гг. і, як паказалі прагнозныя разлікі, будзе працягвацца ў 90-я. За 70-я гг. іх колькасць зменшылася амаль на 40% у цэлым па Беларусі, а ў сельскіх пасяленнях Віцебскай і Магілёўскай абласцей — на палавіну. У выніку ідзе змяншэнне колькасці дашкольнага і школьнага кантынгентаў, а затым і працаздольных пакаленняў.

Пастарэнне сельскага жаночага насельніцтва мае не толькі эканамічныя, але і дэмаграфічныя вынікі, паколькі няспынна змяншаецца колькасць дзетародных узростаў. У большасці дробных сельскіх пасяленняў самая актыўная дзетародная група — ад 20 да 30 гадоў — або наогул адсутнічае, або налічвае некалькі чалавек. У многіх пасяленнях засталіся толькі адны пенсіянеры. Такія вёскі паступова могуць знікнуць.

Па выніках Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 г., неабходна зрабіць поўную і самую падрабязную класіфікацыю ўсіх сельскіх пасяленняў па дэмаграфічнай сітуацыі, паколькі яна вызначае не толькі працоўны і спажывецкі патэнцыял, але і ўзнаўленчыя магчымасці кожнага з іх.

Разглядаючы *ўзровень нараджальнасці* ў сельскіх пасяленнях, неабходна адзначыць, што сельская мясцовасць Беларусі ў гэтых адносінах адрозніваецца ад «сус-

*Табліца 1.12*

**Размеркаванне сельскіх раёнаў Беларусі па ўзроўню нараджальнасці**

| Узровень нараджальнасці ў разліку на 1000 чал. | Паказчык, ‰ | Колькасць раёнаў у групе | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1970 г. | 1980 г. | 1988 г. |
| Мінімальны | менш за 12 | 11 | 50 | 22 |
| Нізкі | ад 12 да 15 | 66 | 48 | 66 |
| Сярэдні | ад 15 да 18 | 28 | 19 | 26 |
| Вышэй за сярэдні | ад 18 да 21 | 12 | — | 3 |

ветных стандартаў» тым, что ўступае гарадам па агульнаму каэфіцыенту нараджальнасці, які к пачатку 70-х гг. упаў да 14—12‰, а к канцу 70-х стаў ніжэй узроўню смяротнасці і не змог забяспечыць нават простае ўзнаўленне сельскага насельніцтва.

У тэрытарыяльным плане адбыўся зрух раёнаў у групу з мінімальным узроўнем нараджальнасці (табл. 1.12). Многія з іх маюць паказчык менш 10 народжаных дзяцей у разліку на 1000 жыхароў. Больш за ўсё такіх раёнаў у Гродзенскай вобласці (Навагрудскі, Карэліцкі, Іўеўскі, Шчучынскі і інш.). Усё часцей сустракаюцца яны ў Віцебскай вобласці. Рэзка павялічылася дадзеная група ў Гомельскай вобласці за кошт тых тэрыторый, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі. Гэта самы нізкі ўзровень нараджальнасці, які адзначаецца ў свеце. Ён не можа кампенсаваць смяротнасць і вядзе да натуральных страт насельніцтва.

Галоўная прычына такой эвалюцыі нараджальнасці — змяншэнне колькасці дзетароднага кантынгенту. «Дэфіцыт нявест» стаў тыповай з'явай у сельскіх пасяленнях. Маладыя сем'і ў асноўным імкнуцца ў буйныя, цэнтральныя пасёлкі, але ва ўмовах высокай занятасці жанчынымаці сям'я, таксама як і гарадская, пераходзіць да маладзетнасці. Гэта другая прычына зніжэння ўзроўню нараджальнасці. Такім чынам, на сельскія пасяленні ўплываюць тыя ж сацыяльна-эканамічныя фактары, што і на гарады, але да гэтага дабаўляюцца парушэнні ў полаўзроставай структуры насельніцтва.

Актывізацыя працэсу нараджальнасці ў сельскай мясцовасці магчыма ў тым выпадку, калі полаўзроставая структура нармалізуецца ў выніку замацавання ў вёсках моладзі, маладых сямей, маладых дзяўчат, а таксама пры ўмове стварэння ўсіх тых магчымасцей, якія неаб-

ходны сучаснай сельскай жанчыне для спалучэння працоўнай дзейнасці і мацярынства. Увесь комплекс мер па сацыяльнай перабудове вёскі павінен быць адначасова накіраваны і на паляпшэнне дэмаграфічных параметраў.

*Узровень смяротнасці* сярод сельскага насельніцтва рэспублікі мае тэндэнцыю да павелічэння (рыс. 1.3, табл. 1.13). Пры гэтым большасць раёнаў перайшла ў групу з максімальнымі паказчыкамі, што выклікае асаблівую трывогу. Так, у пачатку 70-х гг. яшчэ не было ніводнага раёна, дзе б паказчык смяротнасці перавышаў 13‰, а ў канцы 80-х гг. такі ўзровень смяротнасці мелі ўжо амаль усе сельскія раёны Беларусі. Прычым усё часцей сталі паўтарацца такія празмерна вялікія лічбы, як 18—20 і нават больш 20‰. Часцей за ўсё яны сустракаюцца ў Магілёўскай і Віцебскай абласцях (кожны другі раён). Асабліва выдзяляюцца Пастаўскі, Гарадоцкі, Чавускі, Шклоўскі і інш. Не менш трывожная сітуацыя ў многіх раёнах Гродзенскай і Мінскай абласцей (Навагрудскі, Карэліцкі, Дзятлаўскі, Валожынскі, Капыльскі і інш.). З'явіліся такія раёны і на поўдні рэспублікі, дзе даўжэй за ўсё ўтрымліваўся адносна нізкі ўзровень смяротнасці.

Павышэнне ўзроўню смяротнасці звязана не толькі з пастарэннем насельніцтва, хоць гэта прычына галоўная. Нездавальняючыя паказчыкі смяротнасці і ў больш маладых узростах, аб чым гаварылася вышэй. Сутнасць працэсу ва ўмовах рэспублікі вывучана недастаткова. Мала праводзіцца рэгіянальных даследаванняў сумеснымі намаганнямі медыкаў, біёлагаў, географаў. Фіксуецца ў асноўным смяротнасць і яе прычыны; вельмі мала вядо-

*Табліца 1.13*

**Размеркаванне сельскіх раёнаў Беларусі па ўзроўню смяротнасці**

| Узровень смяротнасці | Паказчык, ‰ | Колькасць раёнаў у групе | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1970 г. | 1980 г. | 1988 г. |
| Нізкі | менш за 7 | 8 | 2 | — |
| Сярэдні | 7—10 | 46 | 13 | 2 |
| Вышэйшы за сярэдні | 10—13 | 63 | 28 | 7 |
| Высокі | 13—18 | — | 48 | 75 |
| Празмерна высокі | 18—20 | — | 14 | 24 |
| | больш за 20 | — | — | 9 |

*Табліца 1.14*

**Размеркаванне раёнаў Беларусі па велічыні натуральнага прыросту і змяншэння сельскага насельніцтва**

| Узровень прыросту, змяншчэння | Паказчык, ‰ | Колькасць раёнаў у групе | | |
|---|---|---|---|---|
| | | 1970 г. | 1980 г. | 1988 г. |
| Прырост | | 114 | 38 | 29 |
| мінімальны | менш за 6 | 74 | 28 | 28 |
| сярэдні | 6—9 | 24 | 8 | 1 |
| вышэй за сярэдні | больш за 9 | 16 | 2 | — |
| Змяншчэнне | | 3 | 79 | 88 |
| нязначнае | менш за 3 | 3 | 35 | 36 |
| значнае | 3—6 | — | 29 | 25 |
| празмернае | 6—10 | — | 15 | 22 |
| | больш за 10 | — | — | 5 |

ма аб стане здароўя асобных груп насельніцтва ў розных зонах рэспублікі. Сельскія медыцынскія работнікі даследчую работу фактычна не праводзяць, бо не маюць належнай навукова-тэхнічнай базы і магчымасцей. За апошні час намнога пагоршыліся экалагічныя ўмовы працы, быту, харчавання і адпачынку сельскіх жыхароў, але яны таксама застаюцца пакуль што не вывучанымі. Таму здароўе сельскага насельніцтва, як аб'ект медыцынскага вывучэння ў рэгіянальным аспекце, набывае асаблівую актуальнасць і з'яўляецца адной з галоўных задач асобай навукі — медыцынскай геаграфіі.

Такім чынам, сацыяльны заказ для навукі па праблемах здароўя і працягласці жыцця пашыраецца і дапаўняецца новымі аспектамі. А на дадзеным этапе можна толькі канстатаваць той негатыўны факт, што сельскае насельніцтва Беларусі знаходзіцца ў стане дэпапуляцыі, бо нараджальнасць не можа кампенса-

*Табліца 1.15*

**Натуральны прырост (+) і змяншэнне (—) мужчынскага і жаночага насельніцтва ў сельскай мясцовасці Беларусі, тыс. чал.**

| Год | Мужчыны | Жанчыны |
|---|---|---|
| 1960 | +49,2 | +44,8 |
| 1965 | +27,1 | +23,5 |
| 1970 | +14,1 | +10,4 |
| 1975 | +3,5 | +0,7 |
| 1980 | —2,4 | —5,9 |
| 1985 | —3,3 | —8,9 |
| 1987 | —0,8 | —7,2 |

ваць смяротнасць, і натуральны прырост змяніўся натуральнай стратай. Яшчэ ў 1970 г. ва ўсіх сельскіх раёнах быў хоць і мінімальны, але ўсё ж дадатны натуральны прырост насельніцтва. У пачатку 80-х гг. дадатны прырост мелі ўжо толькі 38 раёнаў з 117, у 1988 г.— менш 30 раёнаў, якія пры гэтым перамясціліся ў групу з самым нізкім прыростам (табл. 1.14).

У сельскай мясцовасці натуральныя страты асабліва вялікія сярод жанчын. Напрыклад, у 1980 г. яны перавышалі страты мужчын у 2,5 раза, у 1985 г.— у 2,7 раза, у 1987 г.— амаль у 10 разоў (табл. 1.15). Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што пажылых жанчын у сельскай мясцовасці ў 3 разы больш, чым мужчын, таму іх больш і сярод тых, хто памірае (рыс. 1.7).

Жаночае сельскае насельніцтва настолькі пастарэла, што іменна па гэтай прычыне пачаўся працэс дэпапуляцыі. Маладых дзяўчат і жанчын ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў у сельскіх пасяленнях у 3,5 раза менш, чым у гарадах (гл. табл. 1.5).

Гэта сітуацыя незвычайная і нават надзвычайная. Яна склалася паступова пад уздзеяннем розных фактараў, у першую чаргу сацыяльна-эканамічных, калі многія працэсы ў сельскай гаспадарцы ўсё больш выцяснялі жаночую працу. Сярод іх калектывізацыя і механізацыя амаль усіх сельскагаспадарчых працэсаў, зніжэнне патрэбнасці ў жаночай рабочай сіле; абмежаваная сфера прымянення жаночай працы ў іншых галінах гаспадаркі на сяле; павелічэнне попыту на жаночыя рабочыя рукі ў гарадах (працаёмкая прамысловасць, сфера паслуг); незадаволенасць цяжкімі, непрэстыжнымі ўмовамі працы і жыцця на вёсцы; цяга да адукацыі і лепшых умоў існавання ў гарадскім асяроддзі і г. д. Нават факт наяўнасці вялікай колькасці «свабодных жаніхоў» не прывáблівае да сучаснай, яшчэ не вельмі прэстыжнай беларускай вёскі маладых дзяўчат.

Ёсць надзея, што з пераходам да новых умоў і форм гаспадарання зноў адрадзіцца спрадвечная функцыя сельскай жанчыны — быць гаспадыняй на сваёй зямлі, у сваёй гаспадарцы. Можа тады ажыве і беларуская вёска, і яе людскі патэнцыял. Каб гэта здарылася як мага хутчэй, трэба ўжо сёння звярнуць асаблівую ўвагу на стварэнне больш спрыяльных умоў працы і жыцця іменна для сельскай жанчыны.

Натуральныя страты сельскага насельніцтва перш за ўсё сталі назірацца на тэрыторыі паўночнай Беларусі,




Рыс. 1.7. Размеркаванне памёршых па полу і ўзросту:
*а*—гарадское насельніцтва; *б*—сельскае; штрыхоўкай паказана перавышэнне колькасці памёршых мужчын ці жанчын

дзе яны пачаліся яшчэ ў 1973 г. і працягваюцца ўжо амаль 20 гадоў. Паступова гэты працэс распаўсюджваўся к поўдню: у 1975 г. ён ахапіў Гродзенскую і Магілёўскую вобласці, з 1979 г.— Мінскую, з 1985 г.— Гомельскую і Брэсцкую. У многіх раёнах ён выяўляецца асабліва рэзка і вядзе да хуткага змяншэння колькасці насельніцтва. Склаліся цэлыя арэалы з самай трывожнай дэмаграфічнай сітуацыяй (рыс. 1.8).

Буйнейшы арэал з неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыяй цягнецца з захаду на паўночны ўсход праз Гродзенскую, Мінскую і Віцебскую вобласці (Навагрудскі, Карэліцкі, Іўеўскі, Валожынскі, Вілейскі, Мядзельскі, Докшыцкі, Гарадоцкі і іншыя раёны). З'явіліся такія арэалы ў цэнтры рэспублікі (Клецкі, Капыльскі, Нясвіжскі і інш. раёны), на паўднёвым усходзе (Горацкі, Крычаўскі, Шклоўскі, Краснапольскі раёны).

Узмацнілася дэпапуляцыя сельскага насельніцтва ў




Рыс. 1.8. Дэмаграфічная сітуацыя ў сельскай мясцовасці ў канцы 80-х гг.:

*1*—параўнаўча спрыяльная; *2*—блізкая да неспрыяльнай; *3*—неспрыяльная; *4*—крайне неспрыяльная; *5*—неспрыяльная і рэзка парушаная

паўднёвай зоне, якая адрознівалася найбольш спрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыяй. Тут гэты працэс звязаны з негатыўнымі вынікамі чарнобыльскай катастрофы. Ён ахапіў Брагінскі, Добрушскі, Калінкавіцкі, Нараўлянскі, Рэчыцкі, Хойніцкі і некаторыя іншыя раёны, з якіх пасля аварыі ідзе масавы адток моладзі, маладых сямей, дзяцей.

Такім чынам, на сучасным этапе абсалютная большасць сельскіх пасяленняў не дае прыросту насельніцтва рэспублікі. Дэмаграфічная сітуацыя расцэньваецца ў іх як неспрыяльная. Нязначны прырост маюць толькі сельскія пасяленні ў зоне Беларускага Палесся, а таксама ў прыгарадных зонах буйнейшых гарадоў. Таму фарміраванне тэрытарыяльных сістэм рассялення, асабліва ніжэйшага рангу — мясцовых, унутрыгаспадарчых — адбываецца ў асабліва складаных умовах узнаўлення насельніцтва. Гэта з'явілася адной з прычын, што стрымліваюць узбуйненне сельскіх пасяленняў.

У выніку змяненняў ва ўзнаўленні і дэмаграфічнай структуры сельскага насельніцтва сельскія населеныя пункты маюць вельмі абмежаваныя крыніцы рабочай сілы. Гэта з'яўляецца стрымліваючым фактарам развіцця не толькі ўсяго комплексу АПК, але і гарадоў рэспублікі, якія не могуць разлічваць на такі прыток рабочых рук, які яны мелі яшчэ 10 гадоў назад. Гэта значыць, што рэспубліка не можа больш арыентавацца на экстэнсіўны фактар вытворчасці. Працаашчадная палітыка становіцца асноўным прынцыпам гаспадарання.

Дэмаграфічная сітуацыя, якая склалася ў сельскіх пасяленнях рэгіёна,— гэта шматгадовы вынік адначасовага ўздзеяння цэлага рада сацыяльна-эканамічных фактараў. З аднаго боку, гэта вынік імклівага працэсу індустрыялізацыі і ўрбанізацыі, «прыцягваючых сіл» гарадоў, развіццё якіх ішло па экстэнсіўнаму шляху. Рэгуляванне іх росту пачалося фактычна ў канцы 70-х гг. і датычылася ў асноўным сталіцы. Астатнія гарады працягвалі і працягваюць нарошчваць свой працоўны патэнцыял па экстэнсіўнаму шляху, забіраючы ў бліжэйшых сельскіх раёнаў па сутнасці апошнія рэзервы. Прычым колькасць такіх гарадоў усё павялічваецца. Вось апошні прыклад — г. Смаргонь, які атрымаў буйнейшы аб'ект прамысловага будаўніцтва і пераўзышоў усе гарады Гродзеншчыны па тэмпах росту насельніцтва. Значыць, уздзейнічаць на дэмаграфічную сітуацыю ў сельскай мясцовасці можна праз рэгуляванне росту не толькі буйных, але абсалютна

ўсіх гарадоў шляхам выкарыстання іх унутраных рэзерваў.

Акрамя прыцягваючых сіл гарадоў неабходна ўлічваць уздзеянне «выштурхоўваючых» сіл з вёскі, якія спачатку былі звязаны з утварэннем лішкаў рабочай сілы ва ўмовах паскоранай механізацыі вытворчых працэсаў, а пасля ўсё больш з сацыяльнымі матывамі (незадаволенасць умовамі працы, побыту, адпачынку). Карэннае сельскае насельніцтва члянілася на маладыя і старыя галіны. Маладыя выбывалі ў гарады і, як правіла, не вярталіся. На іх месца прыбывалі новыя прадстаўнікі і фарміравалі новую сельскую інтэлігенцыю, якая прайшла сістэму адукацыі ў гарадах, набыла новы характар заняткаў, новы стэрэатып паводзін, у тым ліку дэмаграфічных, з дамінуючай маладзетнай сям'ёй. Згодна перапісу насельніцтва 1970 г., у рэспубліцы склалася такая структура сельскіх сямей, пры якой у роўных адносінах былі сем'і: без дзяцей — 24%, з 1 дзіцем — 28, з 2 дзецьмі — 25, з 3 і больш дзецьмі — 23%.

Як відаць, яшчэ ў пачатку 70-х гг. амаль 80% сельскіх сямей не забяспечвалі нават простага ўзнаўлення пакалення. Прычым гэта было ўласціва прадстаўнікам ўсіх асноўных нацыянальных груп, якія пражывалі на тэрыторыі рэспублікі. Міні-сем'і, у складзе якіх 2 або 3 чалавекі, сярод аднанацыянальных беларускіх сямей складалі палавіну, сярод рускіх і ўкраінскіх — звыш 60%. У наступныя гады працэс гэты пашыраўся і мінісем'і сярод усіх этнічных груп складалі ўжо звыш 70%. Асаблівасць такой невялікай сельскай сям'і ў тым, што яна мела дзяцей, але страціла іх у выніку міграцыі.

Такім чынам, рэгіянальны геаграфічны падыход дазваляе выявіць тыя адрозненні ў дэмаграфічным развіцці, якія звычайна хаваюцца за сярэднімі велічынямі і аказваюць уплыў на розныя сацыяльныя і эканамічныя працэсы.

## 2. ХАРАКТАР МІГРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

### 2.1. АГУЛЬНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Міграцыя — гэта працэс перамяшчэння людзей праз граніцы тых ці іншых тэрыторый з пераменай месца жыхарства назаўсёды ці часова. Гэта вельмі складаны працэс. На яго можна ўздзейнічаць, толькі глыбока ведаю-

чы прычыны і матывы прыбыцця ці выбыцця людзей. Таму для вывучэння міграцыі акрамя статыстычнай інфармацыі шырока выкарыстоўваюцца спецыяльныя абследаванні, апытанні насельніцтва, анкетаванне, выбарчыя перапісы і г. д. Некаторыя вынікі такіх абследаванняў будуць выкарыстаны ў гэтай кнізе.

Галоўнай рухаючай сілай міграцыі насельніцтва з'яўляюцца зрухі ў развіцці і размяшчэнні вытворчых сіл. Аб'ектыўна міграцыя неабходна як працэс, які дазваляе на кожным этапе эканамічнага развіцця дабівацца патрэбнага размеркавання і пераразмеркавання працоўных рэсурсаў і наогул з'яўляецца неабходнай умовай развіцця чалавечага грамадства. Міграцыя забяспечвае раўнавагу паміж попытам на рабочую сілу і яе прапановай, яна ўплывае на рост культурнага ўзроўню насельніцтва, яго сацыяльнае развіццё, фарміраванне светапогляду, садзейнічае інтэрнацыянальным сувязям і збліжэнню народаў.

Але гэты працэс могуць выклікаць і іншыя прычыны: палітычныя ці ваенныя абставіны, экалагічныя катастрофы, прыродныя бедствы, міжнацыянальныя канфлікты і г. д. Тады працэс прымае вымушаны характар, хвалепадобны, непрадбачны.

Ва ўсіх выпадках працэс міграцыйнай рухомасці насельніцтва прадыктаваны асабістым імкненнем чалавека перасяліцца туды, дзе, на яго погляд, умовы працы ці побыту найбольш поўна адпавядаюць яго асабістым патрабаванням. Гэта могуць быць патрабаванні эканамічнага характару, звязаныя з працоўнай дзейнасцю, вучобай, жыллёвымі ўмовамі, зарплатай, абслугоўваннем. Гэта і матывы сямейнага характару (замужжа, развод, жаданне жыць паблізу ад родзічаў); незадаволенасць палітычнымі ўмовамі ці міжнацыянальнымі адносінамі; пошук лепшага прыроднага асяроддзя ці нават псіхалагічнага.

Тэрыторыя Беларусі заўсёды вызначалася высокай міграцыйнай рухомасцю насельніцтва, якое зведала і дабравольныя і прымусовыя перамяшчэнні ва ўсіх відах і формах, адчула адмоўныя і дадатныя вынікі гэтага працэсу.

Да рэвалюцыі тысячы беларусаў у пошуках «лепшай долі» эмігрыравалі за мяжу, перасяляліся ў пошуках работы на шахты Данбаса, на заводы Цэнтральнай Расіі, Урала, шукалі вольныя землі ў Сібіры. З Беларусі ў Сібір выехала насельніцтва больш, чым з іншых частак

Расіі. Сяліліся беларусы ў раёнах, якія падобны на іх родныя мясціны, дзе можна было займацца сельскай або лясной гаспадаркай: ва Усурыйскім краі, Енісейскай, Табольскай, Томскай губернях. Галоўнай «рухаючай» сілай было аграрнае перанасяленне, беззямелле і адсутнасць работы ў сваіх гарадах.

Незвычайнага тыпу была міграцыя ў гады першай сусветнай і грамадзянскай войн. Усходнія раёны апынуліся ў прыфрантавой паласе, сюды хлынуў паток бежанцаў з Польшчы, Літвы, Заходняй Беларусі. Далей міграцыя ішла ў цэнтральныя раёны Расіі, дзе, па далёка не поўных даных, налічвалася больш за 1,3 млн. бежанцаў з Беларусі. У цэлым перыяд з 1914 па 1921 г. характарызаваўся рэзкім змяншэннем насельніцтва ў выніку ваенных страт, высокай смяротнасці, міграцыі ўглыб краіны і эміграцыі за мяжу (гл. Д 1).

У першыя гады савецкай улады з развіццём прамысловасці не хапала рабочых месц усім выхадцам з вёскі. Таму выбыццё за межы рэспублікі працягвалася. У гады даваенных пяцігодак значная доля насельніцтва ўключылася ў прамысловае і сельскагаспадарчае асваенне глыбінных раёнаў СССР: Урала, Сібіры, Казахстана, Далёкага Усходу, еўрапейскай Поўначы.

Асаблівай вехай у міграцыі насельніцтва гэтага перыяду былі 30-я гады, калі акрамя індустрыяльнага асваення новых раёнаў пачаўся этап сельскагаспадарчага асваення Далёкага Усходу, у якім беларускія сяляне таксама прынялі актыўны ўдзел. Сюды ж перасялілася з дробных беларускіх гарадоў і мястэчак частка яўрэйскага насельніцтва. У Прыамур'і была створана Яўрэйская аўтаномная вобласць.

Небывалыя маштабы мела міграцыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта была эвакуацыя з акупіраваных раёнаў у тыл. Тысячы сямей з Беларусі прынялі ў свае дамы жыхары Паволжа, Урала, Казахстана, Сярэдняй Азіі, Сібіры. Так інтэрнацыянальнае брацтва народаў вялікага Саюза дапамагло гэтым сем'ям выжыць, выстаяць у гады суровых выпрабаванняў. Потым ішоў працэс рээвакуацыі, г. зн. вяртання людзей у родныя мясціны па меры іх вызвалення ад ворага. Але частка насельніцтва так і засталася на пастаяннае жыхарства разам з эвакуіраванымі прадпрыемствамі.

Да ліку буйнейшых міграцый насельніцтва ў 40—50-я гг. непасрэдна з тэрыторыі Беларусі адносіцца абмен насельніцтвам паміж Польшчай і СССР. Абмен быў

выкліканы складанасцю канфігурацыі этнічных граніц, якія стварыліся ў выніку шматгадовага польскага панавання на вялікіх тэрыторыях Украіны, Беларусі, Літвы. Абмен ажыццяўляўся па афіцыяльнаму дагавору і ахапіў перыяды з 1944—1946 і 1955—1958 гг. Найбольш значныя вынікі ён меў у раёнах Гродзенскай вобласці і асобных заходніх раёнах Мінскай і Віцебскай абласцей. Закрануў абмен галоўным чынам гарады і мястэчкі, паколькі ў іх пражывала асноўная маса польскага насельніцтва. Палякі былі рэпатрыіраваны ў Польшчу (у агульнай колькасці з СССР больш за 2 млн. чалавек), а з Польшчы перасяліліся каля 37 тыс. беларусаў і больш чым 500 тыс. украінцаў.

У выніку гэтага віду міграцыі адбыліся змены і этнічнага характару. Да вайны ў гарадскіх пасяленнях Беларусі пражывала ў асноўным польскае і яўрэйскае насельніцтва. Яўрэйскае насельніцтва было амаль поўнасцю знішчана акупантамі, значная частка эмігрыравала, польскае насельніцтва рэпатрыіравана, таму з'явілася праблема ўзнаўлення насельніцтва гэтых пасяленняў. Засяляліся яны беларускімі жыхарамі з бліжэйшых вёсак, а таксама выхадцамі з раёнаў РСФСР, якія найбольш пацярпелі ў гады вайны. Паступова такія гарады станавіліся беларуска-рускімі па этнічнай структуры.

У першыя пасляваенныя гады ішло засяленне Калі-

*Табліца 2.1*

**Размеркаванне беларусаў за межамі Беларусі (наводле перапісу 1989 г.)**

| Раён пражывання | Колькасць беларусаў, тыс. чал. | З іх жывуць | |
|---|---|---|---|
| | | у гарадах | у сельскай мясцовасці |
| Беларусь | 7905 | 4867 | 3038 |
| Расія | 1206 | 954 | 242 |
| Украіна | 440 | 349 | 91 |
| Казахстан | 183 | 113 | 70 |
| Латвія | 120 | 90 | 30 |
| Літва | 63 | 54 | 9 |
| Эстонія | 28 | 26 | 2 |
| Малдова | 20 | 16 | 4 |
| Грузія | 9 | 7 | 2 |
| Туркменія | 9 | 8 | 1 |
| Кыргызстан | 8 | 6 | 2 |
| Таджыкістан | 7 | 5 | 2 |

нінградскай вобласці (былой Усходняй Прусіі), у якім прынялі ўдзел і жыхары Беларусі, асабліва з найбольш пацярпеўшых раёнаў. Па перапісу насельніцтва 1970 г., на гэтай тэрыторыі пражывала каля 70 тыс. беларусаў, г. зн. кожны дзесяты жыхар вобласці.

У 50-я гг. асаблівы этап у міграцыі насельніцтва быў звязаны з асваеннем цалінных зямель Казахстана і Заходняй Сібіры, у якім беларусы прынялі актыўны ўдзел. У цалінных раёнах Акцюбінскай, Кустанайскай, Какчэтаўскай і іншых абласцей яны складалі да 10% насельніцтва, а ўсяго, па перапісу 1970 г., на тэрыторыі Казахстана пражывала каля 200 тыс. беларусаў і больш за 60 тыс. палякаў, у большасці таксама выхадцаў з Беларусі. У цэлым, паводле перапісу 1959 г., за межамі рэспублікі жылі 1,4 млн. беларусаў, г. зн. амаль кожны пяты (у 1926 г.— кожны дзесяты). Перапіс насельніцтва 1989 г. паказаў, што не было ніводнай саюзнай рэспублікі, дзе б ні пражывалі беларусы (табл. 2.1).

Пры гэтым асноўная іх частка пасялілася ў гарадах. За межамі рэспублікі беларусы-гараджане складаюць звыш 80% ад агульнай колькасці (у самой Беларусі 60%). Кожны шосты беларус пражывае ў Расійскай Федэрацыі. Беларусы у Расіі па колькасці займаюць шостае месца пасля рускіх, татар, украінцаў, чувашоў і башкір. На Украіне па колькасці яны чацвёртыя пасля ўкраінцаў, рускіх і яўрэяў; чацвёртыя таксама ў Літве пасля літоўцаў, рускіх і палякаў; у Латвіі трэція пасля латышоў і рускіх.

Геаграфія беларускага этнасу не ўлічвае яшчэ той часткі беларусаў, якая асімілявалася ці свядома змяніла сваю нацыянальную прыналежнасць. Сярод беларусаў, як вядома, працэс асіміляцыі выражаны вельмі наглядна. Ён працякае ў такіх формах, як моўная асіміляцыя, стварэнне этнічна змешаных сямей, змены ў нацыянальнай самасвядомасці. Так, згодна перапісу насельніцтва 1989 г., кожны трэці беларус лічыць сваёй роднай мову іншага народа, у першую чаргу рускага; сярод беларусаў, якія жывуць у Расіі, такіх звыш 60%. Кожная пятая сям'я ў Беларусі — этнічна змешаная. Гэта значыць, што дзеці ў такой сям'і могуць і не быць беларусамі, не гаворачы аб тых змешаных сем'ях, якія ўтварыліся па-за межамі рэспублікі.

Сучасная карціна рассялення беларусаў уключае і тыя спрадвечна этнічныя тэрыторыі, на якіх пражывалі іх продкі яшчэ ў далёкім мінулым, як, напрыклад, су-

седнія раёны Расіі, Украіны, Прыбалтыкі, Польшчы, і тыя, дзе яны аказаліся ў выніку міграцыі, як, напрыклад, Казахстан, Карэлія, Комі, Далёкі Усход, Сібір.

У цэлым Беларусь заўсёды мела даволі значнае адмоўнае сальда міграцыі і побач з Расіяй была раёнам, які больш аддаваў свайго насельніцтва, чым атрымліваў узамен.

## 2.2. ГЕАГРАФІЯ МІГРАЦЫЙНЫХ ПЕРАМЯШЧЭННЯЎ У 70—80-я гг.

Разглядаючы працэс міграцыі насельніцтва Беларусі ў 70-я і 80-я гг., неабходна вылучыць два перыяды: да 1985 г. і пасля яго. Першы перыяд ужо мінуў; можна разглядаць яго асноўныя рысы і вынікі. Другі перыяд толькі пачаўся, але мае відавочныя адрозненні нават у першыя гады. Ніжэй будуць разгледжаны асноўныя рысы абодвух перыядаў.

**Асноўныя рысы і вынікі міграцыі ў 70-я і першай палавіне 80-х гг.** Сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця Беларусі ў гэтыя гады спрыялі актывізацыі міграцыйнага руху насельніцтва ўнутры рэспублікі, якая паступова пераўтварылася з пастаўшчыка рабочай сілы іншым раёнам у буйнейшага яе спажыўца для ўласных патрэб. Высокія тэмпы эканамічнага развіцця пры зніжэнні тэмпаў росту насельніцтва, павелічэнне патрэбы ў працоўных рэсурсах пры скарачэнні іх рэзерваў, хуткі рост гарадоў, паляпшэнне ўмоў жыцця і матэрыяльнага дабрабыту садзейнічалі змяншэнню адтоку насельніцтва за межы рэспублікі. У той жа час яе тэрыторыя стала прэстыжнай для мігрантаў з Сібіры, Урала, Казахстана. У выніку міграцыйныя страты практычна звяліся да нуля.

Разам з тым аб'ём міграцыі не зменшыўся, ён толькі змяніў напрамак і стаў унутрырэспубліканскім з дамінуючым перамяшчэннем з вёскі ў горад. Гэты напрамак склаў 2/3 міграцыйнага абароту. Сельская мясцовасць забяспечыла 90% усяго міграцыйнага прыросту насельніцтва гарадоў Беларусі. Гэта таксама адна з асаблівасцей рэспублікі, дзе асноўная маса гарадскога насельніцтва сфарміравалася за кошт мясцовых сялян.

На абмен з іншымі рэспублікамі ўнутры быўшага Саюза прыпадала 1/3 усяго міграцыйнага абароту з нязначным дадатным або нулявым сальда. Пры гэтым гарады ў абмене з іншымі рэспублікамі мелі хоць і невялі-

кае, але дадатнае сальда міграцыі (5—6 тыс. у год), а сельская мясцовасць прыкладна столькі ж штогод трацiла.

Міжнародныя міграцыі ў прыбыцці і выбыцці складалі не больш 1—2%, практычна з нулявым сальда. У гэтых перамяшчэннях удзельнічалі невялікія групы спецыялістаў, навучэнцаў, ваеннаслужачых.

У цэлым міграцыйная сітуацыя да сярэдзіны 80-х гг. як бы стабілізавалася. Рэспубліка актыўна пераразмяркоўвала свае працоўныя рэсурсы ўнутры сваіх граніц, знешнія перамяшчэнні мелі месца, але ў выглядзе сустрэчных, фактычна ўраўнаважаных патокаў, таму вынік абмену быў у асноўным «нічыйным».

Трэба адзначыць таксама разнастайнасць форм і напрамкаў тэрытарыяльнага перамяшчэння насельніцтва. Ва ўнутрырэспубліканскай міграцыі дамінуючымі заставаліся масавыя патокі ў напрамку з вёскі ў горад; узмацніўся прыток з гарадоў у вёскі; актывізаваліся перамяшчэнні паміж гарадамі і паміж вёскамі. Міжрэспубліканскай міграцыі таксама былі ўласцівы разнастайныя формы: арганізаваны набор рабочай сілы на пастаяннае ці часовае перасяленне, планавае размеркаванне спецыялістаў, перасяленне сямей, індывідуальныя перасяленні. Вялікую ролю ігралі сезонныя перамяшчэнні рабочай сілы ў выглядзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў, экспедыцыйна-вахтавых груп і інш.

Неабходна падкрэсліць, што міграцыі гэтага перыяду насілі ў асноўным эканамічны, дабравольны характар з мэтай працаўладкавання і прыстасавання да новых умоў жыцця, новага асяроддзя. Адсутнічалі такія негатыўныя, негуманныя формы, як дэпартацыі, рэпрэсіі, ссылкі, якія часта мелі месца ў мінулым.

Напрамкі міграцыі былі ў форме сустрэчных патокаў, звязаных з абменам працоўнай сілай ці яе папаўненнем. Эпіцэнтрамі прыцяжэння мігрантаў былі, як правіла, тыя раёны, дзе патрабаваліся працавітыя рукі ці вопытныя, кваліфікаваныя кадры.

Пераход на ўнутрырэспубліканскі міграцыйны абмен не азначаў, што Беларусь перастала ўдзельнічаць у гаспадарчым асваенні новых раёнаў СССР або парвала сувязі са сваімі суседзямі. Самыя актыўныя знешнія сувязі Беларусь падтрымлівала с РСФСР, на долю якой прыпадала каля 40% знешняга міграцыйнага абароту. Сярод раёнаў РСФСР вылучаліся перш за ўсё Цэнтральны, Паўночна-Заходні, Паўночны. Далей па аб'ёму мі-

грацыі ішлі раёны Сібіры — кожны шосты мігрант. На долю Украіны прыпадала прыкладна 10% у прыбыцці і выбыцці і на долю Прыбалтыкі каля 5%. Сувязі з Казахстанам у параўнанні з 50-мі гадамі рэзка скараціліся, больш выразным стаў прыток з Казахстана ў Беларусь. Толькі некалькі раёнаў краіны выклікалі змяншэнне насельніцтва (Прыбалтыйскі, г. Масква, г. Ленінград, Цюменская вобласць). З усімі астатнімі раёнамі вынік міграцыйнага абмену складваўся ў карысць Беларусі, або быў нулявы.

Сярод усходніх раёнаў (Заходняя і Усходняя Сібір, Далёкі Усход, Казахстан) найбольш актыўныя міграцыйныя сувязі Беларусь мела з Цюменскай вобласцю Заходняй Сібіры, дзе асвойваліся нафтагазавыя рэсурсы; з раёнамі ў зоне Байкала-Амурскай магістралі, з Краснаярскім краем і прыморскімі раёнамі Далёкага Усходу. Пры гэтым Беларусь стала пастаўляць усходнім раёнам не проста рабочую сілу, а найбольш кваліфікаваныя кадры праз усе формы планавага, арганізаванага і індывідуальнага пераразмеркавання працоўных рэсурсаў. Беларускія спецыялісты вялі пошук прыродных рэсурсаў, дапамагалі ў іх здабычы. Разам з імі працавалі будаўнікі дарог і гарадоў, работнікі ўсіх відаў транспарту, рабочыя на лесанарыхтоўках, рыбных промыслах, у сельскай гаспадарцы і сферы паслуг.

Міграцыя ва ўсходнія раёны насіла ў асноўным характар пераразмеркавання рабочай сілы. Для гэтых самых аддаленых раёнаў, багатых рэсурсамі, але неспрыяльных для жыцця людзей, часцей за ўсё практыкаваліся арганізаваныя формы перамяшчэння працоўных рэсурсаў. Адной з такіх форм быў арганізаваны набор рабочай сілы для прадпрыемстваў і будоўляў. Беларусь пастаянна ўдзельнічала ў такіх аргнаборах і накіроўвала спецыяльныя групы работнікаў для лясной гаспадаркі, дрэваапрацоўчай прамысловасці, будаўніцтва, рыбнай гаспадаркі і рыбнага промыслу. Гэтыя перамяшчэнні насілі як пастаянны, так і сезонны характар. У іх удзельнічалі галоўным чынам мужчыны з прафесіямі будаўнікоў, механізатараў і рознарабочыя. Перавага аргнабору была ў тым, што праз яго раён-заказчык атрымліваў тую рабочую сілу, якая яму патрэбна.

Штогод практыкавалася і такая форма планавай міграцыі, як арганізаванае перасяленне сямей з мэтай стварэння больш устойлівых дэмаграфічных груп аседлага насельніцтва ў новых раёнах асваення. Паступова

аб'ём гэтага перасялення зменшыўся да 200—300 сямей у год і праводзіўся дыферэнцыравана, з улікам працоўных магчымасцей тых або іншых раёнаў Беларусі.

У планавым парадку размяркоўвалася для усходніх раёнаў частка спецыялістаў рэспублікі, галоўным чынам інжынерна-тэхнічных і эканамічных кадраў з такіх навучальных устаноў, як інстытут народнай гаспадаркі, палітэхнічны, інжынерна-будаўнічы, тэхналагічны інстытуты. Іх выпускнікоў запрашалі на працу арганізацыі будоўлі Цюменскай вобласці, Якуціі, Краснаярскага, Прыморскага краёў, Магаданскай, Амурскай абласцей.

Як крыніца сезоннай рабочай сілы ва ўсходніх раёнах выкарыстоўваліся студэнцкія будаўнічыя атрады. Толькі з 1980 па 1985 г. у такіх атрадах удзельнічала звыш 10 тыс. чалавек, якія ўяўлялі сабой значную крыніцу рабочай сілы і выконвалі вялікі аб'ём работ.

У сувязі з актыўным асваеннем нафтавых і газавых радовішч Заходняй Сібіры пачаў практыкавацца асобы спосаб фарміравання працоўных калектываў — вахтавыя атрады. Беларускія вахтавыя атрады дапамагалі ў асноўным Цюменскаму раёну нафтаздабычы, выкарыстоўваючы свой вопыт на Рэчыцкіх нафтавых промыслах.

Такім чынам, арганізаваныя формы міграцыі ў пэўнай ступені садзейнічалі папаўненню працоўных рэсурсаў найменш працазабяспечаных усходніх раёнаў СССР. Аднак, нягледзячы на тое, што былі мабілізаваны ўсе формы арганізаванага пераразмеркавання рабочай сілы, у цэлым міграцыйныя патокі фарміравалі індывідуальныя перасяленні, якія складалі прыкладна 2/3 усіх мігрантаў на далёкія і блізкія адлегласці. Таму вялікая колькасць удзельнікаў такіх перамяшчэнняў не замацоўвалася на пастаяннае месца жыхарства. Агульны вынік міграцыйнага абмену з усходнімі раёнамі на працягу ўсяго аналізуемага перыяду складваўся ў карысць Беларусі. Адсюль можна зрабіць вывад, што ніякія формы, добраахвотныя ці нават прымусовыя, не змаглі стрымаць жаданне людзей перасяляцца, жыць і працаваць там, дзе ўмовы жыцця лепшыя.

У гэтыя ж гады вызначаліся актыўныя міграцыйныя сувязі з суседнімі рэспублікамі Прыбалтыкі. Але ў гэтым напрамку, наадварот, Беларусь несла значныя страты насельніцтва, бо ўмовы жыцця ў Літве, Латвіі і Эстоніі расцэньваліся мігрантамі, як лепшыя.

Абагульняючы вынікі міграцыі вызначанага перыяду, можна падкрэсліць, што перамяшчэнні насілі дабравол-

ны сацыяльна-эканамічны характар з мэтай зарабіць больш сродкаў для жыцця, знайсці цікавую працу, дапамагчы ў асваенні неабходных для гаспадаркі прыродных рэсурсаў, палепшыць сацыяльна-культурныя ўмовы існавання.

Адметнай рысай міграцыйнага абмену ў дадзены перыяд было павелічэнне прытоку мігрантаў на тэрыторыю Беларусі, якая ўзмацніла свой эканамічны патэнцыял і стала больш прыцягальнай для прадстаўнікоў іншых рэспублік. Гэта садзейнічала развіццю інтэграцыйных працэсаў, у тым ліку этнічных. Як сведчаць матэрыялы перапісу насельніцтва 1989 г., на тэрыторыі Беларусі пражывалі прадстаўнікі ўсіх 180 пералічаных народаў, якія насялялі СССР. Толькі колькасць іх была розная: ад некалькі чалавек да некалькіх тысяч. Ніжэй пералічаны найбольш шматлікія этнічныя групы, якія пражывалі на тэрыторыі рэспублікі ў час перапісу:

больш за 1 млн.

рускія—1 342 099

больш за 100 тыс.

палякі—417 720
украінцы—291 008
яўрэі—111 883

больш за 10 тыс.

татары—12 436
цыгане—10 762

больш за 5 тыс.

літоўцы—7606
азербайджанцы—5009

больш за 3 тыс.

армяне—4933
малдаване—4964
узбекі—3537
немцы—3517
чувашы—3327

ад 1 да 3 тыс.

латышы—2658
грузіны—2840
мардва—2620
казахі—2266
башкіры—1252
удмурты—1205

ад 500 чалавек да 1 тыс.

таджыкі, марыйцы, карэлы, комі, асеціны, эстонцы, туркмены, лезгіны, балгары, карэйцы, грэкі

Усе астатнія этнічныя групы налічваюць менш за 500 чалавек.

Такім чынам, тэрыторыя Беларусі стала таксама шматнацыянальнай. Этнічная інтэграцыя — прагрэсіўны і аб'ектыўны працэс развіцця чалавечага грамадства. Галоўнае, каб гэта грамадства ўмела жыць у згодзе і ўзаемадапамозе.

Прычыны і вынікі рассялення народаў, якое склалася на працягу гісторыі і працягваецца ў цяперашні час, яшчэ дэталёва не вывучаны, але ўжо сведчаць аб тым, што дэмакратычнай суверэннай Беларусі патрэбна будзе мець на ўвазе шмат пытанняў пры вырашэнні міжнацыянальных адносін як унутры самой рэспублікі, так і з суседнімі краінамі.

**Новы этап у міграцыі насельніцтва Беларусі**. З другой палавіны 80-х гг. пачынаецца новы этап у міграцыі насельніцтва Беларусі. Ён яшчэ не атрымаў пэўнай выразнасці, але некаторыя рысы ўжо можна выявіць.

У працэсе перамяшчэння людзей пачалі дзейнічаць новыя рухаючыя сілы. Гэтыя сілы маюць вытокі ў новай палітычнай сітуацыі, новых эканамічных адносінах і, на жаль, у новай экалагічнай сітуацыі.

Міграцыйныя патокі пачалі мяняць напрамак. Актывізуюцца сувязі з замежнымі краінамі і ўзрастае роля знешняй міграцыі, у першую чаргу эміграцыі. Пераглядаюцца ўсталяваныя сувязі паміж былымі рэспублікамі Саюза ССР ва ўмовах развіцця іх суверэнітэту. Парушыліся сувязі з раёнамі, дзе вельмі напружаная нацыянальна-палітычная абстаноўка. Можна нават сказаць, што некалькі прытармазіўся, як бы прыпыніўся працэс міграцыі па эканамічных матывах, а ўзраслі хвалі перамяшчэнняў па розных экалагічных, сацыяльна-палітычных, міжнацыянальных матывах, уключаючы вымушаныя перасяленні ў форме бежанства, эвакуацыі, рэпатрыяцыі былых дэпартыраваных народаў і г. д.

Усе гэтыя рысы закранулі і Беларускі рэгіён, толькі тут яны ўзмацніліся пад уздзеяннем тых працэсаў, якія ўзніклі ў выніку парушэння экалагічнага становішча і пагоршання жыццёвага асяроддзя. Гэта становішча стварыла адну адметную рысу — вымушаны характар міграцыі многіх тысяч жыхароў рэспублікі. Можна сцвярджаць, што менавіта праз узрыў міграцыі насельніцтва перш за ўсё праявілася небяспечнае ўздзеянне чарнобыльскай катастрофы. А самі перамяшчэнні людзей па характару можна назваць «экалагічнымі міграцыямі» з многімі адметнымі рысамі.

Упершыню на беларускай зямлі з'явіўся тэрмін «экалагічныя бежанцы». Дагэтуль яна ўжо зведала бежанства праз войны, голад, эпідэміі, рэпрэсіі, генацыд і інш., якія не аднойчы мелі месца ў мінулым. Сучасны характар міграцыі ўзрывападобны, непрадбачаны з самай экстранай, а таму вельмі цяжкай акцыяй перамяшчэння людзей у форме эвакуацыі жыхароў з 30-кіламетровай зоны радыяцыйнага ўздзеяння вакол аварыйнай Чарнобыльскай АЭС. Што значыць эвакуацыя, жыхарам Беларусі добра вядома з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Але на гэты раз яна была яшчэ горшая, бо з'яўлялася атамна-экалагічнай, калі кожная рэч, нават кавалак зямлі неслі з сабой пагрозу для жыцця. Таму эвакуіра-

ваныя вымушаны былі пакінуць усё, нават самае неабходнае на кожны дзень. Калі пасля вайны эвакуіраваныя маглі адразу вярнуцца дамоў, хоць на пажарышча, то ў чарнобыльскую зону наўрад ці змогуць вярнуцца яе жыхары ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі.

Другой формай вымушаных перамяшчэнняў стала арганізаванае адсяленне сямей і цэлых вёсак з найбольш пацярпеўшых раёнаў. Гэты працэс больш паступовы, ён працягваецца і ў сучасны момант, але не менш цяжкі ў адносінах да тых, хто вымушаны мяняць сваё месца жыхарства.

Трэцяй формай такой жа вымушанай міграцыі з'яўляюцца індывідуальныя перасяленні ў пошуках больш чыстага асяроддзя, дзеля таго каб захаваць здароўе і жыццё дзяцей і будучых пакаленняў. Гэтыя сем'і сустракаюцца з вялікімі цяжкасцямі ў працаўладкаванні і забеспячэнні жыллём, бо яны перамяшчаюцца самастойна.




Рыс. 2.1. Узровень міграцыйнага руху насельніцтва Беларусі ў сярэднім за 80-я гг.:

колькасць прыбыўшых і выбыўшых у разліку на 1000 жыхароў, чалавек: *1* — менш 70; *2*—ад 70 да 80; *3*—ад 80 да 100; *4*—ад 100 да 200

Сярод мігрыруючага насельніцтва з пацярпеўшых раёнаў і наогул з Беларусі цяпер многа дзяцей — гэта адна з асаблівасцей экалагічнай міграцыі.

Адметнай рысай з'яўляецца таксама нарастанне маштабу міграцыі, павелічэнне колькасці мігрыруючага кантынгенту, часта ў выглядзе сустрэчных патокаў (рыс. 2.1). Так, яшчэ да аварыі, у 1985 г. адмоўнае сальда міграцыі ў сельскай мясцовасці Гомельскай вобласці складала каля 9 тыс. чалавек, у год аварыі ў выніку эвакуацыі з трох раёнаў (Брагінскага, Хойніцкага і Нараўлянскага) яно рэзка ўзрасло амаль да 25 тыс., а ў 1990 г. перавысіла 30 тыс., ахапіўшы ўжо многія іншыя раёны, прылягаючыя да зоны. Міграцыйны адток расцякаецца ўшыр (табл. 2.2).

Такой жа асаблівай рысай з'яўляецца нарастанне міграцыйных страт, пры гэтым не толькі ў сельскай мясцовасці, але і ў гарадах. Так, упершыню за ўвесь пасляваенны перыяд адмоўнае сальда дала міграцыя ў г. Гомелі, дзе ў 1990 г. кожная тысяча жыхароў у выніку міграцыйнага адтоку траціла 10 чалавек. Стала несці страты ў цэлым гарадское насельніцтва вобласці (гл. табл. 2.2).

Міграцыйная хваля ад Гомельскай вобласці пайшла на ўсю рэспубліку, выклікаючы зрух у размяшчэнні насельніцтва і дзелячы мясцовасці на аддаючыя і прымаючыя.

Міграцыйны бум 1990 г. ёсць таксама вынік небяспечнасці пражывання, але ён ўжо напоўніўся новым зместам і мае новыя рысы. Адной з іх стала масавая эміграцыя ў замежныя краіны і павелічэнне міграцыйных страт насельніцтва. Яшчэ ў 1987 г. з Беларусі эмігрыравала менш 1 тыс. чалавек, у 1989 г.— звыш 14 тыс., а у 1990 г.— звыш 30 тыс.

Доказам таго, што іменна экалагічны фактар стымулюе эміграцыю, з'яўляецца той факт, што на Гомельскую і Магілёўскую вобласці прыпадае больш палавіны ўсіх эмігрантаў з Беларусі, а інтэнсіўнасць эміграцыі ў разліку на 10 тыс. жыхароў дасягнула 70 чалавек (табл. 2.3).

Каб больш дасканала вывучыць сутнасць гэтага працэсу, была праведзена адпаведная праца па выяўленню яго колькасных і якасных характарыстык. Таму ёсць падставы меркаваць, што першапрычыны эміграцыі хаваюцца не толькі ў экалагічных, але і іншых матывах — сацыяльна-эканамічных, палітычных, нацыянальных, рэлігійных і інш. Яны накопліваліся даўно і толькі

*Табліца 2.2*

**Паказчыкі міграцыі насельніцтва Гомельскай вобласці да і пасля чарнобыльскай аварыі**

| Мясцовасць | Колькасць прыбыўшых, тыс. чал. | | | Колькасць выбыўшых, тыс. чал. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1985 г. | 1986 г. | 1990 г. | 1985 г. | 1986 г. | 1990 г. |
| Гарадскія пасяленні | 56 | 57 | 52 | 41 | 54 | 66 |
| г. Гомель | 25 | 24 | 23 | 17 | 20 | 28 |
| Сельская мясцовасць | 27 | 39 | 26 | 35 | 63 | 58 |
| у тым ліку раёны: | | | | | | |
| Брагінскі | 0,8 | 0,6 | 0,6 | 1,2 | 10,2 | 2,1 |
| Нараўлянскі | 0,6 | 0,5 | 0,3 | 0,9 | 6,5 | 1,6 |
| Хойніцкі | 0,4 | 0,4 | 0,5 | 0,7 | 6,6 | 4,2 |
| У сярэднім па вобласці | 83 | 96 | 78 | 76 | 117 | 124 |

| Мясцовасць | Сальда міграцыі дадатнае (+), адмоўнае (—), тыс. чал. | | | Інтэнсіўнасць міграцыйнага прыросту (+), страт (—) у разліку на 1000 жыхароў | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1985 г. | 1986 г. | 1990 г. | 1985 г. | 1986 г. | 1990 г. |
| Гарадскія пасяленні | 15 | 3 | —14 | 15 | 3 | —13 |
| г. Гомель | 8 | 4 | —5 | 16 | 9 | —10 |
| Сельская мясцовасць | —8 | —24 | —32 | —14 | —44 | —52 |
| у тым ліку раёны: | | | | | | |
| Брагінскі | —0,3 | —9,6 | —1,5 | —10 | —384 | —90 |
| Нараўлянскі | —0,3 | —6,0 | —1,3 | —18 | —460 | —145 |
| Хойніцкі | —0,3 | —6,2 | —3,7 | —10 | —250 | —185 |
| У сярэднім па вобласці | 7 | —21 | —46 | 4 | —13 | —28 |

ў новых палітычных умовах змаглі праявіцца. Уздзеянне чарнобыльскай катастрофы яшчэ больш актывізавала працэс эміграцыі. Вялікі ўплыў аказвае той палітычны клімат у краіне, які стварыўся ў перыяд перабудовы і даў магчымасць рэалізаваць імкненне туды, дзе лепш, тых, каго не задавальнялі ўмовы жыцця ў сучаснай Беларусі. Доказам гэтага вываду з'яўляецца сама геаграфія эпіцэнтраў беларускай эміграцыі — гарады Мінск, Гомель, Магілёў, Віцебск (калі найбольш пацярпелі ад аварыі іншыя тэрыторыі). Другім доказам гэтага вываду з'яўляецца састаў эмігрантаў, у якім ад 70 да 90% пакуль што складалі асобы яўрэйскай нацыянальнасці,

калі ад аварыі пацярпелі і беларусы, і рускія, і ўкраінцы. Эпіцэнтры прыцяжэння мігрантаў з Беларусі — Ізраіль і ЗША.

У цэлым і з многіх іншых рэспублік патокі эміграцыі маюць асаблівы састаў мігрантаў. У ім вырысоўваецца яўна дамінуючы нацыянальны (этнічны) характар. Напрыклад, з Казахстана выбываюць немцы, карэйцы; з еўрапейскай часткі Расіі і Беларусі — яўрэі; з Каўказа — армяне і г. д. У такіх патоках пераважаюць целыя сем'і, у якіх і дзеці, і бацькі, і дзяды.

Сярод эмігрантаў вялікую частку складаюць кваліфікаваныя кадры з ліку маладых спецыялістаў перадавых галін гаспадаркі, сферы паслуг, навукі. Як вядома, замежныя краіны разглядаюць іміграцыю не толькі з дабрачынных меркаванняў, але бачаць у ёй крыніцу ўзбагачэння за кошт таннай, кваліфікаванай працы імігранта. Таму з павелічэннем колькасці выбываючых з нашай рэспублікі павялічваюцца патрабаванні і нават абмежаванні з боку краін, якія прымаюць мігрантаў. Ва ўсякім разе, у сучасны момант эміграцыя з Беларусі пакідае свой негатыўны след і гэта праяўляецца ў розных аспектах.

Так, у адрозненне ад унутранай міграцыі яна не мае кампенсацыі за кошт прыбыцця з замежных краін, не мае абмену сустрэчнымі патокамі, паколькі паток ідзе ў адным напрамку. Пры гэтым рэспубліка нясе толькі страты. Эміграцыйная хваля выносіць за межы частку

*Табліца 2.3*

**Тэрытарыяльнае размеркаванне эмігрантаў з Беларусі**

| Вобласці | Усяго выехала на пастаяннае жыхарства ў замежныя краіны, чал. | | У разліку на 10 тыс. жыхароў | |
|---|---|---|---|---|
| | 1989 г. | 1990 г. | 1989 г. | 1990 г. |
| Брэсцкая | 1105 | 960 | 8 | 7 |
| Віцебская | 248 | 3087 | 2 | 22 |
| Гомельская | 4347 | 12287 | 26 | 73 |
| Гродзенская | 114 | 493 | 1 | 4 |
| Мінская | 225 | 1266 | 1 | 8 |
| Магілёўская | 2615 | 5759 | 20 | 45 |
| г. Мінск | 6026 | 10242 | 37 | 63 |
| Усяго | 14 680 | 34 094 | 14 | 33 |

лепшага працоўнага патэнцыялу, паколькі палавіну складаюць кваліфікаваныя кадры, сярод якіх вучоныя, педагогі, медыкі, эканамісты, работнікі гандлю, бытавога абслугоўвання, вопытныя рабочыя прамысловасці. Усе яны не лішнія для Беларусі, якая і без таго мае не вельмі багаты інтэлектуальны патэнцыял. Такія страты ўжо былі ў гады вайны і рэпрэсій, іх з вялікімі намаганнямі ўдалося адолець, несучы вялікія затраты на адукацыю новых пакаленняў. Акрамя таго, усіх выбыўшых трэба замяніць, беручы з другога месца ці навучаючы новыя кадры. Значыць, зноў страты, не гаворачы аб тым, што з эмігрантамі выбываюць веды, ідэі, матэрыяльныя сродкі. Ва ўмовах дэфіцыту і эканамічных цяжкасцей будзе нялёгка кампенсаваць усе гэтыя страты. Эміграцыя ўжо ўнесла прыкметныя зрухі ў працоўны баланс рэспублікі, асабліва тых гарадоў, якія больш за ўсіх уключыліся ў гэты працэс.

Змены адбываюцца і ў сацыяльнай структуры насельніцтва, паколькі выбываюць у асноўным гараджане, рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя. У этнічнай структуры змяншаецца доля яўрэйскага этнасу, паколькі эміграцыя мае выражаны монаэтнічны характар.

Новыя напрамкі атрымала міграцыя і ўнутры рэспублікі, з яўна выражанай арыентацыяй на поўнач. Новыя праблемы ставіць яна перад органамі ўлады і самімі жыхарамі. Пытанні гэтыя яшчэ знаходзяцца ў стане вывучэння.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сказаць, што пачатак 90-х гг. адкрывае новую эпоху ў сусветнай міграцыі, галоўнай рысай якой з'яўляецца павелічэнне патоку з былых сацыялістычных краін Усходняй Еўропы, СССР, і Беларусь тут не выключэнне. Гэты паток накіроўваецца ў краіны Заходняй Еўропы, ЗША і іншыя краіны Амерыкі, Ізраіль, ёсць выпадкі эміграцыі ў Аўстралію і Новую Зеландыю.

Нельга сказаць, што эміграцыя нясе толькі адмоўныя вынікі. Ужо сам факт магчымасці выбару месца жыхарства па ўласнаму жаданню — вялікае палітычнае і прававое дасягненне, прыкмета дэмакратызацыі жыцця.

Новая сітуацыя ў адносінах да міграцыі патрабуе больш уважлівага назірання за гэтым складаным працэсам, якім вельмі цяжка кіраваць.

Відавочна адно, што народжаная 19 верасня 1991 г. самастойная суверэнная Рэспубліка Беларусь павінна добра ведаць свае магчымасці, свае багацці, дасягненні

і недахопы, умела і разумна, беражліва і рацыянальна выкарыстоўваць усё тое, што ёсць на яе тэрыторыі. Неабходна, як гэта робяць усе краіны, праводзіць сваю міграцыйную палітыку, якая б не толькі рэгулявала адток, але і прыток патрэбнай рабочай сілы, яе абмен. Пытанні гэтыя патрабуюць глыбокага вывучэння. Ва ўсіх краінах працуюць спецыяльныя службы, якія вывучаюць прычыны, магчымасці міграцыі, кантынгент яе ўдзельнікаў, распрацоўваюць для ўрада меры палітыкі, каб накіроўваць працэс у русла, выгаднае сваёй краіне.

Асаблівай увагі патрабуюць праблемы перамяшчэння насельніцтва з тэрыторый, пацярпеўшых ад чарнобыльскай аварыі. Перасяленне будзе менш балючым толькі тады, калі яно будзе добра падрыхтавана. Тыя абследаванні, якія за гэты час праведзены, паказалі, што ўладкаванне на новых месцах жыхарства не заўсёды здавальняе пераселеных туды людзей. Часта яны пакідаюць прапанаваныя ім гарады і вёскі, самі шукаюць больш спрыяльных умоў для жыцця, трацячы на гэта сродкі, час і здароўе. Недастаткова вывучаюцца запатрабаванні перасяленцаў, з аднаго боку, і магчымасці для іх жыццёўладкавання, з другога. Тут, на жаль, не хапае канцэнтрацыі намаганняў усіх тых навуковых і гаспадарчых устаноў, якія маглі б сумесна зрабіць значна больш на шляху вырашэння складаных і непрадбачаных праблем, якія так нечакана абрушыліся на рэспубліку.

### 2.3. АСНОЎНЫЯ РЫСЫ І ПРАБЛЕМЫ ЎНУТРАНАЙ МІГРАЦЫІ

Як адзначалася, унутраная міграцыя іграла і прадаўжае іграць асаблівую ролю ў фарміраванні і размеркаванні насельніцтва Беларусі. Міграцыя неразрыўна звязана з працэсам урбанізацыі, яна яго ўмова і вынік. На прыкладзе беларускіх гарадоў гэта асабліва відавочна, бо яны сваім колькасным ростам у першую чаргу абавязаны міграцыі насельніцтва з вёскі.

Найбольш наглядна праяўляецца колькаснае і якаснае значэнне міграцыі ў фарміраванні насельніцтва сталічнага горада Мінска (табл. 2.4). За пасляваенныя гады ў выніку міграцыі горад атрымаў каля 1 млн. жыхароў. У 70-я і наступныя гады меры дзяржаўнага рэгулявання росту горада паступова прывялі да зніжэння

долі міграцыі ў адносінах да натуральнага прыросту.

Фарміраванне насельніцтва сталіцы Беларусі ідзе амаль поўнасцю за кошт сельскай мясцовасці сваёй рэспублікі (табл. 2.5). Амаль 8 мігрантаў з 10 у агульным міграцыйным прыросце — выхадцы з вёскі, і кожны другі — з навакольных раёнаў Мінскай вобласці. Гэта вельмі цікавая рыса для сталічнага горада і новая для Мінска, бо ў мінулым яго насельніцтва фарміравалі не карэнныя этнічныя групы.

*Табліца 2.4*

**Доля міграцыі ў фарміраванні насельніцтва г. Мінска**

| Перыяд | Агульны прырост, тыс. чал | У тым ліку за кошт прыросту, % | |
|---|---|---|---|
| | | натуральнага | механічнага |
| 1959—1964 | 210 | 34 | 66 |
| 1965—1970 | 234 | 28 | 72 |
| 1971—1984 | 213 | 50 | 50 |
| 1985—1987 | 51 | 55 | 45 |

*Табліца 2.5*

**Крыніцы міграцыйнага прыросту насельніцтва г. Мінска (80-я гг., %)**

| Раёны прыбыцця | Усяго прыбыло | Міграцыйны прырост |
|---|---|---|
| Усяго | 100 | 100 |
| у тым ліку з Беларусі | 83 | 94 |
| з сельскіх пасяленняў | 52 | 82 |
| з гарадоў | 31 | 12 |
| з Мінскай вобласці | 40 | 51 |
| з сельскіх пасяленняў | 30 | 46 |
| з гарадоў | 10 | 5 |

Практычна ўсе гарады Беларусі, у першую чаргу Мінскай вобласці, таксама аддаюць частку свайго насельніцтва сталіцы, але ў агульным прыросце іх доля нязначная. Мігранты з іншых рэспублік складаюць менш за 10% прыросту. Гэта ў асноўным жыхары прыгранічных тэрыторый, ёсць прадстаўнікі Сібіры, Далёкага Усходу, Казахстана.

Асноўная маса мігрантаў прыбывае ў горад на ра-

боту і пастаяннае месца жыхарства. Гэта найбольш стабільная частка насельніцтва. Каля 40% прыбывае на вучобу. Гэта катэгорыя самая дынамічная, паколькі пасля заканчэння вучобы частка прыбыўшых зноў выбывае з горада. Усім сталічным гарадам уласціва асобая горадаўтвараючая група — студэнцтва. Напрыклад, у Мінску гэта кожны дзесяты жыхар. Значыць, рэгуляванне росту гарадоў павінна быць звязана не толькі з рэгуляваннем вытворчасці, але і сістэмы падрыхтоўкі кадраў. Так, Мінск цалкам мог бы абысціся без многіх навуковых устаноў, якія можна размясціць у іншых гарадах, і тым самым знізіць міграцыйны «ціск» на сталіцу. Гарады атрымліваюць асобы састаў мігрантаў. Напрыклад, у міграцыйным прыросце насельніцтва Мінска дамінуе моладзь да 20 гадоў (рыс. 2.2). Гэта найбольш маладое, але і найменш кваліфікаванае, сельскае насельніцтва, што стварае цэлы рад праблем: прафесійнай адукацыі, працаўладкавання, забеспячэння ўсімі неабходнымі матэрыяльнымі і духоўнымі дабротамі. Асабліва вострай з'яўляецца жыллёвая праблема, бо несямейныя мігранты паступова ствараюць сем'і і павялічваюць запатрабаванні на жыллё. Тэмпы росту жыллёвага фонду адстаюць ад тэмпаў росту насельніцтва гарадоў. Гэта дыспрапорцыя характэрна для ўсяго комплексу сацыяльнай інфраструктуры.

Многія гарады, дзе навукова-адукацыйны патэнцыял меншы, а галоўнай мэтай міграцыі з'яўляецца задавальненне попыту на рабочую сілу, атрымліваюць дарослае насельніцтва, больш кваліфікаванае, але гэта не значыць, што праблемы міграцыі згладжваюцца.

Дэмаграфічная абстаноўка ў рэспубліцы абумовіла той факт, што экстэнсіўныя метады вядзення эканомікі практычна вычарпаны. Ва ўмовах пераходу на інтэнсіўны шлях развіцця аб'ектыўна неабходна прадуманая доўгачасовая канцэпцыя развіцця насельніцтва, якая прадугледжвае рэгуляванне росту ўсіх тыпаў населеных месц. Рэгуляванне росту горада-цэнтра магчыма толькі пры ўмове фарміравання сістэмы рассялення, калі частку яго функцый бяруць на сябе іншыя пасяленні з бліжэйшага акружэння або перыферыйнай зоны. Прыкладам таго можа служыць рэгуляванне росту г. Мінска шляхам пераразмеркавання эканамічнай «нагрузкі» на яго бліжэйшае і далейшае акружэнне. Такія гарады, як Жодзіна, Барысаў, Мар'іна Горка, Маладзечна, Дзяржынск, Фаніпаль, Стоўбцы і інш.,




Рыс. 2.2. Некаторыя характарыстыкі саставу мігрантаў г. Мінска, %:

*а*—мэта прыбыцця: *1*—на вучобу, *2*—на работу і жыхарства; *б*—узровень адукацыі: *1*—сярэдняя і ніжэй, *2*—сярэдняя спецыяльная, *3*—вышэйшая; *в*—узрост прыбываючых на работу і жыхарства; *г*—узрост прыбываючых на вучобу

развіваюцца па шляху стварэння філіялаў, адпаведна звязаных і дапаможных вытворчасцей адзінага тэрытарыяльна-вытворчага комплексу. Гэтыя гарады ўжо паспяхова канкурыруюць са сталіцай як цэнтры прыцягнення мігрантаў і з'яўляюцца свайго роду фарпостамі, якія ахоўваюць сталіцу ад празмернай эканамічнай і дэмаграфічнай нагрузкі.

Па такім жа шляху ідзе абмежаванне росту Гомеля, Віцебска, Магілёва і іншых буйных гарадоў. У саміх цэнтрах развіваюцца больш навукаёмкія галоўныя вытворчасці, якія патрабуюць высокакваліфікаваных кадраў і цеснага супрацоўніцтва з навуковымі і праектнымі арганізацыямі.

Далейшая актывізацыя сацыяльна-эканамічнага развіцця малых і сярэдніх гарадоў — гэта найбольш дзейсны шлях рэгулявання не толькі міграцыі, але і ўсёй сістэмы рассялення ў рэгіёне. Аднак варта мець на ўвазе, што ўмовы развіцця гэтай групы гарадоў у параўнанні з 60-мі гадамі пагоршыліся. Рэзервы работнікаў, якія раней былі заняты ў хатняй і асабістай падсобнай гаспадарцы гэтых гарадоў, у цяперашні час вычарпаны, натуральны прырост працоўных рэсурсаў нязначны, на прыток з навакольных вёсак таксама не прыходзіцца разлічваць. Таму патрэбны новыя структурныя змены ў эканоміцы малых гарадоў з больш шырокім укараненнем такіх форм дробнай вытворчасці, як індывідуальная працоўная дзейнасць, розныя віды арцельнай, кааператыўнай працы, развіццё падсобных промыслаў, пярвічных звенняў АПК па захаванню і перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі. Неабходна, каб малыя гарады «павярнуліся тварам» да свайго сельскага акружэння і складалі з ім адзінае цэлае ў гаспадарчым аграпрамысловым комплексе. У той жа час кожнае новае рабочае месца ў любым горадзе павінна быць узгоднена з навакольнай тэрыторыяй і адпавядаць яе працоўнаму патэнцыялу. Развіццё горада, нават малога, не павінна прычыняць шкоды бліжэйшаму сельскаму акружэнню. Вось па гэтай прычыне на сучасным этапе развіцця краіны ўсё большая ўвага надаецца тэрытарыяльнаму планаванню, паколькі толькі яно дазволіць забяспечыць узаемазвязанае развіццё гарадскіх і сельскіх пасяленняў на пэўнай тэрыторыі, якая выступае як адзіны народнагаспадарчы комплекс.

*Міграцыйная сітуацыя на сяле* на сучасным этапе мае рад новых характэрных асаблівасцей і фарміруец-

ца ў новых умовах. Калі ў 50—60-я гг. змяншэнне сельскага насельніцтва абумоўлівалася толькі міграцыяй і напалавіну кампенсавалася за кошт натуральнага прыросту, то з сярэдзіны 70-х гг. колькасць сельскага насельніцтва пачала змяншацца не толькі пад уздзеяннем міграцыі, але і натуральнага змяншэння. У выніку міграцыйны патэнцыял сельскіх пасяленняў рэспублікі знізіўся да мінімуму. Значыць, гарады рэгіёна, якія на працягу ўсяго папярэдняга перыяду фарміравалі рабочую сілу ў асноўным за кошт унутранай міграцыі з сяла, ужо цяпер і ў перспектыве не могуць разлічваць на гэты экстэнсіўны фактар росту вытворчасці. Працазберагальная палітыка становіцца галоўным прынцыпам гаспадарання і вызначае рэгіянальную міграцыйную палітыку як у адносінах да вёскі, так і да горада.

Нягледзячы на змяншэнне сельскага насельніцтва, у сельскай міграцыі ўсюды наглядаецца тэндэнцыя павелічэння міграцыйнага абароту, у якім акрамя адтоку насельніцтва расце прыток яго па двух каналах: горад—вёска і вёска—вёска. У сучаснай сельскай міграцыі заўважаецца новы элемент — хоць і няпоўная, але больш якасная кампенсацыя выбыцця прыбыццём. Калі ў 50-я гг. пры вялікім адтоку прыток быў нязначным (на 100 выбыўшых прыбывала 20—30 чалавек), то цяпер мужчынскае насельніцтва кампенсуе сваё выбыццё напалавіну (на 100 выбыўшых прыбывае 56 чалавек), а жаночае на 45%. Пры гэтым важна адзначыць, што ў міграцыйным патоку на вёску больш прыпадае прафесійна падрыхтаваных кадраў, 1/3 складаюць спецыялісты, што садзейнічае сціранню сацыяльных адрозненняў, павялічвае праслойку сельскай інтэлігенцыі і сельскагаспадарчых рабочых.

Прыток мігрантаў з гарадоў узрастае па меры развіцця навукова-тэхнічнага і сацыяльна-культурнага прагрэсу ў сельскай мясцовасці. Цяпер зямля, матэрыяльна-тэхнічная база і кваліфікаваныя кадры — гэта тры важнейшыя багацці, якімі ўсё ў большай меры валодае сельская гаспадарка. Мігранты з гарадоў — гэта ў асноўным кваліфікаваныя кадры як для сельскай гаспадаркі, так і для сацыяльнай сферы на сяле. Сам факт прытоку дадатны і аб'ектыўна неабходны, паколькі сельская мясцовасць, у адрозненне ад гарадоў, не мае сваёй базы для падрыхтоўкі кадраў, нават для павышэння іх кваліфікацыі. Таму гарады ў адносінах да вёскі ў цяперашні час выконваюць функцыю не проста

камплектавання насельніцтва, а фарміравання самых кваліфікаваных кадраў, самых «дарагіх» па інвестыцыйных затратах, гатовых спецыялістаў ці прафесіянальна падрыхтаваных работнікаў. Іх прыбыццё выклікае нарастанне міграцыйнага абароту, бо не ўсе кадры замацоўваюцца. Таму прыток у сельскую мясцовасць можна растлумачыць двума прычынамі. Першая — гэта неабходнасць укамплектавання новых або тэхнічна пераабсталяваных старых рабочых месц ці вакантных пасад кваліфікаванымі кадрамі масавых прафесій для раслінаводства, жывёлагадоўлі, будаўніцтва, транспарту, гандлю, культурна-бытавога абслугоўвання.

Другая прычына — замена выбыўшых з гэтых рабочых месц. Калі першая прычына дадатная і неабходная, то другая непажаданая і нерацыянальная. Іменна гэты факт патрабуе дыферэнцыраваных мер міграцыйнай палітыкі з мэтай максімальнага замацавання, стабілізацыі таго кантынгенту кваліфікаваных работнікаў, якія краіна падрыхтавала і перадала вёсцы «бясплатна», застаецца дадаць — «на вечнае карыстанне». Гэтым багаццем сельская мясцовасць абавязана распарадзіцца разумна, рацыянальна, беражліва і эфектыўна.

Прыкметна ўзмацніўся паток мігрантаў па лініі вёска—вёска. У іх складзе катэгорыі розныя, але мэта ва ўсіх адна — перасяліцца туды, дзе лепш, г. зн. з адстаючых гаспадарак у перадавыя, з перыферыйных пасяленняў у прыгарадныя, з нядобраўпарадкаваных у добраўпарадкаваныя. Аднак з пункту гледжання гаспадарчай дзейнасці гэты працэс носіць і негатыўны характар, наносячы шкоду і без таго слабым гаспадаркам. Таму мясцовым уладам неабходна кіраваць ім, абмяжоўваючы нерацыянальныя перамяшчэнні шляхам пераразмеркавання капітальных укладанняў у карысць адстаючых гаспадарак, ствараючы ў іх паўнацэнныя ўмовы для жыцця.

Ацэньваючы характар і маштабы сучаснай міграцыі сельскага насельніцтва, неабходна адзначыць, што, нягледзячы на абмежаваныя магчымасці, сельскія пасяленні рэспублікі працягваюць заставацца галоўнай крыніцай фарміравання гарадскога насельніцтва і нясуць па-ранейшаму вялікія міграцыйныя страты (гл. табл. 1.10). Пры гэтым якасны склад выхадцаў з сяла змяніўся. Раней у міграцыйным адтоку пераважала ўсюды адна катэгорыя — некваліфікаваная і недастаткова абучаная сельская моладзь. Цяпер жа мігранты з сельскіх пасяленняў складаюцца з дзвюх катэгорый: а) мяс-

цовая моладзь, якая не мае, як правіла, прафесійнай падрыхтоўкі або мае толькі навыкі механізатарскай працы, і б) кваліфікаваныя кадры, якія прайшлі навучанне ў гарадах і не замацаваліся на вёсцы. Адносіны да гэтых дзвюх груп у міграцыйнай палітыцы павінны быць розныя. Стрымліваць, а тым больш забараняць міграцыю першай групы не толькі сацыяльна несправядліва, але і эканамічна неразумна. Гэтай групе неабходна атрымаць прафесію, павысіць адукацыю, авалодаць новымі, больш складанымі відамі працы. Міграцыя ў гарады дазваляе сельскім жыхарам заняць такое месца ў грамадскім раздзяленні працы, якое лепш адпавядае іх здольнасцям і асабістым схільнасцям.

Другая група ўжо выкарыстала інвестыцыі дзяржавы, атрымала прафесійную падрыхтоўку, размеркавана ў планавым парадку на рабочыя месцы і абавязана эфектыўна на іх працаваць. У адносінах да гэтай катэгорыі і павінны дзейнічаць меры замацавання, абмежавання выбыцця і цякучасці. Разлікі паказваюць, што звядзенне да мінімуму адтоку кваліфікаваных работнікаў з сельскай мясцовасці дазволіць эканоміць мільёны дзяржаўных сродкаў на дадатковую падрыхтоўку для замены выбыўшых механізатараў, урачоў, настаўнікаў і г. д. Значыць, пытанне павінна ставіцца не наогул аб стабілізацыі сельскага насельніцтва, а іменна кваліфікаваных кадраў, якія ёсць, паколькі яны складаюць аснову працоўнага патэнцыялу ўсяго гаспадарчага комплексу на вёсцы.

Неаднаразова праведзенае анкетаванне паказала, што абсалютная большасць сельскіх жыхароў дадатна адносіцца да жыцця ў сельскай мясцовасці, але для поўнага камфорту ім не хапае: добраўпарадкаванага жылля, добра наладжанага сервісу, высока арганізаванага і тэхнічна аснашчанага рабочага месца, магчымасцей для прафесіянальнага росту і выбару заняткаў, зручнасці транспартных сувязей. Па гэтаму кірунку і праводзіцца міграцыйная палітыка, якая з'яўляецца часткай сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы.

Міграцыя ставіць перад горадам і вёскай розныя задачы. Атрымліваючы з сельскай мясцовасці ў асноўным некваліфікаваную моладзь, горад абавязаны рашаць паралельна некалькі задач: навучаць яе, працаўладкоўваць, забяспечваць усім комплексам жыццёвых даброт.

Сельская мясцовасць атрымлівае больш падрыхта-

ваныя кадры, перад ёй стаяць толькі дзве задачы: рацыянальна іх выкарыстаць і стварыць такія матэрыяльныя і сацыяльна-культурныя ўмовы, якія набліжаліся б да эталона гарадскіх. Таму праблема замацавання кадраў у сельскай мясцовасці больш актуальная, чым у гарадах.

Міграцыя ўносіць свае карэктывы і ў структуру насельніцтва, як па ўзросту, так і па полу. Як правіла, у міграцыйным патоку з сельскай мясцовасці ў гарады пераважаюць жанчыны, што ўзмацняе «фемінізацыю» гараджан. У сельскай мясцовасці, наадварот, сярод маладога працаздольнага насельніцтва пераважаюць мужчыны і «дэфіцыт нявест» стаў тыповай з'явай. Узрост ад 16 да 35 гадоў дамінуе ў міграцыйным прыросце і садзейнічае як абсалютнаму, так і адноснаму павелічэнню працоўнага патэнцыялу гарадоў. У складзе мігрантаў на вёску гэты ўзрост таксама складае не менш чым 80% і адпаведна выконвае пэўную кампенсуючую ролю.

Вынікі спецыяльных абследаванняў пацвярджаюць вывад аб тым, што матэрыяльныя фактары не стрымліваюць міграцыйны адток з вёскі. Галоўнай «выштурхоўваючай» сілай з'яўляецца незадаволенасць узроўнем культурна-бытавога абслугоўвання, характарам і ўмовамі працы і быту. Так, механізатараў не задавальняе нераўнамернасць нагрузак, сезоннасць працы, фізічныя перагрузкі, мінімум свабоднага часу; жывёлаводаў — цяжкая фізічная праца; паляводаў — нізкі заработак, сезоннасць працы. Значыць, меры па замацаванню кадраў павінны распрацоўвацца дыферэнцыравана па катэгорыях работнікаў. Паколькі найбольш патрабавальнай і мабільнай з'яўляецца група 18—25 гадоў, то і меры міграцыйнай палітыкі павінны датычыцца перш за ўсё гэтай групы. Яна прадстаўлена выпускнікамі школ, механізатарамі, работнікамі апарата кіравання, сферы абслугоўвання, г. зн. найбольш кваліфікаванымі кадрамі, якія найменш звязаны з асабістай падсобнай гаспадаркай, але маюць высокі ўзровень сацыяльна-культурных патрабаванняў. Іх міграцыйная рухомасць абумоўлена неаднароднасцю пражывання і жыццядзейнасці ў розных тыпах пасяленняў. Таму задача павінна рашацца паралельна двума шляхамі: удасканаленнем на вёсцы ўмоў пражывання, набліжэннем іх да гарадскіх стандартаў і ўсебаковым выкарыстаннем спрыяльных мясцовых сацыяльных і экалагічных умоў (больш спакойны склад жыцця, блізкасць да прыроды; магчымасць зай-

мацца працай у асабістай падсобнай гаспадарцы, мець добраўпарадкаванае жыллё, добрую аплату працы пры яе механізацыі і правільнай арганізацыі). Гэтаму можа садзейнічаць і такая форма арганізацыі працы, як сямейны або калектыўны падрад, а таксама індывідуальная працоўная дзейнасць, як форма працоўнай занятасці ў час міжсезоння, прыватная форма гаспадаркі, фермерская.

Буйныя сельскія пасяленні, якія налічваюць больш за 1000 жыхароў, па якасці жыццёвых умоў найбольш задавальняюць сучаснага сельскага жыхара. Большасць з іх мае прырост насельніцтва, паколькі гэта найбольш добраўпарадкаваныя і комплексна развітыя пасёлкі, апорныя цэнтры ўнутры- і міжгаспадарчых сістэм расселення, з добрымі транспартнымі сувязямі.

Аднак і сярод буйных вёсак амаль 1/3 мае тэндэнцыю змяншэння колькасці насельніцтва, што звязана з міграцыйным адтокам і пагаршэннем параметраў узнаўлення насельніцтва. З мэтай высвятлення прычын указаных з'яў былі праведзены спецыяльныя выбарачныя абследаванні ў самых узорных пасяленнях, якія ўзначальваюць найбольш перадавыя гаспадаркі і па ўзроўню добраўпарадкавання могуць служыць эталонам сучаснай вёскі. Але ўсе яны мелі розную гаспадарчую структуру, розную ступень насычанасці тымі або іншымі відамі вытворчай дзейнасці, рознае геаграфічнае становішча ў адносінах да гарадоў і па-рознаму ўдзельнічалі ў працоўных сувязях з імі.

Агульны вывад зводзіцца да таго, што сацыяльна-дэмаграфічная сітуацыя нават у буйных сельскіх пасяленнях вызначаецца не толькі ўзроўнем матэрыяльнага дабрабыту і культурна-бытавога абслугоўвання. Галоўнай прычынай міграцыйнага адтоку ў большасці выпадкаў з'яўляецца абмежаваная сфера прыкладання працы, адсутнасць выбару заняткаў. Напрыклад, у многіх абследаваных пасяленнях жыхарам прадастаўляецца магчымасць працаваць толькі ў сельскай гаспадарцы і сферы паслуг з нязначнай занятасцю ў будаўніцтве і на транспарце. У кожным з гэтых відаў дзейнасці павелічэнне колькасці рабочых месц нязначнае, не ўсе віды працы прэстыжныя па характару, таму магчымасці працаўладкавання абмежаваныя, што больш за ўсё не задавальняе моладзь.

Там, дзе эканамічная структура гаспадаркі мае больш складаны характар, як правіла, несельскагаспа-

дарчага або змешанага профілю сістэмы АПК, разгалінаваную сістэму сувязей, развіты транспарт, шырокі набор элементаў сацыяльнай інфраструктуры, магчымасць працаўладкавання ў бліжэйшым горадзе, зусім іншыя магчымасці прадастаўляюцца і для заняткаў насельніцтва, у тым ліку жаночага. Такія пасяленні больш прэстыжныя, яны прыцягваюць насельніцтва, а таму маюць і больш спрыяльную дэмаграфічную сітуацыю: люднасць іх павялічваецца, натуральны прырост дадатны, структура па полу і ўзросту больш спрыяльная, міграцыйныя страты невялікія.

Значыць, каб буйны міжгаспадарчы апорны цэнтр рассялення змог выконваць ускладзеную на яго функцыю, ён павінен мець больш складаную народнагаспадарчую структуру, вышэйшыя звёны аграпрамысловага комплексу, прамысловыя аб'екты, навучальныя ўстановы сістэмы прафесійнай адукацыі.

Задача заключаецца не ў тым, каб пакінуць у вёсцы ўсю моладзь. Важна, каб заставалася тая яе частка, якая атрымала для гэтага спецыяльную падрыхтоўку і ўтварае аснову рабочай сілы галіны. Таму пытанне прафесійнай падрыхтоўкі сельскай моладзі неабходна рашаць паралельна з праблемамі аграпрамысловага комплексу. У прыватнасці, узрастае патрэба ў кадрах асаблівай падрыхтоўкі, якая злучае веды ў галіне сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці; актуальнымі застаюцца пытанні прафесійнай падрыхтоўкі сельскіх жанчын для аўтаматызаваных відаў працы ў жывёлагадоўлі, для сферы паслуг і прадпрыемстваў па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны. Больш рацыянальнаму выкарыстанню рэсурсаў мясцовай моладзі можа садзейнічаць мэтавае накіраванне на вучобу з улікам патрабаванняў гаспадаркі або сумежных звенняў АПК. У прыватнасці, ніхто з сучаснай моладзі не гатовы самастойна весці фермерскую гаспадарку, вучоба патрэбна і ў гэтым выпадку.

## 2.4. КАНЦЭПЦЫЯ МІГРАЦЫЙНАЙ ПАЛІТЫКІ

Міграцыя насельніцтва з'яўляецца свайго роду барометрам спрыяльнай ці неспрыяльнай сітуацыі на ўсёй тэрыторыі краіны і ў кожным населеным пункце. Яна выступае адначасова як вынік агульнага эканамічнага і сацыяльна-дэмаграфічнага становішча і як яго прычына. У любым выпадку з міграцыяй насельніцтва звя-

заны многія працэсы: дэмаграфічнае развіццё населеных месц, фарміраванне працоўных рэсурсаў, іх тэрытарыяльнае размеркаванне, фарміраванне сацыяльнай, нацыянальнай, полаўзроставай структуры насельніцтва, характар міжсялібных сувязей. Таму ўдасканаленне тэрытарыяльнай арганізацыі вытворчасці і насельніцтва і ў цэлым сацыяльна-эканамічнага развіцця той або іншай тэрыторыі не можа быць паспяховым без добра наладжанай і арганізаванай міграцыйнай палітыкі.

Міграцыйная палітыка — гэта сістэма дзяржаўных мер, накіраваных на рэгуляванне міграцыі з мэтай аптымізацыі перамяшчэнняў насельніцтва, рацыяналізацыі маштабаў, структуры і напрамку міграцыйных патокаў.

На сучасным этапе ўсе краіны свету праводзяць актыўную міграцыйную палітыку. Адны з іх зацікаўлены ў тым, каб частка працоўных рэсурсаў эмігрыравала, іншыя, наадварот, прыцягваюць неабходную для канкрэтных відаў працы рабочую сілу і разглядаюць арганізаваную іміграцыю як крыніцу ўзбагачэння дзяржавы. У свеце пастаянна існуюць эпіцэнтры прыцягнення «мускулаў» і «розумаў» і раёны, якія іх пастаўляюць. Гэта значыць, што міграцыйная палітыка дзяржавы з'яўляецца адной з форм дзяржаўных адносін.

Актыўна праводзіцца міграцыйная палітыка і ўнутры дзяржаў з мэтай арганізаванага пераразмеркавання працоўных рэсурсаў да зон самага актыўнага гаспадарчага развіцця, ці, наадварот, з мэтай адтоку рабочай сілы з зон, дзе ўтварыўся адносны лішак рабочых рук і пагражае беспрацоўе.

Кіраваць міграцыяй вельмі цяжка, паколькі ў гэтым працэсе пераплятаюцца інтарэсы дзяржавы і канкрэтнай асобы і ў многіх выпадках яны не супадаюць. Але кіраваць неабходна. У адваротным выпадку нерэальна само выкананне планаў сацыяльна-эканамічнага развіцця той або іншай тэрыторыі. Сістэма мер міграцыйнай палітыкі павінна быць такой, каб магла адпавядаць інтарэсам асобы, з аднаго боку, і інтарэсам грамадства ў цэлым, з другога; інтарэсам асобнага рэгіёна і дзяржавы ў цэлым. Гэта значыць, яна павінна быць агульнадзяржаўнай і ў той жа час строга дыферэнцыраванай у залежнасці ад канкрэтных мясцовых умоў.

Як ужо адзначалася, Рэспубліка Беларусь — раён актыўных міграцый насельніцтва, але рэгулюючае ўздзеянне на гэты працэс патрабуе яшчэ пастаяннага ўдасканалення. З улікам рэгіянальных асаблівасцей дэмагра-

фічнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця, для актывізацыі міграцыйнай палітыкі ў рэспубліцы неабходна, на наш погляд, ажыццявіць цэлы комплекс ўзаемазвязаных мерапрыемстваў.

*Актывізацыя навуковых даследаванняў* з мэтай глыбокага вывучэння міграцыйнай і агульнай дэмаграфічнай сітуацыі як у рэспубліцы ў цэлым, так і ў кожным тэрытарыяльным комплексе, кожным адміністрацыйным раёне, аж да канкрэтных тыпаў населеных пунктаў.

Каб кіраваць такім складаным працэсам, як міграцыя насельніцтва, неабходна дасканала ведаць прычыны і матывы перамяшчэнняў тых ці іншых груп насельніцтва, фактары, якія прыцягваюць мігрантаў ці, наадварот, прымушаюць іх да перасялення ў іншыя месцы жыхарства. Такога ж пастаяннага вывучэння патрабуюць і вынікі міграцыі як для раёнаў адтоку, так і прытоку мігрантаў.

У Беларусі працэс гэты вывучаецца недастаткова. Ускосна ён закранаецца пры вывучэнні працоўных рэсурсаў, планаванні размяшчэння вытворчасці, складанні схем раённай планіроўкі. Аднак адзінага цэнтра, які б вывучаў працэс міграцыі, распрацоўваў рэкамендацыі і абгрунтаваныя прапановы для ўрада, рэспубліка не мае. Наспела вострая неабходнасць у стварэнні Цэнтра па вывучэнню праблем народанасельніцтва Беларусі, пры якім былі б навуковыя падраздзяленні па ўсіх праблемах развіцця, рассялення і міграцыі насельніцтва рэгіёну.

*Рэгуляванне міграцыі на ўсіх узроўнях:* мясцовым, раённым, абласным, рэспубліканскім і ў межах тэрытарыяльных комплексаў.

Першы напрамак рэгулявання міграцыі — скарачэнне адтоку з сельскіх пасяленняў, спачатку ў тых раёнах, дзе дэмаграфічная сітуацыя самая неспрыяльная, а затым паступова ва ўсіх сельскіх пасяленнях. Для рашэння гэтай задачы неабходна выкарыстаць розныя меры эканамічнага характару. Напрыклад, можна нарошчваць вытворчыя магутнасці за кошт розных элементаў сістэмы АПК з мэтай стварэння магчымасцей для выбару заняткаў насельніцтва і яго замацавання. Ва ўмовах Беларусі гэта могуць быць невялікія аб'екты па нарыхтоўцы і захаванню сельскагаспадарчай прадукцыі, пярвічнай перапрацоўцы зерня, бульбы, агародніны, садавіны, комплексы з пярвічнай перапрацоўкай малака, мяса і яго рэалізацыяй па прамой сувязі са

спажыўцом. Да сельскіх пасяленняў можна наблізіць многія службы па забеспячэнню сельскай гаспадаркі і сельскага насельніцтва, вучэбныя ўстановы ніжэйшага рангу (павышэнне кваліфікацыі кадраў, тэхнічнага, эканамічнага ўсенавуча). У вёсках, нават невялікіх, але зручна размешчаных на транспартных магістралях, могуць размяшчацца невялікія філіялы, цэхі прамысловых прадпрыемстваў.

Частку ўстаноў, якія забяспечваюць пачатковае абслугоўванне і арганізацыю гаспадарчай дзейнасці, таксама можна разгрупаваць па больш дробных населеных пунктах і гэтым падняць іх прэстыж.

Каб пашырыць магчымасці працаўладкавання сельскіх дзяўчат і жанчын, неабходна пераарыентацыя вытворчасці на жаночыя віды працы.

Чым большы выбар заняткаў для сельскіх жыхароў, тым больш прэстыжны той або іншы населены пункт для пражывання.

Удасканаленне арганізацыі працы таксама адна з мер, якія змяншаюць незадаволенасць умовамі жыцця ў сельскай мясцовасці. Новымі формамі арганізацыі працы пастутова становяцца калектыўныя, сямейныя, арэндныя падрады, кааператывы, індывідуальныя віды працоўнай дзейнасці, падсобныя промыслы. Імі неабходна ахапіць не толькі сельскую гаспадарку, але і сістэму сервісу, адпачынку, апрацоўку прысядзібных гаспадарак, будаўнічыя і рамонтныя работы на вёсцы, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, дарожнае будаўніцтва, сістэму нарыхтовак і збыту прадукцыі, забеспячэння насельніцтва таварамі і паслугамі. Гэтыя формы працы не толькі садзейнічаюць замацаванню сельскіх жыхароў, але і прыцягваюць частку гараджан.

Важнейшым рэгулятарам у развіцці і рассяленні насельніцтва любой дзяржавы з'яўляецца рэалізацыя прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці, збліжэнне ўмоў жыцця розных слаёў насельніцтва.

Неабходна дасягнуць забеспячэння спрыяльных умоў пражывання для ўсіх груп насельніцтва шляхам будаўніцтва добраўпарадкаванага жылля, пераважна сядзібнага тыпу; набліжэння да месца жыхарства тых аб'ектаў сферы паслуг, якімі людзі карыстаюцца паўсядзённа; забеспячэння добрай транспартнай даступнасці ўсіх населеных пунктаў; дапамогі ў вядзенні асабістай падсобнай ці прыватнай гаспадаркі.

Удасканальванне жыллёвых умоў неабходна ажыц-

цяўляць дыферэнцыравана: ільготныя ўмовы атрымання новага жылля або рамонту старога ў першую чаргу ствараць тым, у каго менш сродкаў і сіл для індывідуальнага будаўніцтва (маладыя сем'і, мнагадзетныя сем'і, асобы старога ўзросту, маладыя спецыялісты). Такая ж дыферэнцыраваная павінна быць плата за жыллё.

У адпаведнасці з працоўным укладам насельніцтва неабходна размяркоўваць і фонды грамадскага спажывання, розныя ільготы, суадносіны дзяржаўнага і індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва і г. д. Асаблівыя клопаты трэба праяўляць аб людзях старога ўзросту, ветэранах працы, удовых адзінокіх жанчынах, колькасць якіх вельмі вялікая ў сельскай мясцовасці.

*Адміністрацыйна-гаспадарчыя меры* неабходна накіроўваць перш за ўсё на ўзмацненне ролі мясцовых улад. Каб мясцовыя ўлады маглі на справе ажыццяўляць кіраванне даверанай ім тэрыторыяй, гаспадаркай і насельніцтвам, яны павінны мець фінансавыя сродкі. Крыніцамі фінансавання могуць быць: уласныя сродкі (узносы насельніцтва на развіццё населеных пунктаў, падаткі з зямельных участкаў, узносы на добраўпарадкаванне дарог і камунальных збудаванняў, здача зямельных участкаў у арэнду, даходы ад жылля і інш.) — 10—15% бюджэту; паступленні ад прадпрыемстваў, кааператываў за карыстанне рэсурсамі тэрыторыі — 1/3 бюджэту; пераразмеркаванне ад цэнтральных органаў — 10—15%; дзяржаўныя субсідыі — каля 1/3 бюджэту.

Пераразмеркаванне сродкаў і ўсіх рэсурсаў неабходна праводзіць у карысць раёнаў, гаспадарак або населеных пунктаў з горшымі ўмовамі пражывання.

Надзвычайна важна наладзіць пад кантролем органаў улады арганізацыю адзінай тэрытарыяльнай сістэмы працаўладкавання насельніцтва з улікам патрабаванняў і магчымасцей як гарадскіх, так і сельскіх пасяленняў, узгодненае развіццё рабочых месц на новых відах вытворчасці з працоўным патэнцыялам тэрыторыі.

Вялікую ролю могуць адыграць і выхаваўчыя меры, накіраваныя на прапаганду дадатных бакоў сельскага спосабу жыцця, сельскагаспадарчай працы, на прыцягненне ў сельскія пасяленні гараджан, змяненне погляду насельніцтва на каштоўнасць гарадскога і сельскага спосабу жыцця, стымуляванне перасяленняў у сельскія населеныя пункты з гарадоў.

Другі напрамак рэгулявання міграцыі — *абмежаванне міграцыйнага прытоку ў гарады.*

Галоўным прынцыпам гаспадарання ва ўмовах Беларускага рэгіёну павінен быць працазберагаючы, г. зн. накіраваны на эканомію рабочай сілы, стрымліванне экстэнсіўнай урбанізацыі, перавод усіх гарадоў на шлях інтэнсіўнага развіцця за кошт уласных рэзерваў.

Да таго часу, пакуль гарады ў сваім развіцці будуць арыентавацца пераважна на прыток рабочых рук з сяла, затрымаць адток з сельскай мясцовасці практычна немагчыма.

У выпадку дэфіцыту рабочай сілы ў гарадах (пры будаўніцтве новых аб'ектаў) ці ў сельскіх пасяленнях магчыма стымуляванне маятнікавай міграцыі, у тым ліку сезоннай.

Шляхам больш раўнамернага размяшчэння сеткі вну, сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў і прафесійных вучылішчаў, набліжэння спецыялізаваных вучэбных устаноў да месц спажывання спецыялістаў ці кваліфікаваных рабочых можна дасягнуць пераразмеркавання вучэбнай міграцыі ў карысць сярэдніх і малых гарадоў.

Вельмі важнай задачай з'яўляецца аптымізацыя экалагічнага становішча ў найбольш экалагічна напружаных і неспрыяльных зонах рэспублікі. Асаблівай увагі патрабуе палітыка перасялення ў адносінах да жыхароў, якія пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі.

Гэту частку насельніцтва рэспублікі ўмоўна можна падзяліць на некалькі груп. Першую групу фарміруе тое насельніцтва, якое патрэбна адсяліць абавязкова з забруджаных у чыстыя мясцовасці. У гэтым выпадку дзейнічае прынцып арганізаванага перасялення і органы ўлады бяруць на сябе ўсю адказнасць за такі працэс. Яны вызначаюць мясцовасці, куды можна перасяліць, арганізоўваюць усё неабходнае, каб як мага лепш перасяліць, уладкаваць людзей на новым месцы жыхарства і забяспечыць іх не толькі працай і жыллём, але і ўсім неабходным для жыцця.

Другую групу складае тое насельніцтва, якое перасяляецца самастойна. У даным выпадку неабходна не толькі матэрыяльная дапамога, але і арыентацыя на выбар месца жыхарства тых, хто вырашыў перасяліцца. Для гэтага неабходна спецыяльная служба, якая валодала б інфармацыяй аб патэнцыяльных мігрантах і іх запатрабаваннях, з аднаго боку, і аб рэальных магчымасцях і месцах для перасялення, з другога.

Трэцяя група — гэта тыя грамадзяне, якія, наадварот, накіроўваюцца ў забруджаныя мясцовасці, каб

выконваць там розныя абавязкі, у тым ліку і абслугоўванне жыхароў, якія засталіся. У гэтым выпадку галоўная задача — ахова здароўя тых і другіх.

*Рэгуляванне знешняй міграцыі* (за межы рэспублікі) патрабуе ўзмацнення ролі арганізаваных форм, якія, не парушаючы прынцыпаў свабоды выбару месца жыхарства, у той жа час абаранялі б рэспубліку ад празмерных нерацыянальных перамяшчэнняў. У гэтым выпадку было б разумным вывучыць вопыт, напрыклад, ЗША, якія на працягу амаль усяго XX стагоддзя рэгулююць працэс міграцыі з дапамогай квот, строга кантралююць напрамкі і структуру міграцыйных патокаў.

Паколькі праблемы міграцыі носяць глыбока сацыяльны характар, міграцыйная палітыка павінна быць састаўной часткай агульнай сацыяльна-эканамічнай палітыкі рэспублікі.

У адрозненне ад мінулых перыядаў развіцця сучасная Рэспубліка Беларусь, як самастойная краіна, павінна поўнасцю ўзяць на сябе і тыя функцыі цэнтра, якія ён выконваў у адносінах да рэспублік па арганізацыі агульнасаюзнага перамяшчэння насельніцтва. У новых умовах, вядома, зменяцца маштабы і формы міграцыі ва ўсходнія раёны Расіі, па-іншаму пойдзе працэс міграцыі і з суседнімі краінамі Прыбалтыкі. Пытанні гэтыя заслугоўваюць увагі і з боку вядучых навуковых устаноў, якім неабходна пачаць выпрацоўку абгрунтаваных прынцыпаў новай міграцыйнай палітыкі.

## 3. САЦЫЯЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ НАСЕЛЬНІЦТВА І ПРАЦОЎНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГАРАДСКІХ І СЕЛЬСКІХ ПАСЯЛЕННЯЎ

У сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі адбыліся выразныя змены, якія з'яўляюцца вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця. Перш за ўсё важна адзначыць *рост колькасці і долі гарадскога насельніцтва* (рыс. 3.1). Да вайны Беларусь адносілася да ліку самых сельскіх рэгіёнаў; доля гараджан складала толькі 1/5 частку ад агульнай колькасці яе жыхароў. Усяго чатыры гарады можна было аднесці да ліку буйных (Мінск, Гомель, Віцебск, Магілёў). Такой жа сельскай уступіла Беларусь у 60-я гг., утвараючы па ўзроўню ўрбанізацыі адну групу з рэспублікамі Сярэдняй Азіі.

На працягу ўсіх пасляваенных гадоў рэспубліка прыкладала вялікія намаганні, каб выйсці на ўзровень перадавых краін. Гэтыя намаганні перш за ўсё былі накіраваны на развіццё сучаснага індустрыяльнага комплексу, у якім прамысловасць, будаўніцтва і транспарт выступаюць як адзінае цэлае. Працэс індустрыялізацыі ішоў углыб і ушыр за кошт ускладнення вытворчай структуры і больш раўнамернага размеркавання па тэрыторыі. Яго вынікам з'явіліся такія дадатныя змены, як нарошчванне эканамічнай базы сярэдніх і малых гарадоў, паскарэнне працэсу ўрбанізацыі, дасягненне высокай ступені занятасці працоўных рэсурсаў, зближэнне эканамічнага ўзроўню розных тэрыторый, прагрэсіўныя сацыяльныя змены.

Разам з тым паскораны працэс урбанізацыі не прайшоў бясследна. Выклікаўшы «вялікае перасяленне народа» з вёскі ў горад без адпаведнай кампенсацыі страт,




Рыс. 3.1. Узровень урбанізацыі тэрыторыі Беларусі:
доля гарадскога насельніцтва, %: *1*—нязначная (менш 30); *2*—ніжэй сярэдняй (30—50); *3*—сярэдняя (51—60); *4*—вышэй сярэдняй (больш 60); *5*—колькасць гарадскіх пасяленняў

ён рэзка парушыў не толькі працарэсурсны, але і ўзнаўленчы патэнцыял усёй сельскай мясцовасці.

Зрух ва ўрбанізацыі адбыўся не толькі за кошт росту гарадоў, але і больш раўнамернага іх развіцця па тэрыторыі. Пачынаючы з 1975 г. колькасць гараджан стала пераважаць ва ўсіх абласцях. Па многіх прыкметах сучасную Беларусь можна аднесці да высокаўрбанізаваных краін: па долі гараджан, колькасці гарадоў, у тым ліку буйных, долі насельніцтва, якое ў іх пражывае (гл. рыс. 3.1).

У сацыяльным плане актыўны працэс урбанізацыі праявіўся ў распаўсюджванні гарадскога складу жыцця, растучай мабільнасці насельніцтва, ускладненні функцыянальнай структуры не толькі гарадскіх, але і сельскіх пасяленняў, з перавагай несельскагаспадарчых відаў дзейнасці людзей. Наступны важнейшы зрух у сацыяльнай структуры — хуткі *рост колькасці і долі рабочага класа.* На сучасным этапе рабочыя складаюць 60% усяго насельніцтва, 3 млн. працоўных. Рост колькасці гэтай сацыяльнай групы вызначаецца развіццём прамысловасці, будаўніцтва, транспарту і іншых несельскагаспадарчых відаў працы. Асаблівасць XX стагоддзя заключаецца ў тым, што індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі выклікала сацыяльныя зрухі ў структуры сялянскага насельніцтва, сярод якога з'явіліся прафесіі індустрыяльнай працы (механізатары, будаўнікі, слесары, наладчыкі, аператары і г. д.). У адрозненне ад мінулай сучасная вёска стала рабоча-сялянскай, больш кваліфікаванай і адукаванай, з растучай праслойкай сельскай інтэлігенцыі. Сярод сельскіх жыхароў усё больш тых, хто займаецца несельскагаспадарчай дзейнасцю. Гэта работнікі сферы паслуг, прамысловых прадпрыемстваў, будаўніцтва, транспарту, а таксама тыя сяляне, якія ажыццяўляюць штодзённыя маятнікавыя перамяшчэнні на работу і вучобу ў бліжэйшыя гарады.

Сярод усіх сацыяльных груп найбольш высокімі тэмпамі расла колькасць служачых, яны занялі другое месца пасля рабочых, пацясніўшы калгаснікаў. Гэта абумоўлена паскораным развіццём навукі і адукацыі, розных відаў культурна-бытавога абслугоўвання як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці.

Адзіная сацыяльная група, колькасць якой змяншаецца,— гэта калгаснікі. У параўнанні з 1960 г. іх стала ўдвая менш, таму што ўсе астатнія сацыяльныя групы за гэты час папаўняліся галоўным чынам за кошт кал-

гаснікаў. З іх ліку фарміравалася і асноўная колькасць мігрантаў, а ў цяперашні час на іх долю выпадаюць амаль усе натуральныя страты.

Дадатныя і адмоўныя зрухі, якія адбыліся ў дэмаграфічным і сацыяльным развіцці насельніцтва Беларусі, выклікалі змены ў фарміраванні і размеркаванні працоўных рэсурсаў. Гэта ў сваю чаргу адлюстравалася на размеркаванні, велічыні і якасці працоўнага патэнцыялу гарадскіх і сельскіх пасяленняў.

*Працоўны патэнцыял* на той ці іншай тэрыторыі — паняцце больш аб'ёмнае, чым працоўныя рэсурсы, бо ён ацэньваецца не толькі колькаснымі, але і якаснымі характарыстыкамі. Працоўныя рэсурсы з'яўляюцца носьбітамі працоўнага пацэнцыялу, аднак яго велічыня можа быць адносна меншай ці большай у залежнасці ад колькасці і якасці наяўных працоўных рэсурсаў.

Колькасныя характарыстыкі працоўнага патэнцыялу — гэта колькасць працаздольнага насельніцтва, тэмпы яго штогадовага прыросту, доля сярод усяго насельніцтва. Гэтыя паказчыкі ў адпаведны перыяд могуць павялічвацца ці змяншацца ў залежнасці ад суадносін паміж колькасцю моладзі, якая ўступае ў працаздольны ўзрост, і колькасцю асоб, якія выбываюць на пенсію, ад страт працаздольнага насельніцтва ў выніку смяротнасці, сярэдняй працягласці жыцця, дадатнага ці адмоўнага сальда міграцыі.

Якасныя характарыстыкі — гэта полаўзроставая структура працоўных рэсурсаў, працягласць працаздольнага перыяду (чалавека-год), стан здароўя і ўзровень працаздольнасці, узровень адукацыі і кваліфікацыі, ступень занятасці і працоўнай актыўнасці, прафесіянальнай і тэрытарыяльнай мабільнасці і г. д. Іменна ад якасных характарыстык у першую чаргу залежыць тая працоўная аддача, якую могуць даць грамадству працоўныя рэсурсы на дадзенай тэрыторыі.

Такім чынам, працоўны патэнцыял праяўляецца ў колькасці і якасці працы, аддадзенай грамадству працаздольным насельніцтвам, колькасці матэрыяльных даброт і сацыяльных паслуг, ім створаных, што ў канчатковым выніку залежыць ад працоўнай актыўнасці людзей і прадукцыйнасці іх працы. Напрыклад, нават пры змяншэнні колькасці працоўных рэсурсаў працоўны патэнцыял тэрыторыі можа ўзрасці, калі ўсе працаздольныя заняты ў народнай гаспадарцы і працуюць з высокай прадукцыйнасцю.

Ад велічыні працоўнага патэнцыялу залежаць магчымасці эканамічнага развіцця таго ці іншага раёна, горада, краіны. Раёны, якія не валодаюць дастатковым працарэсурсным патэнцыялам, адчуваюць цяжкасці ў далейшым пашырэнні вытворчасці. У такім выпадку яны вымушаны шукаць рэзервы для павелічэння тэхнічнай узброенасці працы, або прыцягваць дадатковую рабочую сілу з іншых раёнаў ці краін. У некаторых выпадках можа нават змяншацца аб'ём вытворчасці. І наадварот, там, дзе працарэсурсны патэнцыял дастаткова вялікі, а магчымасці працаўладкавання абмежаваныя і не адпавядаюць колькасці ці якасці работнікаў, могуць стварыцца ўмовы для беспрацоўя і сацыяльнай напружанасці. У гэтым выпадку праблему можна вырашыць шляхам далейшага пашырэння вытворчасці за кошт дадатковых капіталаўкладанняў, або пераразмеркавання працоўных рэсурсаў у іншыя галіны гаспадаркі ці іншыя раёны.

Каб не ствараліся такія дыспрапорцыі ў працэсе гаспадарчай дзейнасці, неабходна ўлічваць патэнцыяльныя магчымасці працоўных рэсурсаў. Працоўны патэнцыял той ці іншай тэрыторыі хоць і прыблізна, але можна ацаніць з дапамогай сістэмы адпаведных паказчыкаў. Намі прапанавана наступная методыка гэтай ацэнкі з выкарыстаннем метаду параўнальна-геаграфічнага аналізу.

У якасці парогавай велічыні для параўнання выкарыстоўваюцца сярэднія паказчыкі, характэрныя для ўсёй рэспублікі. У адносінах да іх разлічваюцца індэксы фактычнай велічыні адпаведнага паказчыка ў канкрэтным раёне. Па суме індэксаў вызначаецца інтэгральны паказчык, які характарызуе велічыню працоўнага патэнцыялу на дадзенай тэрыторыі. Ён разлічваецца па формуле

$$\text{ПП} = \sum_{i=1}^{n} \frac{F_i}{N_i},$$

дзе ПП — працоўны патэнцыял раёна (у балах); $F_i$ — фактычнае значэнне $i$-га паказчыка ў дадзеным раёне; $N_i$ — велічыня $i$-га паказчыка ў сярэднім па рэспубліцы; $n$ — колькасць паказчыкаў.

Для ацэнкі велічыні працоўнага патэнцыялу можна выкарыстаць некалькі груп паказчыкаў:

1) працаздольнасці насельніцтва:

колькасць працаздольных (у тым ліку да 30 і

звыш 30 гадоў) у разліку на 1000 жыхароў;

2) забяспечанасці тэрыторыі працоўнымі рэсурсамі:
колькасць працаздольных у разліку на адзінку плошчы (на 1 кв. км, 100 га сельгасугоддзяў, 100 га ворнай зямлі);

3) адукацыйнага ўзроўню працоўных рэсурсаў:
колькасць асоб з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй у разліку на 1000 занятых, на 1000 працаздольных;

4) працоўнай актыўнасці:
колькасць занятых у народнай гаспадарцы ў разліку на 1000 жыхароў, на 1000 працаздольных;

5) працоўнай аддачы:
вытворчасць прадукцыі ў разліку на 1 занятага ў народнай гаспадарцы.

Чым большы сумарны паказчык, тым адносна большым працоўным патэнцыялам валодае дадзены раён. Гэта значыць, што яго працоўныя рэсурсы здольны выпрацоўваць адносна больш матэрыяльных даброт і паслуг і тым самым садзейнічаць павелічэнню эканамічнага патэнцыялу на тэрыторыі раёна.

Калі сумарны паказчык мінімальны, гэта сведчыць аб тым, што дадзены раён валодае нязначным працоўным патэнцыялам і мае адносна горшыя магчымасці для далейшага эканамічнага развіцця. На такой тэрыторыі неабходна правесці комплекс мер для паляпшэння сітуацыі. Сярод іх могуць быць меры, накіраваныя на павелічэнне колькасці працаздольнага насельніцтва ці дадатных змен у якасці (структуры па полу, узросту, адукацыі, кваліфікацыі, здароўя, занятасці, прадукцыйнасці працы і інш.).

Нягледзячы на некаторую ўмоўнасць вынікаў ацэнкі, рэкамендуемая методыка дазваляе правесці тыпалогію раёнаў па велічыні працоўнага патэнцыялу і выказаць адпаведныя прапановы, накіраваныя на паляпшэнне тых ці іншых характарыстык працоўных рэсурсаў з улікам канкрэтных умоў кожнага раёна. Такая праца ўжо праводзіцца аўтарам і накіравана на тое, каб дапамагчы мясцовым уладам сувымяраць свае рэсурсныя магчымасці з агульнадзяржаўнымі патрэбнасцямі.

Ацэньваючы працоўны патэнцыял сучаснай Беларусі, неабходна ўлічваць наступныя, уласцівыя ёй абставіны. Па-першае, рэспубліка фарміравала і фарміруе свой працоўны патэнцыял галоўным чынам на базе ўласных працоўных рэсурсаў і нават частку іх заўсёды аддавала другім раёнам. Па-другое, амаль 30 пасляваенных га-

доў пайшлі на тое, каб аднавіць страты ў колькасці працоўных рэсурсаў. Вялікіх намаганняў каштавала адраджэнне і прымнажэнне знішчанага інтэлектуальнага патэнцыялу. Таму асаблівай заслугай рэспублікі неабходна лічыць тыя дадатныя зрухі, якія адбыліся за пасляваенныя гады ў якасці яе працоўных рэсурсаў. Перш за ўсё трэба адзначыць рост колькасці і долі працаздольнага насельніцтва і яго працоўнай актыўнасці. За мінулыя 30 гадоў (1959—1989) колькасць асоб у працаздольным узросце павялічылася на 27%, а колькасць занятых у народнай гаспадарцы — на 60%. Паводле даных перапісу 1989 г., палавіна ўсяго насельніцтва Беларусі была занята ў народнай гаспадарцы.

Параўноўваючы сучасны адукацыйны ўзровень занятага насельніцтва з мінулым, неабходна адзначыць яго прыкметны рост (у 8 разоў у параўнанні з 1940 г.). Паводле перапісу 1989 г., на 1000 занятых прыходзілася 155 чалавек з вышэйшай адукацыяй, 220 — з сярэдняй спецыяльнай, 392 — з сярэдняй агульнай. За пасляваенныя гады рэспубліка падрыхтавала шматтысячную армію спецыялістаў. Калі ў 1940 г. іх налічвалася толькі 88 тыс., то ў 1989 г.— 1,4 млн., г. зн. амаль кожны трэці заняты ў народнай гаспадарцы. Створана густая сетка прафесійна-тэхнічных вучылішч, якія штогод выпускаюць каля 90 тыс. кваліфікаваных рабочых. Адукацыйны ўзровень работнікаў дае найбольшую прыбаўку ў агульны працоўны патэнцыял. Невыпадкова яму ўдзяляецца такая ўвага ў самых перадавых краінах свету.

Разам з тым неабходна адзначыць, што насельніцтва Беларусі па ўзроўню адукацыі ўступае Латвіі, Эстоніі, Расіі, Украіне. Як паказаў перапіс 1989 г., з агульнай колькасці жыхароў ва ўзросце 15 гадоў і старэй толькі 77% атрымалі вышэйшую і сярэднюю адукацыю, астатнія засталіся з пачатковай ці няпоўнай сярэдняй. Самы нізкі ўзровень адукацыі маюць пажылыя ўзроставыя групы. Асабліва дрэнна выглядае рэспубліка па ўзроўню адукацыі сельскага насельніцтва. Тут яна самая апошняя ў ранжыраваным радзе сярод краін Садружнасці. Амаль палавіна жыхароў сельскай мясцовасці не мае нават няпоўнай сярэдняй адукацыі. Усе лепшыя свае рэсурсы, маладыя і адукаваныя, яна шчодра аддавала ці сваім гарадам, ці іншым рэгіёнам і засталася не толькі з пастарэўшым, але і з малаадукаваным насельніцтвам. Сучасная беларуская вёска прадстаўлена двума асноўнымі катэгорыямі жыхароў: кваліфікаванымі работнікамі сель-

скай гаспадаркі і культурна-бытавога абслугоўвання і малаадукаванымі асобамі прадпенсіённага і пенсіённага ўзросту, галоўным чынам жанчынамі. Паміж імі няма той маладой групы юнакоў і дзяўчат, як, напрыклад, сярод сельскага насельніцтва Узбекістана ці Таджыкістана. Сярод усіх груп насельніцтва Беларусі менавіта сельскія жанчыны маюць самы нізкі ўзровень адукацыі, бо сярод іх самая невялікая доля моладзі. У гісторыі беларускага сялянства склалася небывалая сітуацыя, калі самым галоўным «дэфіцытам» сталі маладыя дзяўчаты. Магчыма, новыя формы гаспадарання вернуць да жыцця роль сялянскай жанчыны-гаспадыні і сельскім дзяўчатам знойдзецца праца на вёсцы.

Найбольш высокі ўзровень адукацыі мае ўзроставая група ад 25 да 45 гадоў. Кожны пяты тут мае вышэйшую адукацыю, а ўсе астатнія — сярэднюю. Гэта дадатны факт, бо іменна гэта група складае самую працаздольную частку працоўных рэсурсаў і валодае найбольшай працоўнай аддачай.

У будучым сістэма адукацыі насельніцтва рэспублікі павінна яшчэ больш удасканальвацца, выкарыстоўваючы вопыт перадавых замежных краін.

Маючы высокую долю працаздольнага насельніцтва, Беларусь вызначаецца і высокай шчыльнасцю працоўнай сілы. У разліку на кожны кв. км прыпадае 25 работнікаў, занятых у народнай гаспадарцы. Гэты паказчык у Расіі менш 5, у Казахстане — менш 3. Значыць, Беларусь мае лепшыя магчымасці для далейшага нарошчвання эканамічнага патэнцыялу. Галоўная ўмова — далейшае тэхнічнае і энергетычнае ўзбраенне працы гэтых работнікаў, стварэнне новых форм яе арганізацыі. Улічваючы, што па прадукцыйнасці працы Беларусь намнога адстае ад развітых краін свету, у гэтым напрамку неабходна шукаць рэзервы.

Па тэрыторыі рэспублікі працоўная сіла размеркавана вельмі нераўнамерна і гэта нераўнамернасць узрастае (рыс. 3.2). Максімальную шчыльнасць працоўнай сілы маюць самыя ўрбанізаваныя арэалы на чале з буйнымі гарадамі (больш 50 чалавек на 1 кв. км). Перыферыйныя сельскія раёны, наадварот, адрозніваюцца вельмі нізкай шчыльнасцю працоўнай сілы (менш 10 чалавек). Больш за ўсё такіх раёнаў на Віцебшчыне. Такая ж дыферэнцыяцыя выяўлена ў разрэзе населеных пунктаў — ад цэнтральных, апорных цэнтраў рассялення да перыферыйных, дробных і драбнейшых. Цэнтральныя пасяленні,




Рыс. 3.2. Працоўны патэнцыял Беларусі:

*а*—забяспечанасць тэрыторыі працаздольным насельніцтвам, чал./кв. км: *1*—35—45, *2*—25—35, *3*—15—25; *б*—колькасць асоб працаздольнага ўзросту, тыс. чал.: *1*—1970 г., *2*—1989 г., 1 см=100 тыс. чал.; *в*—працоўная структура насельніцтва абласцей, %: *1*—працаздольны ўзрост, *2*—старэй працаздольнага ўзросту, *3*—маладзей працаздольнага ўзросту; *г*—працоўная структура насельніцтва горада і сяла

як гарадскія, так і сельскія, канцэнтруюць не толькі большы па колькасці, але і лепшы па якасці працоўны патэнцыял. У іх знаходзіцца асноўная маса працаздольнага насельніцтва, галоўныя рэсурсы кваліфікаваных кадраў. У малых гарадах доля тых і другіх намнога меншая, а ў малых вёсках частыя выпадкі, калі наогул няма ні працаздольнага насельніцтва, ні кваліфікаваных кадраў. Гэта гаворыць аб тым, што нераўнамернасць і нават нераўнацэннасць у размеркаванні працарэсурснага патэнцыялу выражана не столькі па тэрыторыі, колькі паміж населенымі пунктамі. Па гэтаму крытэрыю іх можна падзяліць на наступныя тыпы: добра забяспечаныя працоўнымі рэсурсамі з рэзервамі працоўнай сілы; забяспечаныя, але без рэзерваў; забяспечаныя недастаткова; не забяспечаныя працоўнай сілай. У адпаведнасці з

гэтай тыпалогіяй неабходна праводзіць палітыку працаразмеркавання.

Нераўнамернасць праяўляецца і ў размеркаванні таго нязначнага прыросту працаздольнага насельніцтва, які ў апошнія гады мае рэспубліка. Як відаць з табл. 3.1—3.2, за 20 гадоў рэспубліка атрымала дадаткова 0,9 млн. працаздольнага насельніцтва. З іх амаль палавіна выпала на сталіцу, 1/3 — на дзве паўднёвыя вобласці, а на долю паўночнай Віцебскай вобласці — толькі 5%. Гэта тэрыторыя мела самыя нізкія тэмпы прыросту працоўных рэсурсаў, Мінск накапліваў іх у 10 разоў хутчэй.

У канцы 80-х гг. намеціліся некаторыя новыя тэндэнцыі ў фарміраванні, размеркаванні і выкарыстанні працоўных рэсурсаў. Яны выкліканы ўздзеяннем многіх фактараў: дэмаграфічных, эканамічных, палітычных і нават экалагічных.

*Табліца 3.1*

**Дынаміка працаздольнага насельніцтва ў гарадской і сельскай мясцовасці**

| Групы насельніцтва | Гарадская мясцовасць | | | | Сельская мясцовасць | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1959 г. | 1989 г. | прырост (+) | | 1959 г. | 1989 г. | змяншэнне(—) | |
| | тыс. чал. | | тыс. чал. | % | тыс. чал. | | тыс. чал. | % |
| Асобы працаздольнага ўзросту | 1533 | 4013 | +2480 | 2,6 раза | 2914 | 1672 | —1242 | —43 |
| мужчыны | 680 | 2000 | +1320 | 2,9 раза | 1315 | 941 | —374 | —28 |
| жанчыны | 853 | 2013 | +1160 | 2,4 раза | 1600 | 731 | —869 | —54 |

*Табліца 3.2*

**Размеркаванне і дынаміка працаздольнага насельніцтва**, тыс. чал.

| Вобласць | 1970 г. | 1989 г. | Прырост за перыяд | |
|---|---|---|---|---|
| | | | тыс. чал. | % |
| Брэсцкая | 672 | 791 | 119 | 17,6 |
| Віцебская | 731 | 777 | 46 | 6,3 |
| Гомельская | 782 | 914 | 132 | 16,8 |
| Гродзенская | 570 | 643 | 73 | 12,7 |
| г. Мінск | 606 | 1012 | 406 | 60,6 |
| Мінская | 774 | 851 | 77 | 9,9 |
| Магілёўская | 630 | 697 | 67 | 10,6 |
| Усяго | 4765 | 5685 | 919 | 19,2 |

У ліку дэмаграфічных фактараў неабходна адзначыць пагоршанне ўзнаўленчай асновы фарміравання новых пакаленняў рабочай сілы. У першую чаргу гэта датычыць сельскай мясцовасці, якая перайшла ў стан дэпапуляцыі і не здольна кампенсаваць страты працаздольнага насельніцтва за кошт падрастаючай моладзі.

Сярод новых сацыяльна-эканамічных фактараў пачынае праяўляцца ўздзеянне рыначных адносін, пры якіх працоўная сіла паступова стане таварам і будзе адчуваць жорсткую канкурэнцыю і пагрозу беспрацоўя. Прынцып «працаваць не колькасцю, а ўменнем» атрымлівае рэальную сілу. Ён уносіць свае папраўкі ў характар выкарыстання працоўных рэсурсаў. Новай рысай гаспадарчай дзейнасці становіцца прыватызацыя, дэканцэнтрацыя вытворчасці, пашырэнне кааператыўных, індывідуальных, камерцыйных, у тым ліку сумесных з замежнымі краінамі, відаў дзейнасці. Пачынаюць фарміравацца новыя сацыяльныя групы працоўных, па-новаму складваецца працоўны баланс рэспублікі.

Усё большы ўплыў пачынае аказваць новая палітычная абстаноўка, новыя палітычныя адносіны, у тым ліку са сваімі суседзямі, з замежнымі дзяржавамі. Ва ўмовах самастойнага, суверэннага развіцця рэспублікі перастала дзейнічаць кіруючая роля цэнтра ў пераразмеркаванні працоўнай сілы паміж раёнамі быўшага СССР. Уступаюць у сілу дагаворныя адносіны паміж дзяржавамі Садружнасці, у тым ліку і ў выкарыстанні працоўных рэсурсаў. Ва ўмовах дэмакратызацыі адкрываюцца магчымасці для працаўладкавання ў замежных краінах, для працоўных кантактаў і абмену вопытам. Усё гэта будзе стымуляваць якасны рост працоўнай сілы, імкненне кожнага работніка праявіць свае лепшыя працоўныя якасці. Выгаднае эканоміка-геаграфічнае палажэнне Беларусі неабходна разумна выкарыстаць для рацыянальнага працаўладкавання. Як ужо адзначалася, неабходна больш гібкая палітыка ў адносінах да эміграцыі, каб яна не вызывала празмерных страт у працоўным патэнцыяле рэспублікі.

Экалагічны фактар, у тым ліку ўздзеянне чарнобыльскай аварыі, адчуваецца на працоўных рэсурсах праз стан здароўя, працягласць перыяду жыццядзейнасці. Ён уносіць парушэнні ў працоўны баланс, вызывае вымушаныя перамяшчэнні працоўных (гл. раздзел 6).

Усе гэтыя фактары неабходна ўлічваць, ацэньваючы працоўны патэнцыял рэспублікі ў будучым. Каб пазбег-

нуць негатыўных вынікаў, неабходна больш прадуманая і разнастайная сістэма арганізацыі працы, добра наладжаная сістэма інфармацыі, аператыўнае пераразмеркаванне рэзерваў, перападрыхтоўка кадраў з выкарыстаннем дапамогі замежных краін.

## 4. РАЗМЯШЧЭННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА І ЎЗРОВЕНЬ ЗАСЕЛЕНАСЦІ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

### 4.1. ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЕ РАЗМЕРКАВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

У параўнанні з даваенным перыядам у тэрытарыяльным размеркаванні насельніцтва Беларусі адбыліся вялікія змены. Яны працягваюцца і ў цяперашні час. Галоўнай рухаючай сілай у развіцці гэтага працэсу з'яўляюцца змены ў развіцці і размяшчэнні вытворчых сіл. Акрамя гэтага вызначальнага фактара дзейнічалі і некаторыя іншыя: вынікі другой сусветнай вайны, характар урбанізацыі, змены ў натуральным руху і міграцыі. У апошні час усё большае ўздзеянне аказвае экалагічны фактар.

Зрухі ў тэрытарыяльным размеркаванні насельніцтва відаць перш за ўсё ў разрэзе абласцей (табл. 4.1).

У параўнанні з 1940 г. асноўны дэмаграфічны зрух на тэрыторыі рэспублікі заключаецца ў тым, што адбылася ўзмоцненая канцэнтрацыя насельніцтва ў сталіцы і вакол яе, у прысталічнай вобласці. Калі да вайны на Міншчыне пражываў толькі кожны пяты жыхар рэспублікі, а ў Мінску — менш 3%, то ў 1989 г. адпаведна кожны трэці, а ў самой сталіцы — кожны шосты. Цэнтральнае ядро рэспублікі павялічвала сваё насельніцтва ў 3 разы хутчэй, чым астатняя тэрыторыя. Значыць, галоўным эпіцэнтрам прыцяжэння насельніцтва з'явілася сталіца і яе бліжэйшае акружэнне. Яна ж з'явілася і галоўным эпіцэнтрам канцэнтрацыі вытворчасці. На долю Міншчыны ў пачатку 80-х гг. прыпадала больш чым 1/3 прамысловай і 1/4 частка сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі. Нязначна змяніліся гэтыя суадносіны ў цяперашні час.

Сама па сабе колькасць насельніцтва, якой бы значнай яна ні была, не можа ацэньвацца як вялікая ці ма-

*Табліца 4.1*

**Тэрытарыяльнае размеркаванне насельніцтва**

| Вобласці | 1940 г. | | 1950 г. | | 1959 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % |
| Мінская з г. Мінскам | 1866 | 20,6 | 1760 | 22,8 | 1980 | 24,6 |
| Віцебская | 1727 | 19,1 | 1256 | 16,3 | 1276 | 15,8 |
| Гомельская | 1559 | 17,2 | 1240 | 16,1 | 1364 | 16,9 |
| Магілёўская | 1416 | 15,6 | 1140 | 14,8 | 1177 | 14,6 |
| Гродзенская | 1253 | 13,9 | 1126 | 14,7 | 1077 | 13,4 |
| Брэсцкая | 1225 | 13,6 | 1188 | 15,3 | 1182 | 14,7 |
| Беларусь | 9046 | 100 | 7709 | 100 | 8056 | 100 |

| Вобласці | 1979 г. | | 1989 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | тыс. чал. | % | тыс. час. | % |
| Мінская з г. Мінскам | 2833 | 29,6 | 3199 | 31,6 |
| Віцебская | 1385 | 14,5 | 1413 | 13,8 |
| Гомельская | 1599 | 16,7 | 1674 | 16,4 |
| Магілёўская | 1249 | 13,1 | 1285 | 12,6 |
| Гродзенская | 1131 | 11,8 | 1171 | 11,5 |
| Брэсцкая | 1363 | 14,3 | 1458 | 14,1 |
| Беларусь | 9560 | 100 | 10200 | 100 |

лая, без суадносін з тэрыторыяй і тымі рэсурсамі, якімі яна валодае.

Галоўным вынікам такога пераразмеркавання з'явілася ўшчыльненне насельніцтва на дадзенай тэрыторыі. Калі да вайны ў сярэднім на 1 кв. км жыло 46 чалавек, то ў 1990 г.— каля 80 чалавек. Дэмаграфічная нагрузка на тэрыторыю асабліва павялічылася ў самой сталіцы і дасягнула 8000 чалавек на кв. км. Мінск адносіцца да ліку найбольш ушчыльненых гарадоў краіны і свету. Напрыклад, у Маскве шчыльнасць насельніцтва — каля 9 тыс. чалавек на кв. км, у Лондане — 5 тыс., у Парыжы — 12 тыс., у Нью-Йорку — 9 тыс., у Токіо — 14 тыс. Большасць буйных гарадоў маюць шчыльнасць насельніцтва ад 2 да 5 тыс. чалавек. Шчыльнасць насельніцтва павялічваецца ва ўсёй агламерыраванай зоне вакол Мінска. На паўночным захадзе фарміруецца Маладзечанскае ядро канцэнтрацыі насельніцтва, на паўночным усходзе — Барысаўскае, на поўдні — Слуцка-Салігорскае, на

паўднёвым усходзе — Дзяржынска-Стаўбцоўскае. У цэлым тэрыторыя Мінскай вобласці заселена найбольш шчыльна і раўнамерна.

Другі напрамак у тэрытарыяльным пераразмеркаванні насельніцтва — паўднёвы, следам за зрухамі на поўдзень новых цэнтраў вытворчасці. Доля паўднёвай зоны ў межах Брэсцкай і Гомельскай абласцей пастунова павялічвалася. Гомельская вобласць з трэцяга месца па колькасці насельніцтва перайшла на другое, а Брэсцкая з апошняга месца ў 1940 г. перайшла на трэцяе к канцу 80-х гг. Трэба адзначыць, што тэрыторыя паўднёвай зоны мела адносна меншыя страты насельніцтва ў гады вайны, дзякуючы больш высокаму натуральнаму прыросту змагла раней узнавіць даваенную колькасць і нават пераўзысці яе. Толькі тры вобласці Беларусі перавысілі даваенную колькасць насельніцтва: Мінская — на 70%, Брэсцкая — на 16 і Гомельская — на 7% (гл. табл. 4.1).

Зрухі ў размяшчэнні насельніцтва, выкліканыя чарнобыльскай аварыяй, могуць парушыць прапорцыі, якія склаліся. Ва ўсякім выпадку, доля паўднёвай зоны наўрад ці будзе павялічвацца на працягу бліжэйшых дзесяцігоддзяў.

Мінімальнай, з пастаянным змяншэннем, з'яўляецца доля заходняй і ўсходняй абласцей — Гродзенскай і Магілёўскай. Пры гэтым тэрыторыя Магілёўскай вобласці мела асноўныя страты насельніцтва ў гады вайны і не змагла ўзнавіць іх да цяперашняга часу. Ваенныя страты Гродзеншчыны былі не такія вялікія, але яны дапоўніліся эміграцыяй у 40-я і 50-я гг. ў выніку абмену насельніцтвам паміж Польшчай і СССР. Увесь наступны перыяд прырост насельніцтва быў настолькі нязначным, што доля гэтай вобласці яшчэ больш знізілася, а даваенная колькасць так і не дасягнута, у выніку вобласць па долі насельніцтва перайшла на апошняе месца (гл. табл. 4.1).

Самае значнае зніжэнне дэмаграфічнага патэнцыялу адбылося ў паўночнай зоне, на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Да вайны тут пражываў кожны пяты жыхар рэспублікі і яна ўступала па колькасці насельніцтва толькі Мінскай вобласці; у цяперашні час яе абышлі Гомельская і Брэсцкая вобласці. Тэрыторыя Віцебшчыны мела самыя вялікія страты насельніцтва ў гады вайны, і найбольш адчувальныя яе вынікі ва ўсе наступныя гады. Найбольшыя страты насельніцтва былі ў тых раёнах, дзе неаднаразова праходзіла лінія фронту і асабліва моцным

*Табліца 4.2*

**Страты насельніцтва ўсходніх раёнаў Віцебскай вобласці ў гады вайны, тыс. чал.**

| Раёны (у граніцах 1945 г.) | Колькасць насельніцтва | | Змяншэнне | У тым ліку расстраляны, спалены, павешаны, вывезены ў рабства |
|---|---|---|---|---|
| | на 17.01. 1939 г. | на 1.07. 1945 г. | | |
| Бешанковіцкі | 57,6 | 40,6 | —17,0 | 9,8 |
| Багушэўскі | 45,7 | 30,8 | —14,9 | 1,8 |
| Віцебскі | 59,5 | 28,2 | —31,3 | 3,1 |
| г. Віцебск | 167,3 | 53,7 | —113,6 | 44,4 |
| Гарадоцкі | 46,2 | 23,6 | —22,6 | 6,0 |
| Дубровенскі | 60,4 | 32,7 | —27,7 | 23,6 |
| Лепельскі | 58,3 | 36,7 | —21,6 | 6,0 |
| Аршанскі | 110,5 | 63,4 | —47,1 | 28,8 |
| г. Орша | 37,6 | 21,7 | —15,9 | — |
| Суражскі | 54,7 | 20,0 | —34,7 | 31,2 |
| Талачынскі | 64,9 | 49,1 | —15,8 | 9,1 |
| Лёзненскі | 59,6 | 29,3 | —30,3 | 3,3 |
| Мехаўскі | 41,9 | 20,0 | —21,9 | 3,5 |
| Сенненскі | 47,0 | 34,9 | —12,1 | 3,7 |
| Чашніцкі | 48,5 | 34,7 | —13,8 | 4,4 |
| Сіроцінскі | 48,8 | 28,5 | —20,3 | 2,8 |

быў партызанскі рух. У сучасных межах гэта адпавядае Аршанскаму, Дубровенскаму, Лёзненскаму, Віцебскаму, Полацкаму раёнам (табл. 4.2).

Амаль кожнага другога жыхара не далічыліся ўсходнія раёны Віцебшчыны ў канцы вайны. Вельмі вялікія страты панесла насельніцтва гарадоў. У час вызвалення Віцебска, Оршы, Полацка і іншых гарадоў налічвалася 1/3 іх даваеннай колькасці жыхароў. Насельніцтва, якое засталося, мела вельмі парушаную полаўзроставую структуру: суадносіны мужчын і жанчын у працаздольным узросце былі 1 : 3, а доля гэтай катэгорыі насельніцтва не дасягала нават 1/3. Такой жа малалікай стала і дзетародная група, што пазней прывяло да зніжэння натуральнага прыросту.

Да людскіх страт у гады вайны дабавіліся міграцыйныя страты на працягу першых пасляваенных гадоў, звязаныя з пошукамі жылля і сродкаў існавання. У 50-я гг. пераважаў паток міграцыі на ўсход — у Казахстан і Заходнюю Сібір на асваенне цалінных і залежных зямель, на прамысловыя новабудоўлі. У выніку амаль 20 год Віцебшчына не мела прыросту насельніцтва, а толькі змян-

шэнне, хоць натуральны прырост з 1946 па 1956 г. быў найбольш высокім — ад 14 да 16‰.

Больш павольна, чым у цэлым па Беларусі, расло насельніцтва паўночнай зоны і ў наступныя гады. У 60-я гг. пракацілася хваля вынікаў вайны; у дзетародны ўзрост уступіла малалікае пакаленне ваенных гадоў нараджэння, рэзка знізіўся ўзровень нараджальнасці, упаў натуральны прырост. Працягвалася актыўная міграцыя сельскага насельніцтва ў гарады. Па колькасці гараджан Віцебская вобласць у 1970 г. уступала толькі Мінскай. Адбылося рэзкае змяншэнне колькасці маладога сельскага насельніцтва, у пачатку 70-х гг. на тэрыторыі вобласці з'явіліся першыя раёны з дэпапуляцыяй. Колькасць іх увесь час узрастала; у 1987 г. у сельскай мясцовасці ўсіх раёнаў вобласці натуральны прырост стаў адмоўным. У выніку Віцебшчына мае самы мінімальны прырост насельніцтва: амаль за 20 год — з 1970 па 1989 г.— ён склаў 3%, г. зн. менш чым 0,2% у год. Пры гэтым забяспечылі яго толькі гарады. Доля паўночнай зоны ўвесь час зніжаецца (гл. табл. 4.1). Адрыў ад даваеннай колькасці складае больш за 300 тыс. чалавек. Пры такіх тэмпах росту спатрэбіцца не менш чым 100 гадоў, каб узнавіць даваенны патэнцыял.

Складаная дэмаграфічная сітуацыя негатыўна адбіваецца на эканамічным развіцці вобласці. Яна прыкметна здала свае пазіцыі ў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, як бы прыпынілася ў развіцці. Асабліва гэта адносіцца да сельскай гаспадаркі. Так, за перыяд з 1970 па 1986 г. аб'ём прадукцыі сельскай гаспадаркі ў Брэсцкай вобласці павялічыўся на 42%, у Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай — на 32—34, Магілёўскай — на 22, а ў Віцебскай — на 16%. У выніку доля вобласці ў вытворчасці прадукцыі прыкметна знізілася, і яна з другога месца пасля Мінскай перайшла на трэцяе пасля Гомельскай вобласці.

Паўночная зона ў Беларусі патрабуе асаблівай увагі як у палітыцы размеркавання капіталаўкладанняў, тэхнічных сродкаў, так і ў размеркаванні сацыяльных даброт. Яе прыродныя ўмовы не пагоршыліся, не сталі горшымі і зямельныя рэсурсы, а стала горшай сацыяльна-эканамічная сітуацыя, якая падуладна чалавеку і можа быць палепшана намаганнямі гэтага ж чалавека. Калі ў мінулым на гэтай тэрыторыі маглі жыць і працаваць амаль 2 млн. чалавек, значыць, яна мела неабходныя рэсурсы і прыроднае асяроддзе гэтаму садзейнічала.

*Табліца 4.3*

**Параўнальныя даныя аб тэрытарыяльных і людскіх рэсурсах, %**

| Рэсурсы | Паўночная зона | | Цэнтральная зона | | Паўднёвая зона | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1970 г. | 1989 г. | 1970 г. | 1989 г. | 1970 г. | 1989 г. |
| Людскія | | | | | | |
| ўсё насельніцтва | 15,2 | 13,8 | 53,4 | 55,7 | 31,4 | 30,5 |
| гарадское | 15,7 | 13,8 | 56,8 | 58,0 | 27,3 | 28,2 |
| сельскае | 14,7 | 14,2 | 50,8 | 51,0 | 34,6 | 35,1 |
| працоўная сіла | 15,0 | 13,6 | 54,5 | 56,8 | 30,5 | 29,6 |
| Тэрытарыяльныя | | | | | | |
| ўся плошча | 20,0 | 20,0 | 45,0 | 45,0 | 35,0 | 35,0 |
| сельгасугоддзі | 19,0 | 18,0 | 50,0 | 50,0 | 31,0 | 32,0 |
| ворная зямля | 19,0 | 19,0 | 53,0 | 53,0 | 28,0 | 28,0 |
| пасяўныя плошчы | 21,0 | 21,0 | 47,0 | 48,0 | 32,0 | 31,0 |

Заўвага: паўночная зона — у межах Віцебскай вобласці; цэнтральная — Гродзенская, Мінская, Магілёўская вобласці; паўднёвая — Гомельская і Брэсцкая вобласці.

*Табліца 4.4*

**Тэрытарыяльнае размеркаванне гарадскога і сельскага насельніцтва Беларусі, 1989 г.**

| Вобласці | Гарадское насельніцтва | | Сельскае насельніцтва | | Шчыльнасць на 1 кв. км | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | тыс. чал. | % | тыс. чал. | % | гараджан | сялян |
| Мінская (з Мінскам) | 2356 | 35,3 | 843 | 24,0 | 58 | 21 |
| Гомельская | 1070 | 16,1 | 604 | 17,4 | 26 | 15 |
| Віцебская | 911 | 13,6 | 502 | 14,1 | 23 | 13 |
| Магілёўская | 845 | 12,7 | 440 | 12,2 | 30 | 14 |
| Брэсцкая | 824 | 12,3 | 634 | 18,0 | 25 | 20 |
| Гродзенская | 670 | 10,0 | 501 | 14,3 | 26 | 21 |
| Беларусь | 6676 | 100 | 3524 | 100 | 32 | 17 |

Параўноўваючы суадносіны тэрытарыяльных і людскіх рэсурсаў паміж трыма зонамі рэспублікі (паўночная, цэнтральная і паўднёвая), можна зрабіць вывад, што ў паўночнай зоне тэрытарыяльных рэсурсаў адносна больш, чым людскіх; у цэнтральнай, наадварот, людскіх рэсурсаў сканцэнтравана да цяперашняга часу больш, чым тэрытарыяльных. Найбольш спрыяльныя суадносіны паміж двума галоўнымі відамі рэсурсаў — у паўднёвай зоне (табл. 4.3).




Рыс. 4.1. Тэрытарыяльнае размеркаванне гарадскога насельніцтва: доля тэрыторыі ў агульнай колькасці гарадскога насельніцтва, %:
*1*—больш 10, *2*—ад 5 да 10, *3*—ад 2 да 5, *4*—менш 2, *5*—колькасць гарадскога насельніцтва, 1 см=300 тыс. чал.

У перспектыве зрух вытворчых сіл і насельніцтва магчыма накіраваць у паўночныя раёны Беларусі, дзе можна больш актыўна выкарыстаць зямельныя, лясныя і водныя рэсурсы. Ва ўмовах дробнаконтурнасці больш рацыянальнымі могуць быць розныя формы індывідуальных гаспадарак, арэнды, фермерства.

Нераўнамернасць у размеркаванні насельніцтва па тэрыторыі за пасляваенны перыяд прыкметна ўзмацнілася, што абумоўлена нераўнамерным размеркаваннем гарадскога насельніцтва (табл. 4.4, рыс. 4.1, 4.2).

Як відаць з табліцы і рысункаў, тэрыторыя Мінскай вобласці канцэнтруе столькі гарадскога насельніцтва, колькі Магілёўская, Брэсцкая і Гродзенская вобласці, разам узятыя. Вядома, што пры шчыльнасці гараджан, удвая большай, чым ва ўсіх астатніх абласцях, Міншчына адчувае найбольшую ўрбаністычную нагрузку. Усе праблемы, якія мае вялікі, тым больш сталічны, горад,

нельга разглядаць у адрыве ад таго рэгіёну, на тэрыторыі якога ён знаходзіцца.

Узаемадзеянне вялікіх гарадоў з навакольнай тэрыторыяй праяўляецца па двух галоўных каналах сувязей: спажывецкіх і аддаючых.

С п а ж ы в е ц к а е ў з д з е я н н е вялікіх гарадоў носіць рэсурсны характар, г. зн., што навакольная тэрыторыя вымушана заўсёды дзяліцца з горадам усімі відамі сваіх рэсурсаў. Гарады перш за ўсё выкарыстоўваюць (пры гэтым без асаблівага ўзгаднення) частку тэрытарыяльных рэсурсаў. Так, паводле даных даведніка «Городское хозяйство БССР», у 1981 г. толькі 15 асноўных гарадоў рэспублікі займалі плошчу каля 100 тыс. га, што раўназначна плошчы 20—30 калгасаў.

Таму праблему эканоміі такіх неўзнаўляемых рэсурсаў, як тэрытарыяльныя, ва ўмовах урбанізацыі неабходна разглядаць як адну з першачарговых.

Вялікі горад атрымлівае ад сельскіх пасяленняў і на-




Рыс. 4.2. Тэрытарыяльнае размеркаванне сельскага насельніцтва: доля тэрыторыі ў агульнай колькасці сельскага насельніцтва, %:
*1*—больш 6, *2*—ад 3 да 6, *3*—менш 3, *4*—колькасць сельскага насельніцтва, 1 см=150 тыс. чал.

ват сваіх «сабратоў» — малых гарадоў (таксама без асаблівага ўзгаднення з імі) частку працоўных рэсурсаў, пры гэтым самых маладых. Іменна за кошт міграцыі з Мінскай вобласці Мінск, як і ўсе іншыя абласныя цэнтры, сфарміраваў 2/3 сваіх працоўных рэсурсаў і накапіў найбольш якасны працоўны патэнцыял. Калі б за працоўныя рэсурсы трэба было плаціць, то гарады былі б вечнымі даўжнікамі вёскі. Ва ўмовах пераходу на рыначныя адносіны трэба перагледзець узаемаадносіны гарадоў з сельскай мясцовасцю пры выкарыстанні працоўных рэсурсаў. Пры гэтым патрэбна ўлічваць у першую чаргу не запатрабаванні гарадоў, а магчымасці сельскіх пасяленняў. Улік гэты для Беларусі асабліва важны ва ўмовах складанай дэмаграфічнай сітуацыі ў сельскай мясцовасці.

Вялікія гарады з'яўляюцца асноўнымі спажыўцамі таварных харчовых рэсурсаў і атрымліваюць іх у першую чаргу з навакольнай сельскай мясцовасці. Харчовыя запатрабаванні вялікіх гарадоў растуць прапарцыянальна росту іх насельніцтва. За мінулыя 30 гадоў нагрузка спажыўцоў-гараджан на аднаго занятага ў сельскай гаспадарцы рэспублікі павялічылася ў 4 разы і дасягнула 7 чалавек, 4 з якіх — жыхары буйных гарадоў. У новых умовах гаспадарання неабходна прадумаць і новую сістэму пераразмеркавання каштоўнасцей; доўг за харчовыя рэсурсы неабходна кампенсаваць у адпаведнай колькасці матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі, сацыяльна-культурнымі каштоўнасцямі і нават працоўнымі рэсурсамі.

Аднак трэба мець на ўвазе, што вялікія гарады не толькі спажываюць, але і аддаюць. У гэтай аддачы ёсць сацыяльна-эканамічная, навукова-тэхнічная і экалагічная састаўляючыя. Першая і другая даюць дадатны вынік, таму што буйныя гарады на самой справе з'яўляюцца цэнтрамі эканамічнага, палітычнага і духоўнага жыцця цэлых нацый, яны вызначаюць тэхнічны і навуковы прагрэс на той ці іншай тэрыторыі. Яны вырабляюць асноўную долю нацыянальнага даходу, забяспечваюць усю тэрыторыю прадукцыяй прамысловай вытворчасці, даюць ёй сродкі вытворчасці, падрыхтоўваюць для яе кваліфікаваныя кадры спецыялістаў і вызначаюць агульны ўзровень сацыяльна-эканамічнага развіцця. Таму раўнамерная сетка буйных гарадоў, якая паступова фарміруецца ў Беларусі, садзейнічае эканамічнаму развіццю ўсёй тэрыторыі. У перспектыве першачарговае развіццё павінны атрымаць такія ўскраінныя апорныя цэнтры, як

Глыбокае ці Паставы, каб узмацніць паўночна-заходнюю частку Віцебшчыны, Жыткавічы — у Палескай зоне, Крычаў — на ўсходняй ускраіне Беларусі.

Экалагічная састаўляючая аддачы буйных гарадоў дзейнічае адмоўна і таксама адлюстроўваецца на ўсёй тэрыторыі. Чым гусцейшая сетка такіх гарадоў, тым большая антрапагенная і тэхнагенная нагрузка на тэрыторыю, тым менш застаецца экалагічна чыстых зон. Экалагічнае ўздзеянне буйных гарадоў самае шматграннае і распаўсюджваецца на далёкую адлегласць. Пры гэтым сваё гарадское асяроддзе горад яшчэ імкнецца абараніць, а вось што адчувае сельская мясцовасць, горад звычайна мала трывожыць. Таму экалагічныя праблемы рэгіёна немагчыма рашаць без глыбокага вывучэння ўздзеяння гарадоў на навакольную тэрыторыю. У гэтых адносінах зноў праяўляецца прыярытэт тэрытарыяльнага падыходу ў справе арганізацыі жыццядзейнасці ўсёй рэспубліці.

У тэрытарыяльным размеркаванні насельніцтва, таксама як і ў вытворчасці, павінен дзейнічаць прынцып аптымальнасці, і пры сучасных абставінах не столькі эканамічнай, колькі экалагічнай. Гэты прынцып рэалізуецца пры такіх суадносінах, якія даюць магчымасць найлепшым чынам спалучаць насельніцтва з прыродным асяроддзем, наяўнымі сродкамі вытворчасці, рознымі відамі рэсурсаў, экалагічным станам.

З гэтага пункту гледжання размеркаванне насельніцтва, інакш кажучы дэмаграфічнага патэнцыялу, па тэрыторыі рэспублікі ў сучасны момант нельга лічыць аптымальным. Аб гэтым сведчыць і размеркаванне яго паміж раёнамі ў суадносінах з іх плошчай.

Па суадносінах велічыні тэрыторыі і колькасці пражываючага на ёй насельніцтва ўсе раёны Беларусі можна падзяліць на пяць груп (табл. 4.5).

Самы аптымальны — першы тып раёнаў. Іх можна назваць «раёнамі-эталонамі» і не толькі таму, што адпавядаюць сярэднім велічыням па плошчы (1,5—2 тыс. кв. км) і колькасці насельніцтва (100—150 тыс. чалавек). Іменна гэтыя раёны спалучаюць на сваёй тэрыторыі разнастайны жыццёвы патэнцыял у выглядзе яшчэ не вялікіх, але ўжо і не малых гарадоў, добра асвоеных сельскагаспадарчых мясцовасцей, густой сеткі дарог і населеных пунктаў. Раёны дадзенага тыпу ўжо не носяць прыкметы эканамічнай «непаўнацэннасці» і яшчэ не маюць празмернай экалагічнай напружанасці. Іх трэба захаваць у такім аптымальным стане як мага далей.

На жаль, такіх раёнаў адзінкі ў кожнай вобласці. Напрыклад, Баранавіцкі, Кобрынскі — у Брэсцкай; Аршанскі — у Віцебскай; Слуцкі, Маладзечанскі — у Мінскай; Жлобінскі, Рагачоўскі, Светлагорскі, Мазырскі — у Гомельскай; Лідскі, Слонімскі, Ваўкавыскі — у Гродзенскай; Бабруйскі — у Магілёўскай.

Другі і трэці тыпы аб'ядноўваюць раёны, дзе суадносіны паміж плошчай і насельніцтвам амаль не парушаны.

*Табліца 4.5*

**Тыпалогія раёнаў Беларусі па плошчы і агульнай колькасці насельніцтва**

| Тып раёнаў | Колькасць раёнаў у групе | % |
|---|---|---|
| 1. Сярэднія па плошчы і колькасці насельніцтва | 13 | 11 |
| 2. Вялікія па плошчы і колькасці насельніцтва | 6 | 5 |
| 3. Малыя па плошчы і колькасці насельніцтва | 14 | 12 |
| 4. Вялікія ці сярэднія па плошчы пры малой колькасці насельніцтва | 80 | 69 |
| 5. Малыя ці сярэднія па плошчы пры вялікай колькасці насельніцтва | 4 | 3 |

Аднак гэтыя дзве групы знаходзяцца ў адрыве ад сярэдняй аптымальнай. Яны не тыповыя, а хутчэй анамальныя раёны. Так, другі тып фарміруюць самыя вялікія раёны па плошчы і колькасці пражываючага насельніцтва (Віцебскі, Полацкі, Гродзенскі, Пінскі, Барысаўскі, Салігорскі). Асаблівасць іх у тым, што асноўная колькасць насельніцтва сканцэнтравана ў адным «эпіцэнтры», астатняя вялікая тэрыторыя заселена вельмі рэдка. Дадзены тып яшчэ мае рэзервы тэрыторыі для гаспадарчага асваення і павелічэння сеткі населеных пунктаў за кошт дадатковых людскіх рэсурсаў, магчыма са сваіх цэнтраў.

Трэці тып фарміруюць самыя малыя раёны і па плошчы і па насельніцтву, тыпова аграрныя, з вельмі невялікім эканамічным і працоўным патэнцыялам. Яны маглі б і не існаваць як самастойныя адміністрацыйна-гаспадарчыя адзінкі. Якіх-небудзь значных рэзерваў для нарошчвання эканамічнай базы яны фактычна не маюць. У ліку такіх раёнаў — Кармянскі, Лоеўскі, Зэльвенскі,

Карэліцкі, Ашмянскі, Клецкі, Нясвіжскі, Уздзенскі, Чэрыкаўскі, Хоцімскі, Круглянскі.

Чацвёрты тып раёнаў самы распаўсюджаны. Гэта ўсе тыя, дзе колькасць насельніцтва невялікая, а тэрытарыяльныя рэсурсы значныя, як, напрыклад, у Пружанскім, Браслаўскім, Гарадоцкім і іншых раёнах. Большасць з іх таксама тыпова сельскія, слаба урбанізаваныя, рэдка заселеныя, са значнымі рэзервамі тэрытарыяльных рэсурсаў для далейшай гаспадарчай дзейнасці. Стрымліваючы фактар развіцця гэтай самай шматлікай групы раёнаў — абмежаваныя працоўныя і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы. Акрамя таго, з групы выпадаюць раёны, пацярпеўшыя ад чарнобыльскай аварыі, на тэрыторыі якіх гаспадарчая дзейнасць або наогул спыняецца, або скарачаецца.

Той факт, што гэты тып раёнаў дамінуе ва ўсіх абласцях, сведчыць аб наяўнасці тэрытарыяльных рэзерваў для далейшай гаспадарчай дзейнасці. Значная частка іх ужо выкарыстоўваецца для перасялення жыхароў з Чарнобыльскай зоны.

А вось пяты тып раёнаў такіх рэзерваў фактычна не мае, бо тут людскіх рэсурсаў сканцэнтравалася многа, а тэрытарыяльных у запасе амаль што няма. Тыповы прадстаўнік гэтай групы — Мінскі раён разам з Мінскам, тэрыторыя якога вытрымлівае нагрузку горада-цэнтра і яго акружэння і імкліва набліжаецца да 2 млн. чалавек. Блізкія да яго — Гомельскі, Брэсцкі, Магілёўскі раёны, дзе таксама рэсурсныя прапорцыі ўсё больш парушаюцца.

Прыведзеная тыпалогія сведчыць аб тым, што палітыка далейшага ўдасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі насельніцтва павінна быць накіравана на стрымліванне празмернай яго канцэнтрацыі ў цэнтрах і больш раўнамернага размеркавання ў перыферыйных зонах кожнай вобласці.

## 4.2. УЗРОВЕНЬ ЗАСЕЛЕНАСЦІ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Узровень заселенасці тэрыторыі — гэта вынік яе гаспадарчай асвоенасці. Інтэнсіўнасць гаспадарчага асваення той ці іншай тэрыторыі вызначаецца ўзроўнем развіцця вытворчых сіл, што адлюстроўваецца не толькі ў колькасці асвоеных і заселеных зямель, але і ў гаспадарчай нагрузцы на гэтыя землі.

Для параўнальнага аналізу *ступені гаспадарчай асво-*

*Табліца 4.6*

**Паказчыкі гаспадарчай асвоенасці тэрыторыі Беларусі ў сярэднім за 1985—1989 гг.**

| Тэрытарыяльныя комплексы (сістэмы рассялення) | Шчыльнасць рабочай сілы, чал./кв. км | Матэрыяльна-тэхнічная нагрузка ў разліку на 1 кв. км (індэкс да сярэднерэспубліканскага ўзроўню) | | | Насычанасць тэрыторыі населенымі пунктамі | | Сельскагаспадарчая асвоенасць (% ворнай зямлі) | Ступень урбанізацыі (% гарадскога насельніцтва) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | асноўныя вытворчыя фонды | аб'ём валавой прадукцыі | | | | | |
| | | | прамысловасці | сельскай гаспадаркі | гарадскімі на 10 тыс. кв. км | сельскімі на 1000 кв. км | | |
| Баранавіцкі | 22 | 0,4 | 0,4 | 0,9 | 8 | 70 | 24 | 53,2 |
| Брэсцкі | 24 | 0,4 | 0,5 | 1 | 10 | 90 | 29 | 60,3 |
| Бабруйскі | 22 | 1,27 | 0,9 | 0,9 | 10 | 100 | 24 | 74,5 |
| Барысаўскі | 21 | 0,44 | 0,4 | 0,9 | 7 | 110 | 24 | 59,0 |
| Глыбоцкі | 11 | 0,08 | 0,09 | 0,8 | 12 | 280 | 31 | 32,8 |
| Гродзенскі | 18 | 1,63 | 1,03 | 1,3 | 12 | 150 | 38 | 63,5 |
| Гомельскі | 38 | 1,87 | 1,0 | 1,2 | 9 | 100 | 31 | 71,5 |
| Віцебскі | 22 | 1,51 | 0,6 | 0,8 | 6 | 90 | 29 | 74,8 |
| Жыткавіцкі | 8 | 0,06 | 0,03 | 0,4 | 6 | 40 | 11 | 33,2 |
| Жлобінскі | 19 | 1,14 | 0,7 | 0,9 | 11 | 80 | 25 | 59,7 |
| Крычаўскі | 12 | 0,2 | 0,05 | 0,9 | 8 | 130 | 36 | 44,5 |
| Лідскі | 21 | 0,31 | 0,2 | 1,2 | 11 | 140 | 32 | 45,0 |
| Мінскі | 68 | 2,48 | 2,6 | 1,4 | 11 | 130 | 32 | 85,6 |
| Магілёўскі | 24 | 1,8 | 0,8 | 1,2 | 6 | 130 | 39 | 69,8 |
| Мазырскі | 15 | 0,44 | 0,3 | 0,7 | 7 | 60 | 19 | 55,6 |
| Маладзечанскі | 18 | 0,3 | 0,2 | 1,1 | 10 | 230 | 29 | 44,7 |
| Аршанскі | 29 | 0,7 | 0,7 | 1,3 | 15 | 160 | 42 | 65,4 |
| Пінскі | 20 | 0,36 | 0,3 | 0,7 | 7 | 40 | 19 | 49,6 |
| Полацкі | 14 | 0,8 | 0,6 | 0,5 | 7 | 160 | 22 | 65,0 |
| Слуцкі | 21 | 0,8 | 0,5 | 1,6 | 10 | 90 | 36 | 52,2 |
| У сярэднім па Беларусі | 24 | 1 | 1 | 1 | 10 | 120 | 30 | 65 |

*енасці* раёнаў Беларусі была выкарыстана сістэма колькасных і якасных паказчыкаў, якія характарызуюць: а) насычанасць тэрыторыі ў разліку на адзінку плошчы элементамі вытворчай інфраструктуры (дарогамі, лініямі электраперадач, газа- і нафтаправодаў); аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры; населенымі пунктамі (гарадскімі і сельскімі); матэрыяльнымі сродкамі вытворчасці (асноўнымі вытворчымі фондамі); б) ступень урбанізацыі; в) ступень сельскагаспадарчай асвоенасці; г) выхад прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі на адзінку плошчы.




Рыс. 4.3. Узровень сельскагаспадарчай асвоенасці тэры торыі: доля ворнай зямлі ў агульнай плошчы, %: *1*—вышэй сярэдняй (больш 40); *2*—сярэдняя (30—40); *3*—ніжэй сярэдняй (20—30); *4*—нязначная (менш 20)

*Ступень заселенасці* адлюстроўвае адносіны паміж насельніцтвам і тэрыторыяй. Яна выяўляецца сістэмай паказчыкаў шчыльнасці: усяго насельніцтва, гарадскога, сельскага, рабочай сілы на адзінку плошчы (1 кв. км, у тым ліку сельгасугоддзяў, ворнай зямлі).

Абедзве характарыстыкі тэрыторыі цесна ўзаемазвязаны. Паказчыкі заселенасці адлюстроўваюць адносіны насельніцтва да дадзенай тэрыторыі, якая можа вызначацца лепшымі ці горшымі магчымасцямі для жыццядзейнасці. Гэтыя магчымасці залежаць ад прыродных умоў і рэсурсаў, якімі валодае тэрыторыя, ад развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, гістарычнага вопыту насельніцтва ў развіцці гаспадаркі і фарміраванні сістэмы рассялення. Паказчыкі гаспадарчай асвоенасці адлюстроўваюць вынікі чалавечай дзейнасці ў дадзеным прыродным асяроддзі, у тым ліку працэс асваення прыродных рэсурсаў і насычэння тэрыторыі элементамі вытворчых сіл: рабочай сілай, прадметамі і прыладамі працы.

Самымі галоўнымі абагульняючымі паказчыкамі з'яўляюцца шчыльнасць насельніцтва, шчыльнасць асноўных вытворчых фондаў і выхад прадукцыі з кожнай адзінкі тэрыторыі. Гэтымі паказчыкамі вымяраецца чалавечая праца, укладзеная ў дадзеную тэрыторыю, і эфектыўнасць гэтай працы.

Вынікі аналізу пералічаных паказчыкаў у разрэзе ўсіх адміністрацыйных раёнаў рэспублікі сведчаць, што дыферэнцыяцыя ў гаспадарчай асвоенасці тэрыторыі ярка выяўлена. Самай максімальнай і складанай па структуры «загрузкай» вызначаюцца найбольш урбанізаваныя раёны вакол буйных ці хутка растучых сярэдніх гарадоў. У паўночнай зоне — гэта арэалы вакол Віцебска, Оршы, Полацка; у цэнтральнай — вакол Мінска, Гродна, Магілёва, Барысава, Бабруйска, Маладзечна; у паўднёвай — вакол Гомеля, Брэста, Пінска, Баранавіч, Мазыра, Жлобіна. Гэтыя тэрыторыі больш, чым іншыя, атрымалі капітальных укладанняў ва ўсе сферы гаспа-




Рыс. 4.4. Узровень заселенасці тэрыторыі:

шчыльнасць усяго насельніцтва, чал./кв. км: *1*—высокая (больш 150); *2*—вышэй сярэдняй (50—60); *3*—сярэдняя (40—50); *4*—ніжэй сярэдняй (менш 40)




Рыс. 4.5. Шчыльнасць гарадскога насельніцтва, чал./кв. км: *1*—больш 100; *2*—ад 25 да 30; *3*—ад 15 да 25; *4*—менш 15

дарчай дзейнасці, накапілі магутны эканамічны і сацыяльна-культурны патэнцыял, маюць лепшыя магчымасці працаўладкавання, умовы жыццядзейнасці чалавека і застаюцца цэнтрамі прыцягнення рабочай сілы.

У табл. 4.6 і на рыс. 4.3—4.8 наглядна адлюстраваны тэрытарыяльныя адрозненні пералічаных геаграфічных характарыстык. Іх параўнанне даецца паміж сістэмамі рассялення.

Побач са згусткамі гаспадарчай дзейнасці застаюцца тэрыторыі з мінімальным гаспадарчым уздзеяннем і такой жа мінімальнай вытворчай аддачай. На паўночным захадзе гэта большая частка тэрыторыі Глыбоцкай і Маладзечанскай сістэм рассялення; на поўначы — Расонска-Гарадоцка-Суражская паласа; на ўсходзе — тэрыторыя Крычаўскай сістэмы; на захадзе — Лідскай; на поўдні — зона Палесся (Пінска-Жыткавіцкая паласа). Гэтыя тэрыторыі яшчэ менш за іншыя адчуваюць антрапагеннае і тэхнагеннае ўздзеянне. Многія з іх неабходна

захаваць як запаведныя, многія выкарыстаць для адпачынку і турызму, на некаторых узмацніць гаспадарчы патэнцыял.

Комплексная схема тэрытарыяльнай арганізацыі ўсіх раёнаў рэспублікі навукова абгрунтавана і прадстаўлена ў падрабязных праектных распрацоўках БелНДІПгорадабудаўніцтва, застаецца толькі разумна яе ажыццяўляць. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што за сярэднімі рэспубліканскімі лічбамі хаваюцца вельмі значныя тэрытарыяльныя адрозненні ва ўзроўні эканамічнага развіцця, што ў сваю чаргу стварае розныя ўмовы для жыцця людзей. Так, напрыклад, мінімальныя паказчыкі гаспадарчага патэнцыялу і насычанасць тэрыторыі асноўнымі фондамі, выхад прадукцыі з адзінкі плошчы ў Глыбоцкай тэрытарыяльнай сістэме ўступаюць максімальным у найбольш высокаразвітай Мінскай у 30—40 разоў. Вельмі значная амплітуда паміж найбольшымі і найменшымі паказчыкамі па ўзроўню ўрбанізацыі (ад




Рыс. 4.6. Шчыльнасць сельскага насельніцтва, чал./кв. км:
*1*—больш 0; *2*—ад 15 да 20; *3*—менш 15




Рыс. 4.7. Дэмаграфічная нагрузка на ворных землях усяго насельніцтва, чалавек на 100 га:

*1*—найбольш высокая (звыш 350); *2*—высокая (250—200); *3*—сярэдняя (200—150); *4*—ніжэй сярэдняй (150—100); *5*—нязначная (менш 100)

10 да 80%), сельскагаспадарчай асвоенасці зямель (ад 10 да 50% ворнай зямлі), насычанасці тэрыторыі населенымі пунктамі, асабліва сельскімі (ад 40 да 300 у разліку на 1000 кв. км.), і г. д.

Розныя тэрыторыі з пэўным прыродна-рэсурсным патэнцыялам і ўзроўнем развіцця гаспадаркі маюць на канкрэтным гістарычным этапе пэўны рубеж «ёмкасці». З паскарэннем тэхнічнага прагрэсу «ёмкасць» тэрыторыі для насельніцтва можа расці, але не бязмежна. Гэты рубеж вызначаецца тым жыццёвым патэнцыялам, які можа задаволіць матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні грамадства пры ўмове спрыяльнай экалагічнай абстаноўкі для жыцця людзей, умацавання іх здароўя, узнаўлення сіл і неабходнасці захавання самой прыроды і яе рэсурсаў. Карацей кажучы, дэмаграфічная і матэрыяльна-тэхнічная нагрузка на тэрыторыю павінна адпавядаць яе экалагічнаму стану і не выклікаць празмерных парушэн-

няў у прыродным асяроддзі. Таму без экалагічнай экспертызы не могуць на сучасным этапе ажыццяўляцца ніякія тэхнічныя і эканамічныя распрацоўкі. Ва ўмовах Беларусі гэта пытанне набывае асабліва значэнне.

Разглядаючы зрухі ў размяшчэнні насельніцтва Беларусі, трэба адзначыць, што змяняюцца не толькі паказчыкі шчыльнасці, але і сам характар заселенасці тэрыторыі. Гэтыя змены праяўляюцца ў наступным.

На першы паверх заселенасці, які спачатку фарміравала сельскае насельніцтва, усё актыўней нарошчваецца другі паверх — за кошт гарадскога насельніцтва. Ужо многія дзесяцігоддзі толькі яно павялічвае дэмаграфічную нагрузку на асвоеных землях, таму што колькасць сялян змяншаецца. Напрыклад, да вайны шчыльнасць гарадскога насельніцтва ў разліку на 1 кв. км складала толькі 9 чалавек, а ў 1990 г.— 33 чалавекі, сельскіх жыхароў — адпаведна 35 і 17 чалавек (гл. рыс. 4.3—4.8). Нагрузка на зямельныя рэсурсы павялічылася за кошт




Рыс. 4.8. Дэмаграфічная нагрузка на ворных землях сельскага насельніцтва, чалавек на 100 га:

*1*—найбольш высокая (звыш 100); *2*—высокая (100—80); *3*—сярэдняя (80—60); *4*—нізкая (менш 60)

*Табліца 4.7*

**Зрухі ў заселенасці тэрыторыі Беларусі (1970—1990 гг.)**

| Групы раёнаў | Зоны | | |
|---|---|---|---|
| | паўночная | цэнтральная | паўднёвая |
| Усяго раёнаў у зоне | 21 | 59 | 37 |
| З іх маюць: | | | |
| ушчыльненне насельніцтва | | | |
| усяго | 3 | 15 | 14 |
| сельскага | няма | 1 | 1 |
| разушчыльненне насельніцтва | | | |
| усяго | 18 | 44 | 23 |
| сельскага | 21 | 58 | 36 |

несельскагаспадарчага насельніцтва. Гэта ў сваю чаргу патрабуе ўсё большай колькасці таварнай прадукцыі ад сельскай гаспадаркі, каб забяспечыць запатрабаванні гараджан, таму харчовая праблема ўвесь час абвастраецца.

Адбываецца пераразмеркаванне насельніцтва паміж раёнамі, у выніку чаго адны з іх ушчыльняюцца, а другія, наадварот, разушчыльняюцца (табл. 4.7, рыс. 4.9).

За мінулыя 20 гадоў на тэрыторыі большасці раёнаў рэспублікі шчыльнасць насельніцтва зменшылася (у той час як сярэдні паказчык павялічыўся). Вось той нагляддны прыклад недакладнасці сярэдніх велічынь. Разушчыльненнем насельніцтва ахоплены ўсе тыя тэрыторыі, на якіх няма значных прамысловых цэнтраў, з якіх працягваецца міграцыйны адток, а следам за ім нарастае дэпапуляцыя. Больш за ўсё гэта тэндэнцыя выяўляецца ў паўночнай частцы рэспублікі, дзе большасць раёнаў не дасягнула даваеннай колькасці насельніцтва. Таму гаварыць аб павелічэнні дэмаграфічнай нагрузкі на тэрыторыі сучаснай Беларусі можна толькі адносна тых урбанізаваных арэалаў, якія стварыліся вакол гарадоў. Уся астатняя сельская тэрыторыя адчувае змяншэнне гэтай нагрузкі. Так, з 21 раёна Віцебскай вобласці паказчык шчыльнасці насельніцтва павялічыўся толькі ў трох (Віцебскім, Полацкім і Аршанскім) і гэта павелічэнне забяспечылі буйныя гарады. У цэнтральнай зоне такіх раёнай больш — кожны чацвёрты, але шчыльнасць сельскага насельніцтва павялічылася ў адным — Мінскім. У паўднёвай зоне павелічэнне шчыльнасці насельніцтва меў кожны другі раён, аднак эвакуацыя і адсяленне пасля чарнобыльскай аварыі гэты працэс парушылі.




Рыс. 4.9. Зрухі ў заселенасці тэрыторыі за 70—80-я гг.: шчыльнасць насельніцтва павялічылася: *1*—значна, *2*—нязначна, *3*—не змянілася; шчыльнасць насельніцтва зменшылася: *4*—нязначна, *5*—значна, *6*—рэзка пасля аварыі на ЧАЭС

Такім чынам, пераразмеркаванне насельніцтва ў карысць гарадоў ўзмацніла нераўнамернасць у яго размяшчэнні. Раней, калі тэрыторыя рэспублікі была ў асноўным сельскай, насельніцтва размяшчалася больш раўнамерна, а па меры росту гарадоў палярызацыя ў рассяленні праяўляецца ўсё больш выразна. Гэта заканамернасць уласціва ўсім урбанізаваным краінам, у якіх асноўную ролю ў геаграфічным размяшчэнні насельніцтва іграюць гарады.

У межах рэспублікі выяўлены тэрытарыяльныя адрозненні ў ступені заселенасці. Можна вызначыць пяць асноўных тыпаў раёнаў па гэтаму крытэрыю.

1. Рэдказаселеныя тэрыторыі з перавагай сельскага насельніцтва і адзінкавымі малымі гарадамі. Гэта ў асноўным паўночная частка рэспублікі і цэнтральнае Палессе.

2. Сярэднезаселеныя тэрыторыі з перавагай сельскага насельніцтва і адзінкавымі малымі гарадамі.

3. Густазаселеныя тэрыторыі з перавагай сельскага насельніцтва і адзінкавымі малымі гарадамі.

4. Густазаселеныя тэрыторыі з перавагай гарадскога насельніцтва і адзінкавымі буйнымі ці сярэднімі гарадамі.

5. Прыгарадныя, агламерыраваныя зоны буйных гарадоў з высокай шчыльнасцю насельніцтва.

З 1986 г. у гэтым заніраванні, паступова пашыраючы свой арэал, утварылася асаблівая зона, якую называюць «Чарнобыльская». Гэта зона экалагічнага бедства. Зона, у якой усё больш арэалаў застаецца без насельніцтва. Калі ў выніку Вялікай Айчыннай вайны засталіся бязлюдныя арэалы на поўначы рэспублікі, то ў выніку чарнобыльскай аварыі такія арэалы з'явіліся ў многіх паўднёвых раёнах.

Розная ступень асвоенасці і заселенасці тэрыторыі па-рознаму ўплывае на *прыродаахоўныя праблемы.*

Рэзкае павелічэнне, практычна падваенне дэмаграфічнай нагрузкі, як гэта мае месца ў многіх арэалах на тэрыторыі Беларусі, цягне за сабой прыкладна прапарцыянальнае павелічэнне тэхнагеннай нагрузкі на тэрыторыю за кошт насычэння на ёй аб'ектаў гаспадарчай дзейнасці, транспартных і іншых камунікацый, сетак населеных пунктаў.

Вынікам гэтага ўздзеяння з'яўляецца ўскладненне экалагічнай сітуацыі. Яно носіць двухбаковы характар. З аднаго боку, усё больш эксплуатуюцца і відазмяняюцца тэрытарыяльныя і ўсе іншыя прыродныя рэсурсы. Зямельныя рэсурсы ўсё больш адыходзяць ад свайго непасрэднага сельскагаспадарчага прызначэння і набліжаюцца да несельскагаспадарчага. Фарміруюцца рознапрофільныя прамысловыя зоны, дзе ўсё больш зямель адыходзіць пад гарады, іх тэхнічныя наземныя і падземныя камунікацыі, буйнейшыя аўтастрады, санітарна-ахоўныя зоны, пад розныя будынкі і збудаванні. Акрамя таго, чым больш на тэрыторыі пражывае гараджан, тым больш патрабуецца рэкрэацыйных зон для іх адпачынку. Гарады, пастаянна пашыраючыся, паглынаюць усё больш зямельных рэсурсаў і нават частку сельскіх населеных пунктаў. Штогод для патрэб гарадскога будаўніцтва адводзіцца больш чым 2 тыс. га, іншымі словамі, за два гады расходуецца зямельная плошча цэлага калгаса.

Гаспадарчая актыўнасць чалавека на такіх урбанізаваных тэрыторыях шматпланавая, і яе ўздзеянне на навакольнае асяроддзе ідзе па ўсіх каналах сацыяльна-

экалагічных сувязей. Усё больш актуальнай праблемай становіцца збор і перапрацоўка вытворчых і бытавых адыходаў. Асабліва ўзрастае іх аб'ём у буйных гарадах. Дадзеныя па Маскве гавораць аб тым, што ў сярэднім на аднаго чалавека ў дзень накапленне смецця складае 2—3 кг.

У гэтай сувязі ўзнікла патрэба ў новай галіне гарадской гаспадаркі — прамысловай перапрацоўкі бытавых адыходаў. На змену звалкам павінны прыйсці заводы па перапрацоўцы і спальванню смецця. Узрасла патрэба ў пнеўмакантэйнерным транспарце.

Гараджане, асабліва буйных гарадоў, усё актыўней асвойваюць для адпачынку не толькі бліжэйшыя прыгарадныя тэрыторыі, але і землі раёнаў, якія прылягаюць. Водна-лясныя і леса-паркавыя рэкрэацыйныя масівы ў нарастаючых тэмпах дапаўняюцца дачнымі, садова-агароднымі. Гэта ў сваю чаргу выклікае неабходнасць дадатковага будаўніцтва транспартных ліній, у тым ліку электрыфікаваных чыгуначных дарог. Значыць, плошчы, эксплуатуемыя гараджанамі, намнога большыя непасрэдна занятых гарадской забудовай. Шчыльнасць насельніцтва павялічваецца, шчыльнасць забудовы ўзрастае, а лясістасць і разворанасць змяншаюцца. Відавочна тэндэнцыя, што на адзінку тэрыторыі павялічваецца нагрузка дэмаграфічная, г. зн. людская, і матэрыяльна-эканамічная, г. зн. рэчавая.

Асаблівым экалагічным фактарам выступаюць новыя параджэнні урбанізацыі. Сярод іх — аўтамабілізацыя, якая расце і суправаджаецца не толькі ўзмоцненым спажываннем паліўных рэсурсаў, выступае як галоўная крыніца забруджвання прыроднага асяроддзя, але і як спажывец усё тых жа тэрытарыяльных рэсурсаў. Так, у жылым раёне горада ў разліку на гараджаніна дабаўляецца 1 кв. м пад гаражы і аўтастаянкі. Сучаснаму Мінску, напрыклад, для гэтых патрэб неабходна 1,6 млн. кв. м, не гаворачы аб тых гектарах, якія адпускаюцца пад магістралі, вуліцы, праезды.

Ва ўсіх буйнейшых агламерацыях свету назіраецца той факт, што ўсё большую частку тэрыторыі прыгарадных зон займае забудова, якая практычна суцэльнай лентай цягнецца ад цэнтральных гарадоў уздоўж асноўных транспартных камунікацый углыб прыгарадных зон і займае да 30% іх плошчы. Для разгрузкі Мінска, а цяпер ужо і іншых буйнейшых гарадоў рэспублікі, практыкуецца перамяшчэнне ў прыгарады прамысловых і гаспа-

дарчых пабудоў, пад'язных шляхоў, зон адпачынку.

Такім чынам, канцэнтрацыю насельніцтва неабходна разглядаць не толькі ў геаграфічным аспекце, але і ў экалагічным. Адным з найбольш адчувальных уздзеянняў чалавека на навакольнае асяроддзе ў сучасным свеце з'яўляецца ўзросшы расход зямельных рэсурсаў пад несельскагаспадарчыя патрэбы. Складаны працэс размяшчэння насельніцтва не павінен ісці самацёкам, інакш вынікі могуць быць згубныя. Яго неабходна рэгуляваць, не дапускаючы празмернай перагрузкі адных тэрыторый і абязлюджванне другіх.

## 5. ХАРАКТАР РАССЯЛЕННЯ І ГЕАГРАФІЯ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ

### 5.1. СУТНАСЦЬ ПРАЦЭСУ І АГУЛЬНЫЯ РЫСЫ

Паняцце «рассяленне» абазначае тэрытарыяльнае размяшчэнне гарадскіх і сельскіх населеных пунктаў, працэс іх фарміравання і развіцця.

На тэрыторыі Беларусі, плошча якой 207,6 тыс. кв. км, размешчана 211 гарадскіх пасяленняў, у якіх пражывае каля 7 млн. гараджан, і звыш 25 тыс. сельскіх пасяленняў, у якіх пражывае 3,5 млн. сялян.

Экістычныя (рассяленчыя) характарыстыкі на тэрыторыі Беларусі можна ацэньваць як дадатныя. Сетка населеных пунктаў густая. Сярэдняя адлегласць паміж гарадамі менш за 50 км, г. зн. у радыусе гадзіннай транспартнай даступнасці. Сярэдняя адлегласць паміж сельскімі населенымі пунктамі каля 3 км, што таксама аблягчае сувязь паміж імі, калі нават адсутнічаюць транспартныя зносіны. У сярэднім на кожную тысячу кв. км плошчы прыпадае адно гарадское пасяленне (горад ці гарадскі пасёлак), каля 120 сельскіх, якія ў Беларусі маюць назву «вёска» (рыс. 5.1, 5.2). Такія экістычныя ўмовы ў агульным спрыяльныя для развіцця эканамічных, працоўных, культурна-бытавых, гасцявых і дзелавых межпасяленных сувязей, а значыць, для развіцця насельніцтва.

Кожны населены пункт — гэта пярвічная сацыяльна-эканамічная мікрасістэма, якая аб'ядноўвае ў адзінае цэлае тры галоўныя састаўляючыя: пэўную па колькасці групу людзей — жыхароў дадзенага пункта; створаныя




Рыс. 5.1. Характар гарадскога рассялення:
густата гарадскіх пасяленняў на 10 тыс. кв. км: *1*—значная (больш 5), *2*—сярэдняя (4—5), *3*—нязначная (менш 4), *4*—колькасць гарадскіх пасяленняў, у тым ліку гарадоў, 1 см=8 пасяленняў; *5*—сярэдняя адлегласць паміж гарадамі; 1 см=30 км

імі матэрыяльныя элементы (пабудовы і іншыя збудаванні); тэрыторыю, на якой размешчаны гэтыя матэрыяльныя элементы і яе рэсурсы. Пры гэтым набор матэрыяльных элементаў, якія ствараюцца сучасным чалавекам у населеным пункце, увесь час ускладняецца і дапаўняецца. Акрамя жылой сядзібы з гаспадарчымі пабудовамі ці жылога раёна ў гарадах фарміруюцца вялікія вытворчыя зоны з шырокай сеткай розных камунікацый. Іх дапаўняюць элементы сацыяльнай інфраструктуры, якія абслугоўваюць насельніцтва. Прычым гэта рыса ўласціва не толькі для сучасных гарадоў, але і для буйных цэнтраў сельскага рассялення. Змяняецца і набліжаецца да гарадскіх стандартаў аблічча сельскіх пасяленняў, уключаючы добраўпарадкаванне, планіроўку, забудову і нават будаўнічыя матэрыялы.

Кожны населены пункт характарызуецца перш за ўсё колькасцю яго жыхароў і структурай іх заняткаў.

Да ліку сельскіх пасяленняў ва ўмовах Беларусі адносяцца непасрэдна сельскагаспадарчыя пасяленні, большасць жыхароў якіх занята ў сельскай гаспадарцы, а таксама малыя несельскагаспадарчыя ці змешаныя пасёлкі пры станцыях, прыстанях, прамысловых прадпрыемствах, установах адпачынку, аховы здароўя, лясныя, дачныя і іншыя пасёлкі, якія па колькасці жыхароў не адпавядаюць цэнзу гарадскіх.

Гарады — гэта месцы канцэнтрацыі несельскагаспадарчага насельніцтва, буйныя населеныя пункты, цэнтры прамысловай вытворчасці і абслугоўвання ўзаемазвязанай навакольнай тэрыторыі.

У Беларусі, дзе пераважае сетка дробных пасяленняў, прадугледжаны свае мясцовыя крытэрыі для гарадоў. Так, горадам рэспубліканскага і абласнога падначалення можа быць населены пункт, які мае звыш 40 тыс. жыхароў, развітую прамысловасць, камунальную гаспадар-




Рыс. 5.2. Характар сельскага рассялення:

густата сельскіх пасяленняў на 100 кв. км: *1*—найбольшая (звыш 13), *2*—сярэдняя (10—13), *3*—нязначная (менш 10), *4*—колькасць пасяленняў, 1 см=900; *5*—сярэдняя адлегласць паміж населенымі пунктамі, 1 см=5 км

8. Зак. 773

ку, значны дзяржаўны жылы фонд і развітую сетку сферы паслуг. Гарадоў такога рангу ў рэспубліцы налічваецца 37, сярод іх усе абласныя цэнтры, а таксама такія буйныя гарады, як Баранавічы, Пінск, Орша, Полацк, Наваполацк, Мазыр, Калінкавічы, Барысаў, Маладзечна, Салігорск, Бабруйск. Да гэтай жа катэгорыі адносяцца многія невялікія, але важныя прамысловыя цэнтры, як, напрыклад, Крычаў, Асіповічы, Вілейка, Жодзіна, Дзяржынск, Слуцк, Добруш, Жлобін, Рагачоў, Лепель, Кобрын, Лунінец і інш.

Горадам раённага падначалення можа быць населены пункт, які мае не менш 6 тыс. жыхароў (большасць іх занята несельскагаспадарчай дзейнасцю), наяўнасць прамысловых прадпрыемстваў, адпаведны ўзровень сацыяльнай інфраструктуры. Такіх гарадоў у рэспубліцы налічваецца больш за 60, колькасць іх увесь час павялічваецца. Да гэтай катэгорыі акрамя раённых цэнтраў адносяцца такія гарады, як Высокае, Косава, Белаазёрск, Васілевічы, Заслаўе, Скідаль.

Да гарадскіх пасёлкаў адносяцца населеныя пункты, у якіх пражывае не менш 2 тыс. жыхароў, занятых у асноўным несельскагаспадарчай дзейнасцю. Мінімум насельніцтва рабочага пасёлка — 500 чалавек, занятых на прамысловых аб'ектах, будоўлях, транспарце, сферы паслуг. Па такому крытэрыю выдзелены, напрыклад, курортны пасёлак Нарач.

Значыць, ранг горада вызначаецца не толькі колькасцю насельніцтва, але і яго эканамічным значэннем, перспектывамі развіцця. Так, у 1982 г. гарады раённага падначалення Дзяржынск і Горкі былі пераведзены ў ранг гарадоў абласнога падначалення, хоць мелі насельніцтва менш 40 тыс.— 17 і 29 тыс. чалавек адпаведна. Вёска Фаніпаль, дзякуючы развіццю несельскагаспадарчых функцый, дасягнула колькасці насельніцтва больш 5 тыс. чалавек і ў 1984 г. была пераведзена ў ранг гарадскіх пасёлкаў. Па гэтых жа крытэрыях гарадскі пасёлак Заслаўе ў 1985 г. пераведзены ў катэгорыю гарадоў раённага падначалення.

У той жа час сярод сучасных гарадоў ёсць і такія, што не адпавядаюць па колькасці насельніцтва гэтаму рангу і не маюць дастатковай гарадской базы, як, напрыклад, Дзісна (2,5 тыс. чал.), Косава (2,5 тыс.), Васілевічы. І наадварот, многія гарадскія пасёлкі па велічыні ўжо даўно пераступілі граніцы гарадоў, як, напрыклад, Мікашэвічы (13 тыс.), Касцюкоўка (11 тыс.), Бялынічы.

Такім чынам, усе населеныя пункты, размешчаныя на тэрыторыі Беларусі, дзеляцца на наступныя катэгорыі:

*гарадскія пасяленні*

| | |
|---|---|
| гарады з падначаленнем | пасёлкі гарадскога тыпу |
| рэспубліканскім | гарадскія |
| абласным | рабочыя |
| раённым | курортныя |

*сельскія пасяленні*

сельскагаспадарчыя, змешаныя, несельскагаспадарчыя

У 1991 г. налічвалася 211 гарадскіх пасяленняў, сярод іх 99 гарадоў і 112 пасёлкаў гарадскога тыпу; колькасць сельскіх пасяленняў перавышала 20 тысяч. Галоўная асаблівасць сістэмы рассялення ў Беларусі — рэзка выражаная дробнасяленнасць, г. зн. колькасная перавага сярод гарадскіх пасяленняў малых гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, а сярод сельскіх пасяленняў — дробных і драбнейшых вёсак. Аднак трэба адзначыць, што большасць насельніцтва жыве якраз у буйных і сярэдніх гарадах, буйных і сярэдніх сёлах.

Улічваючы сучасную карціну рассялення на тэрыторыі Беларусі, можна прапанаваць наступную класіфікацыю населеных пунктаў па люднасці:

| | *гарадскія пасяленні*, тыс. чалавек | *сельскія пасяленні*, чалавек |
|---|---|---|
| драбнейшыя | менш за 5 | менш за 20 |
| дробныя | ад 5 да 10 | ад 20 да 50 |
| малыя | ад 10 да 20 | ад 50 да 100 |
| паўсярэднія | ад 20 да 50 | ад 100 да 150 |
| сярэднія | ад 50 да 100 | ад 150 да 250 |
| буйныя | ад 100 да 500 | ад 250 да 500 |
| буйнейшыя | ад 500 да 1000 | ад 500 да 1000 |
| гарады-мільянеры | звыш 1 млн. чалавек | |
| вёскі-тысячнікі | | звыш 1 тыс. чалавек |

Развіццё населеных пунктаў, якія склаліся ў розны гістарычны час, у розных прыродных і эканамічных умовах, паступова змяняецца і на сучасным этапе. Гэтыя змены носяць колькасны і якасны характар, маюць дадатныя і адмоўныя вынікі, паддаюцца ўплыву знешніх фактараў і самі ўплываюць на іншыя працэсы, г. зн. з'яўляюцца часткай адзінага цэлага — жыцця грамадства.

Працэс рассялення — катэгорыя гістарычная. Ён мае агульныя заканамернасці, але не выключае і рэгіянальныя асаблівасці ў залежнасці ад канкрэтных умоў.

Асноўны закон рассялення — гэта агульнагістарычны закон адпаведнасці рассялення спосабу вытворчасці і надбудове пры вядучай ролі спосабу вытворчасці. Гэта значыць, што рухаючая сіла развіцця грамадства — спосаб вытворчасці матэрыяльных даброт — вызначае сабой і агульныя напрамкі рассялення людзей.

З аднаго боку, характар вытворчасці, які няспынна развіваецца, мяняе патрабаванні да рассялення (месц, тыпаў, форм), з другога боку, ён жа забяспечвае магчымасці чалавека ва ўдасканаленні свайго рассялення (рэсурсавыя, тэхнічныя, навуковыя). Матэрыяльныя формы рассялення дарагія, устойлівыя і даўгавечныя, таму яны часта як бы адстаюць ад новых патрабаванняў вытворчасці і ўступаюць з ёю ў супярэчнасць. Такой супярэчнай у адносінах да новых умоў калектыўнай гаспадаркі была ў свой час хутарская форма рассялення, для ліквідацыі якой спатрэбілася многа часу і дадатковых затрат. Пазней у такой жа супярэчнасці з новымі патрабаваннямі сацыяльна-культурнага развіцця людзей знаходзіліся дробныя і драбнейшыя пасяленні. І наадварот, гарады-гіганты, зручныя для вытворчасці, перайшоўшы «экалагічныя парогі», уступілі ў супярэчнасць з навакольным асяроддзем. Тыя ці іншыя неадпаведнасці патрабуюць рэгулявання з боку чалавека.

У кожным населеным пункце размяшчаецца галоўная вытворчая сіла — людзі з усімі неабходнымі ім сродкамі вытворчасці. Развіццё і размяшчэнне вытворчасці з'яўляецца першапрычынай узнікнення і развіцця таго ці іншага населенага пункта. Велічыню горада, як і кожнага іншага населенага пункта, вызначае градаўтваральная група насельніцтва, якая ў сваю чаргу залежыць ад гаспадарчай структуры. Градаўтваральную групу фарміруюць тыя працоўныя, якія заняты ў вядучых (прафіліруючых) галінах вытворчасці. У гарадах да іх адносяцца прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, навука; у вёсцы — сельская, лясная гаспадарка.

Прапарцыянальна гэтай асноўнай групе фарміруецца другая група насельніцтва — градаабслугоўваючая. У яе ўваходзяць тыя працоўныя, якія заняты ў сферы абслугоўвання як самой сістэмы вытворчасці, так і усяго насельніцтва.

На аснове двух першых груп пастунова ствараецца

трэцяя група. Яе называюць несамадзейная — гэта члены сямей першай і другой груп (дзеці, пенсіянеры, навучэнцы, хатнія гаспадыні).

Гэтыя тры групы насельніцтва знаходзяцца ў адпаведнай прапорцыі і вызначаюць агульную колькасць жыхароў таго ці іншага населенага пункта. Напрыклад, калі 100 чалавек будзе занята ў прамысловасці, то яшчэ прыкладна 50—60 челавек будуць працаваць на транспарце, у будаўніцтве, сувязі; 15—20 чалавек — у сістэме кіравання, навуковага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння вытворчасці; не менш 50—60 чалавек будуць працаваць у розных галінах абслугоўвання (гандаль, грамадскае харчаванне, ахова здароўя, асвета, культура, бытавыя паслугі і інш.). Такім чынам, агульная колькасць занятых складзе каля 250 чалавек. Як правіла, гэта палавіна ўсяго насельніцтва горада, а градаўтваральная група складае 30—40%. Ведаючы велічыню градаўтваральнай групы, можна вылічыць агульную колькасць насельніцтва на перспектыву.

З улікам гэтых прапорцый магчыма прадугледзець на перспектыву, як будзе мяняцца колькасць насельніцтва горада пры адпаведным павелічэнні ці змяншэнні градаўтваральнай групы.

Характар вытворчасці вызначае люднасць населеных пунктаў, іх функцыянальны профіль, ускладняе яго і насычае новымі відамі дзейнасці. Па меры развіцця вытворчасці ў гаспадарчы абарот уцягваюцца ўсё новыя рэсурсы, узнікаюць новыя ачагі рассялення. На тэрыторыі Беларусі гэта такія новыя гарадскія пасяленні, як Салігорск, Наваполацк, новыя пасёлкі на меліяраваных землях Палесся.

Тэхнізацыя працы і быту робіць рассяленне людзей больш свабодным у адносінах да прыроднага асяроддзя, выбару месца працы і жыхарства, дазваляе паляпшаць знешні выгляд населеных пунктаў, іх планіроўку, забудову, добраўпарадкаванне.

З развіццём вытворчасці, у тым ліку транспарту, паляпшаецца эканоміка-геаграфічнае месцазнаходжанне населеных пунктаў. Напрыклад, чым гусцей сетка гарадоў, тым выгадней месцазнаходжанне навакольных сельскіх пасяленняў; чым больш транспартных шляхоў, тым больш даступныя сувязі паміж населенымі пунктамі; дзякуючы чаму адбываецца іх узаемаўзбагачэнне праз абмен працоўнымі, эканамічнымі, прыроднымі, сацыяльна-культурнымі, інфармацыйнымі і іншымі рэсурсамі.

Прыроднае асяроддзе у адносінах да рассялення людзей выступае як неабходная натуральная ўмова іх існавання, ствараючы лепшыя ці горшыя магчымасці для жыццядзейнасці чалавека ў розных раёнах і даючы для яго гаспадарчай дзейнасці тыя або іншыя рэсурсы.

Прыроднае асяроддзе Беларускага рэгіёну ў цэлым спрыяльнае для рассялення людзей, яно дае неабходныя для чалавека рэсурсы: зямельныя, водныя, лясныя, мінеральна-сыравінныя, лячэбна-аздараўленчыя, рэкрэацыйныя. Разам з тым асобныя кампаненты прыродных умоў ускладнілі працэс рассялення, прымусілі чалавека прыстасоўвацца да іх, хоць з гаспадарчых пазіцый яму гэта нявыгадна. Напрыклад, перасечанасць рэльефу, мноства азёр, рэк, забалочанасць, лясістасць абумовілі дробнаконтурнасць сельгасугоддзяў, што выклікала на тэрыторыі многіх раёнаў, у першую чаргу Беларускага Паазер'я, фарміраванне вялікай колькасці дробных і драбнейшых вёсак. Асаблівыя формы рассялення створаны у палескай зоне. З прыроднымі ўмовамі (рэльеф, грунты, клімат, водныя запасы і інш.) вымушаны заўсёды лічыцца чалавек пры выбары пляцовак для будаўніцтва розных аб'ектаў, жылых і гаспадарчых; яны выяўляюцца ў планіроўцы населеных пунктаў, іх знешнім выглядзе. Пры неабходнасці можна прыстасавацца і да горшых прыродных умоў, але для гэтага спатрэбяцца дадатковыя затраты працы і сродкаў.

Рэгіянальныя адрозненні ў рассяленні, якія праяўляюцца ў люднасці, шчыльнасці пасяленняў, іх планіровачнай структуры, якраз і звязаны з прыроднымі асаблівасцямі той або іншай мясцовасці.

На рыс. 5.2 і 5.3 паказаны рэгіянальныя рысы ў сельскім рассяленні на тэрыторыі Беларусі. Нават у межах такой параўнальна невялікай тэрыторыі яны бачны ў велічыні пасяленняў і іх шчыльнасці. Дробнасяленны тып найбольш выяўлены на паўночным захадзе рэспублікі. Паступова ён змяняецца сярэднесяленным у цэнтральнай зоне і завяршаецца буйнасяленным у паўднёвай, палескай зоне. Парушаюць гэту карціну толькі арэалы аграіндустрыяльных прыгарадных зон, якія сфарміравалі свой рысунак рассялення, больш канцэнтраванага, ушчыльненага.

У характары рассялення выяўляецца таксама гістарычная спадчына. Пераемнасць многіх форм — гэта адна з заканамернасцей рассялення. Яна звязана з нацыянальнымі традыцыямі, формамі, навыкамі, прывычкамі,




Рыс. 5.3. Тыпы тэрытарыяльных сістэм па людпасці сельскіх пасяленняў:

*1*—буйнасяленныя; *2*—пераходныя да буйнасяленных; *3*—сярэднесяленныя; *4*—мелкасяленныя; *5*—сярэдняя людпасць населеных пунктаў, чалавек

прыёмамі вядзення гаспадаркі і будаўніцтва населеных пунктаў. Напрыклад, ссяленне дробных вёсак у буйныя, цэнтральныя сядзібы калгасаў і саўгасаў у многіх выпадках не ажыццявілася з-за адмаўлення людзей перасяліцца, паколькі яны прывыклі да ізаляванага складу жыцця; ім больш падабаюцца індывідуальныя формы гаспадарання. Або, напрыклад, традыцыі і неабходнасць весці асабістую падсобную гаспадарку выклікалі адказ сельскіх жыхароў ад шматпавярховых забудоў, хоць і больш прагрэсіўных, добраўпарадкаваных.

На пытанне анкеты, якому тыпу забудовы яны аддаюць перавагу, адказы сельскіх жыхароў былі самыя розныя. Сельская інтэлігенцыя, якая прайшла адаптацыю ў гарадах, аддае перавагу шматпавярховым, добраўпарадкаваным дамам і адмаўляецца ад падсобнай гаспадаркі. Карэнныя сельскія маладыя сем'і жадаюць мець добраўпарадкаваныя аднапавярховыя катэджы з неаб-

ходнымі пабудовамі для падсобнай гаспадаркі. А старыя сельскія сем'і задавальняе стары тып забудовы, іх запатрабаванні мінімальныя. Значыць, сучаснае будаўніцтва на вёсцы неабходна весці з улікам сацыяльнага складу насельніцтва, структуры сямей, умоў вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі.

На карце раяніравання сельскага рассялення СССР, якая была складзена яшчэ ў 60-я гг. пад кіраўніцтвам вядучага вучонага ў гэтай галіне С. А. Кавалёва, уся тэрыторыя Беларусі ўключана ў тып III — рассяленне ў паласе выбарачнага земляробчага асваення лясной зоны, дробна- і сярэднесяленнае, якое групуецца ў малыя і буйныя заселеныя арэалы і цягнецца шырокай паласой ад Прыбалтыкі і Палесся да Урала. Рассяленне ў паўночнай частцы рэспублікі на гэтай карце аднесена да падтыпу Пскоўска-Віцебскаму, найбольш дробнасяленнаму, з малымі арэаламі засялення. Уся цэнтральная частка выдзелена ў асобы Мінскі падтып, дробна- і сярэднесяленны, а паўднёвая частка з працягам на Украінскім Палессі вызначана як Палескі падраён, сярэдне- і буйнасяленны, з рэдкай сеткай пасёлкаў.

Гэтыя ж прыкладна зоны вызначаны і беларускім даследчыкам Л. І. Спіжанковым, толькі з некаторым удакладненнем межаў.

Рассяленне ў сваю чаргу выступае як асаблівы сацыяльна-эканамічны фактар, як сацыяльна-эканамічнае асяроддзе, якое ўздзейнічае і на вытворчасць, і на чалавека, і на навакольную прыроду.

*Сацыяльнае* значэнне розных тыпаў і форм рассялення выяўляецца праз умовы жыцця, працы і быту людзей. Напрыклад, розныя па велічыні і функцыі населеныя пункты маюць адрозненні ў структуры насельніцтва і характары яго заняткаў, па-рознаму фарміруюць працоўныя рэсурсы, валодаюць розным працоўным патэнцыялам і нават рознымі магчымасцямі для будучага развіцця.

З характарам рассялення звязаны ўмовы развіцця і размяшчэння сацыяльнай інфраструктуры, магчымасці транспартнага абслугоўвання. Так, у буйных сельскіх пасяленнях можна з меншымі затратамі стварыць практычна поўны набор аб'ектаў паўсядзённага і перыядычнага абслугоўвання. Такія вёскі па добраўпарадкаванню можна давесці да гарадскіх стандартаў. Невялікія вёскі могуць разлічваць толькі на асобныя элементы паслуг, або застаюцца без іх. У гэтых адносінах найбольш са-

цыяльна ўшчэмлены жыхары тых раёнаў, дзе пераважаюць такія пасяленні. Напрыклад, у дробнасяленных раёнах Беларусі (Браслаўскім, Міёрскім, Пастаўскім, Глыбоцкім) пры малой колькасці насельніцтва пасяленчая нагрузка на самыя неабходныя аб'екты культурна-бытавога абслугоўвання празмерная. На адну бальніцу прыпадае ад 70 да 100 вёсак; у кожную сярэднюю школу вучні дабіраюцца з 10—20 вёсак; на адно гарадское пасяленне прыпадае больш 200 сельскіх. Такая нагрузка патрабуе добрай транспартнай даступнасці, але прыпынак грамадскага транспарту ў такіх раёнах мае толькі 1/3 вёсак, астатнія аддалены ад транспартных магістралей на 3,5 і больш кіламетраў.

Значыць, у дробнасяленных раёнах абслугоўванне культурна-бытавых патрэб насельніцтва абыходзіцца дзяржаве і жыхарам даражэй і па якасці яно горшае. Чым горшыя магчымасці для сацыяльнага развіцця ў населенага пункта, тым інтэнсіўней ідзе адток насельніцтва. У той жа час стварыць нармальныя сацыяльна-культурныя ўмовы ў кожным малым пасяленні нявыгадна і практычна немагчыма.

Характар рассялення ўплывае на сацыяльнае развіццё і ў іншым плане. Ён можа садзейнічаць з'яднанню, узаемаўзбагачэнню, выхаванню, ці, наадварот, раз'ядноўваць людзей. Напрыклад, жыхарам цэнтральных сядзіб калгасаў і саўгасаў паўсядзённа даступныя і клуб, і кіно, і бібліятэка, і спортзал, для іх ёсць камбінат бытавых паслуг, некалькі магазінаў. Прычым усё гэта абсталявана, як правіла, не горш, чым у гарадах. Пасёлкі заасфальтаваны, аснашчаны водаправодам, гігіенічны стан іх добры, знешні выгляд прыемны. Усё гэта іграе важную ролю ў жыцці чалавека, спрыяе яго здароўю і працаздольнасці. Вялікія, добра абсталяваныя школы даступны дзецям у любое надвор'е і могуць забяспечыць навучанне на высокім узроўні. Малышы наведваюць яслі-сад, іх маці спакойна працуюць. Жыхары такой вёскі, ад дзяцей да дарослых, маюць магчымасць усебаковага развіцця. Камунальнае добраўпарадкаванне эканоміць час для кожнай сям'і (на нарыхтоўку паліва, водазабеспячэння, бытавыя работы), у выніку яна мае больш свабоднага часу і можа выкарыстоўваць яго для адпачынку, павышэння кваліфікацыі. Усяго гэтага не маюць жыхары малой вёскі, яны пазбаўлены сацыяльных даброт. Асабліва гэта адбіваецца на дзецях, якіх фактычна ніхто не выхоўвае, за якімі няма нагляду, бо яслі-сад ім недаступныя, у

школу яны ходзяць ужо з першага класа за 3—5 км, на дамашнюю падрыхтоўку да ўрокаў часу амаль не застаецца. Значыць, умовы існавання дзяцей тут адносна горшыя. У такіх адарваных, ізаляваных пасяленнях не выкараняюцца розныя перажыткі, сацыяльныя заганы, паколькі людзі не адчуваюць знешняга ўздзеяння, якое мае вялікае выхаваўчае значэнне. Яны вымушаны многа часу траціць на вядзенне сваёй асабістай падсобнай гаспадаркі, на дарогу да месца работы (як правіла, у цэнтр гаспадаркі), вольнага часу яны практычна не маюць, што прыводзіць да непажаданых сацыяльных вынікаў.

Абследаванні, праведзеныя ў розных раёнах Беларусі, паказалі, што адзначаная вышэй дыферэнцыяцыя існуе незалежна ад таго, багатая гэта гаспадарка ці адстаючая. Адрозненне можна ўбачыць толькі па цэнтральных пасёлках, у дробных жа вёсках становішча ўсюды аднолькавае. У гэтым выяўляецца рассяленчы аспект сацыяльнай несправядлівасці.

З мэтай паляпшэння ўмоў жыцця насельніцтва ставіцца задача наблізіць неабходныя культурна-бытавыя паслугі да кожнага населенага пункта. Гэта набліжэнне можа быць дасягнута двума шляхамі. Адзін шлях — паслуга па месцу жыхарства, г. зн. адраджэнне малакамплектных пачатковых школ, ясляў, садоў, стварэнне разгалінаванай, слабааснашчанай дробнай сеткі ФАПаў, бальніц, магазінаў, клубаў і г. д. Другі шлях — паслуга дастаўляецца спажыўцу ці спажывец да паслугі з дапамогай транспартных сродкаў. Але для гэтага патрэбна будаўніцтва дарог з цвёрдым пакрыццём. Каб транспарт функцыяніраваў круглы год, неабходна маса дадатковых транспартных сродкаў і рабочай сілы. І той, і іншы шлях патрабуюць вялікіх затрат працоўных, фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў. І такія тэрыторыі аказаліся ў цяжкім становішчы, паколькі яны не маюць у запасе ні працоўных, ні матэрыяльных рэсурсаў.

Праблему можна вырашыць толькі на рэспубліканскім узроўні, г. зн. шляхам пераразмеркавання капітальных укладанняў. Напрыклад, у паўднёвай, буйнасяленнай зоне, дзе ўжо цяпер амаль кожны населены пункт мае неабходны набор паслуг і добра забяспечаны транспартам, расходы на сацыяльнае развіццё вёскі адносна меншыя. Гэта ж адносіцца і да прыгарадных зон. За кошт іх можна пераразмеркаваць сродкі ў малазабяспечаныя раёны.

*Эканамічны* аспект рассялення выяўляецца ў экана-

мічнай эфектыўнасці гаспадарчай дзейнасці і матэрыяльным становішчы насельніцтва. Сістэма рассялення можа садзейнічаць ці, наадварот, стрымліваць, пагаршаць эканамічнае развіццё, выклікаць дадатковыя затраты. Напрыклад, лягчэй і танней стварыць новую вытворчасць у стараабжытых раёнах, чым у незаселеных, у буйных гарадах, чым у малых. Характар сельскага рассялення пры калектыўнай арганізацыі вытворчасці ўплывае на эканоміку калгасаў, пры індывідуальнай — на дабрабыт сялян.

Ва ўмовах Беларусі, дзе дамінуе калгасная форма арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, у лепшым становішчы знаходзяцца тыя гаспадаркі, якія створаны на землях 2—5 буйных вёсак. Тут меншыя страты часу на арганізацыю працы, эканомяцца сродкі на ўтрыманне кіраўніцкага апарата, меншыя расходы на вытворчую і сацыяльную інфраструктуру. Аднак такіх гаспадарак у Беларусі вельмі мала — менш 10%. Асноўная маса гаспадарак складаецца з 5—10 вёсак, больш 500 гаспадарак маюць на сваёй тэрыторыі ад 10 да 30, а некаторыя — да 50 невялічкіх вёсак па 15—20 двароў. Пры такім унутрыгаспадарчым рассяленні вялікія плошчы зямельных рэсурсаў выкарыстоўваюцца нерацыянальна (шматлікія праезды, дарогі, сцежкі, забудовы). Здрабняюцца ворныя ўчасткі, ускладняецца іх механізаваная апрацоўка, павялічваюцца затраты ручной працы. У выніку такія гаспадаркі знаходзяцца ў адносна горшых умовах і маюць ніжэйшы ўзровень эфектыўнасці вытворчасці. На такіх тэрыторыях больш падыходзіць індывідуальная форма гаспадарчай дзейнасці.

*Экалагічная* абстаноўка ў зонах уплыву сельскіх пасяленняў патрабуе такога ж вывучэння і кантролю, як і ў гарадах. Напрыклад, асобныя дробныя прадпрыемствы, параскіданыя ў сельскай мясцовасці, даюць выкіды ў атмасферу большыя, чым прамысловыя гіганты, паколькі яны не маюць элементарных ачысных збудаванняў. Аб'ём выхлапных газаў ад транспарту і сельскагаспадарчай тэхнікі ўсё ўзрастае, але ў адрозненне ад гарадоў не кантралюецца адмысловымі службамі. Гэтыя і многія іншыя прыклады гавораць аб тым, што на сучасным этапе экалагічныя праблемы актуальны аднолькава і ў гарадах, і ў сельскай мясцовасці. Востра наспела неабходнасць экалагічнага выхавання гараджан і сялян. Экалагічна неадукаваны жыхар сельскай мясцовасці, як і гараджанін, можа не толькі нанесці шкоду прыроднаму

асяроддзю, але і паставіць пад небяспеку сваё жыццё.

Такім чынам, фарміраванне і развіццё населеных пунктаў — працэс вельмі шматгранны, ён патрабуе пастаяннага ўдасканалення з улікам мясцовых асаблівасцей і агульных заканамернасцей.

### 5.2. ТЭНДЭНЦЫІ ДЫНАМІКІ РАССЯЛЕННЯ

Змены ў рассяленні на тэрыторыі Беларусі носяць тэрытарыяльны і структурны характар.

Тэрытарыяльны аспект дынамікі рассялення выяўляецца ў развіцці працэсу ўшыр і ўглыб. Ушыр — гэта значыць утварэнне новых населеных пунктаў, засяленне новых тэрыторый, змены ў тэрытарыяльнай арганізацыі населеных пунктаў стараабжытых раёнаў. Углыб — гэта значыць канцэнтрацыя насельніцтва ў найбольш развітых і буйных населеных пунктах, палярызацыя яго вакол апорных цэнтраў рассялення.

Структурны аспект дынамікі рассялення — гэта пераход структуры пасяленчай сеткі ад менш складанай, аднароднай да больш складанай, дыферэнцыраванай, удасканаленай. Гэта змены ў суадносінах гарадскіх і сельскіх форм, структурныя зрухі ў людпасці населеных пунктаў, іх функцыях, планіроўцы і забудове.

У Беларусі, нягледзячы на цяжкасці, негатыўныя вынікі розных аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, у тэрытарыяльнай арганізацыі населеных пунктаў, узроўні іх сацыяльна-эканамічнага развіцця адбыліся вялікія змены. З аграрнай, сельскай, вясковай Беларусь ператварылася ў індустрыяльную, урбанізаваную краіну. У пачатку XX стагоддзя на яе тэрыторыі толькі 3 жыхары з 20 вялі гарадскі спосаб жыцця, у сучасны момант — 7 з 10. Рэспубліка ў многім пераадолела тыя дыспрапорцыі, якія былі ў размяшчэнні гарадскога насельніцтва і прамысловага патэнцыялу і выяўляліся ў празмернай іх канцэнтрацыі ў Мінску і абласных гарадах.

Найбольш істотныя пераўтварэнні ў геаграфіі населеных пунктаў адбыліся ў раёнах першачарговага развіцця перыферыйнай зоны. Перш за ўсё гэта цэнтральныя раёны Палесся. Беларускае Палессе ахоплівае тэрыторыю 29 адміністрацыйных раёнаў Брэсцкай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, плошчай каля 60 тыс. кв. км — 1/3 тэрыторыі рэспублікі. На гэтай тэрыторыі да чарнобыльскай аварыі пражывала больш за 2 млн. чалавек. У зоне Палесся сканцэнтраваны асноўныя

мінеральна-сыравінныя рэсурсы Беларусі: калійныя і каменныя солі, нафта, вугаль, гаручыя сланцы, мінеральныя будаўнічыя матэрыялы і інш.

На базе асваення гэтых рэсурсаў сталі фарміравацца такія галіны гаспадаркі, як нафтаздабываючая і нафтаапрацоўчая, вытворчасць мінеральных угнаенняў, будаўнічых матэрыялаў, хімічная прамысловасць. Мінеральныя рэсурсы ў дадзенай зоне залягаюць у выглядзе тэрытарыяльных спалучэнняў, што садзейнічала фарміраванню прамысловых комплексаў, а на іх базе групавых форм рассялення. У цэлым зона Палесся да чарнобыльскай аварыі была самай дынамічнай у гаспадарчых адносінах. Таму сетка населеных пунктаў тут падвяргалася інтэнсіўнаму пераўтварэнню: фарміраваліся новыя цэнтры гаспадарак на меліяраваных землях, новыя сістэмы рассялення вакол хутка растучых гарадоў і тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў. Развіццю ўрбанізацыі садзейнічалі значныя рэзервы сельскага насельніцтва, якім вызначаўся гэты рэгіён. У 1989 г. у межах Гомельскай і Брэсцкай абласцей налічвалася 63 гарадскія пасяленні, у тым ліку 8 з 22 буйнейшых гарадоў рэспублікі.

Сельскае рассяленне ў гэтай зоне мае рад адметных асаблівасцей. Тут самая вялікая ў рэспубліцы люднасць сельскіх пасяленняў (360 чалавек у сярэднім), найменшая іх густата. Паколькі пасяленні буйныя, то практычна ўсе яны забяспечаны неабходным комплексам элементаў культурна-бытавога абслугоўвання, г. зн. жыхары могуць карыстацца ім непасрэдна па месцу жыхарства. У паўночнай Беларусі такія магчымасці мае менш палавіны населеных пунктаў. Паўднёвыя раёны лепш забяспечаны працоўнымі рэсурсамі, тут больш занятых у сельскай гаспадарцы, крыху вышэйшы натуральны прырост насельніцтва.

Аднак іменна гэта зона ўяўляе сабой найбольш успрымальную тэрыторыю ў экалагічных адносінах, што асабліва адчуваецца пасля чарнобыльскай аварыі, цяжкія вынікі якой абрушыліся якраз на гэтую тэрыторыю.

Другая зона актыўнага гаспадарчага развіцця — заходнія раёны Беларусі. Тут таксама адбываюцца істотныя зрухі ў размяшчэнні вытворчасці і насельніцтва. Змены ў рассяленні ідуць галоўным чынам углыб, за кошт структурных пераўтварэнняў. У перспектыве ў гэтай зоне сфарміруюцца больш выразна такія сістэмы рассялення, як Глыбоцка-Пастаўская, Лідская, Ваўкавыская, Маладзечанская.

Нягледзячы на прамысловыя зрухі, Беларусь застаецца буйным сельскагаспадарчым раёнам і выконвае важную ролю ў рашэнні праблем харчовага забеспячэння. У сувязі з гэтым населеныя пункты рознага рангу выконваюць свае канкрэтныя задачы гаспадарчай дзейнасці, узаемазвязанай на аснове вядучых галін сельскай гаспадаркі. Так, сельскія пасяленні выконваюць функцыі вытворчасці харчовых сыравінных рэсурсаў. Наступнае звяно — малыя гарады. Іх функцыі — нарыхтоўка, захоўванне і перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны, выкананне меліярацыйных, будаўнічых, транспартных, рамонтных і іншых работ для сельскіх пасяленняў. Функцыі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння (тэхнікай, хімікатамі, энергіяй, палівам, навуковымі і праектнымі распрацоўкамі), а таксама падрыхтоўкі кадраў для сельскай мясцовасці выконваюць у асноўным буйныя гарады.

Такім чынам, складаны аграпрамысловы комплекс ахоплівае ўсе формы пасяленняў і мае разгалінаваную сістэму прамых і адваротных сувязей, якія садзейнічаюць узмацненню сістэмаўтвараючых працэсаў у рассяленні. Як бы да гэтага ні адносіліся, факт застаецца рэальнасцю, як новая рыса дынамікі рассялення ў XX стагоддзі.

Тэрытарыяльная сістэма рассялення (ТСР) — гэта сукупнасць функцыянальна ўзаемазвязаных пасяленняў на пэўнай тэрыторыі, для якіх характэрны актыўныя сацыяльна-эканамічныя сувязі. Наяўнасць сістэмы рассялення можна ўстанавіць па раду прыкмет. Адной з іх з'яўляецца наяўнасць ядра — галоўнага, апорнага населенага пункта, да якога імкнуцца ўсе навакольныя пасяленні. Другая прыкмета сістэмы і важнейшая ўмова яе фарміравання — цесныя сувязі паміж гэтым цэнтрам і яго акружэннем (вытворчыя, культурна-бытавыя, працоўныя). Трэцяя прыкмета сістэмы рассялення — агульнасць выкарыстання ўсіх відаў інфраструктуры, рэсурсаў, транспартнай сеткі. Сістэмнасць у рассяленні выяўляецца ва ўсіх развітых краінах, гэты працэс не залежыць ад форм уласнасці. Ён заснаваны на сацыяльна-эканамічных сувязях, і чым больш развіта краіна, тым больш выражаны гэтыя сувязі. Напрыклад, у фермераў ЗША ёсць таксама свае «апорныя цэнтры», куды яны рэгулярна збіраюцца, каб сумесна вырашыць свае праблемы, абмяняцца вопытам, інфармацыяй, прадукцыяй і нават разам правесці свой вольны час. Гэта форма сістэмы на мікраўзроўні, накшталт нашага сельсавета.

Развіццё сацыяльна-эканамічных сувязей неабходна падтрымліваць, удасканальваць, а не тармазіць гэты працэс, што часта і праяўляецца ва ўмовах нашай рэспубліцы, калі нават ігнаруюцца распрацоўкі ў гэтым плане вядучага навуковага і праектнага цэнтра — БелНДІПгорадабудаўніцтва.

У якасці адметнай рысы сучаснай дынамікі рассялення неабходна адзначыць узмацненне дыферэнцыяцыі ў сістэме населеных пунктаў, як гарадскіх, так і сельскіх. Калі ў пачатку стагоддзя ўсе гарадскія пасяленні на тэрыторыі Беларусі былі ў асноўным малымі, яны адрозніваліся паміж сабой нязначна. А сучасны горад-мільянер і малы гарадскі пасёлак толькі чыста фармальна пад аднай «гарадской страхой» — у назве «гарадскія пасяленні». Па ўнутранаму зместу яны дасягнулі непараўнальных кантрастаў. Так, на фоне Мінска, Гомеля ці Віцебска іх сабраты па прыналежнасці да той жа гарадской формы рассялення, такія малыя гарады, як Косава, Дзісна, Сянно і іншыя, здаюцца проста «вялікімі вёскамі». Такія ж кантрасты і ва ўмовах жыцця гараджан.

Характар сельскага рассялення змяняецца параўнальна павольна, але і ён перажывае відавочныя зрухі. З аднаго боку, адбываецца канцэнтрацыя насельніцтва ў цэнтральных пасёлках калгасаў, саўгасаў, сельсаветаў, у прыгарадных вёсках, а з другога боку, усё больш выразна ідзе працэс здрабнення большасці сельскіх пасяленняў, пераход іх у групу з меншай люднасцю. За мінулыя 20 гадоў амаль кожнае трэцяе пасяленне перайшло ў групу з меншай люднасцю, а ўзбуйнілася толькі 2%, астатнія засталіся без змен у люднасці. Доля дробных і драбнейшых вёсак павялічылася да 35% у паўднёвых і 75% у паўночных раёнах рэспублікі. Як ужо адзначалася, гэта выклікана двума працэсамі: няспынным міграцыйным адтокам і ахапіўшым абсалютную большасць вёсак натуральным змяншэннем. Гэта з'ява ўласціва не толькі для Беларусі. Яна назіраецца ў сельскіх пасяленнях практычна ўсіх высокаразвітых краін.

Пры гэтым варта адзначыць, што працэс змяншэння люднасці закранае якраз і без таго самыя малыя пасяленні. Напрыклад, у Віцебскай вобласці палавіна малых вёсак (ад 50 да 100 чалавек) перайшла ў групу драбнейшых (менш за 50 чалавек), у той час як сярод самых вялікіх паменшылі люднасць толькі 10%.

Найбольш стабільнымі па велічыні аказаліся апорныя цэнтры мясцовых сістэм рассялення, са змешанымі

аграрна-індустрыяльнымі функцыямі, з развітай тэхнічнай базай і сацыяльнай інфраструктурай. Больш жыццяздольнымі аказаліся тыя вёскі, якія маюць выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча (на транспартных магістралях, у прыгараднай зоне, зонах адпачынку і г. д.).

Сярод вёсак сярэдняй велічыні (ад 100 да 500 чалавек), у якіх пражывае палавіна сялян Беларусі, адны ўскладняюць свае функцыі за кошт новых відаў вытворчасці, паляпшаюць сваё транспартнае становішча і гэтым самым узмацняюць свой жыццёвы патэнцыял. Іншыя пасяленні гэтага ж класа застаюцца з монакультурным аграрным профілем, эканамічна бедныя, аддаленыя ад транспартных магістралей, таму перажываюць стадыю дэпрэсіі. Узнаўленне іх сіл залежыць ад сучаснай аграрнай палітыкі размеркавання капітальных укладанняў.

Невялікая частка сельскіх пасяленняў развіваецца па несельскагаспадарчаму шляху, паступова стварае ўрбанізаванае асяроддзе і ў будучым прэтэндуе перайсці ў ранг гарадскіх пасяленняў.

Такім чынам, шматтысячная сетка сельскіх населеных пунктаў далёка не аднародная. Кожны тып мае свае шляхі развіцця, свае праблемы і рэсурсныя магчымасці для падтрымання жыццядзейнасці. Нават маленькія вёскі захоўваюць свой жыццёвы патэнцыял, калі там жыве хоць адна сям'я.

У сістэме рассялення на тэрыторыі Беларусі адбываюцца і непрадбачаныя зрухі, зусім нежаданыя, негатыўныя. Іх выклікала чарнобыльская бяда. Аб гэтым больш падрабязна гл. раздзел 6.

### 5.3. УПЛЫЎ РЭГІЯНАЛЬНЫХ ФАКТАРАЎ НА ПРАЦЭС РАССЯЛЕННЯ

Рэспубліка Беларусь адносіцца да ліку індустрыяльна-аграрных раёнаў з адносна высокай канцэнтрацыяй насельніцтва і густой сеткай населеных пунктаў.

*Эканоміка-геаграфічнае становішча* рэспублікі садзейнічае развіццю міжраённых і міжнародных сувязей, аказвае ўплыў на тэрытарыяльную арганізацыю гаспадарчага комплексу і сістэмы населеных месц. Праз рэспубліку праходзіць самы кароткі шлях з цэнтральных раёнаў Расіі ў краіны Еўропы, што спрыяе эканамічнаму развіццю Беларусі. Блізкасць да краін Еўропы садзейнічае ўдзелу рэспублікі ў эканамічнай інтэграцыі. Рад яе прадпрыемстваў часткова працуе на імпартнай сыравіне

або атрымлівае вузлы і дэталі ад спецыялізаваных прадпрыемстваў замежных краін. У той жа час многія беларускія прадпрыемствы працуюць на экспарт, пачалі ствараць сумесныя прадпрыемствы, гандлёвыя біржы і г. д. Праз Беларусь таксама ідуць шматлікія турысцкія патокі з-за мяжы. Абслугоўванне замежных і саюзных турыстаў стала адной з новых галін эканомікі.

Блізкасць да такіх высокаразвітых рэгіёнаў, як Прыбалтыка, Цэнтральны і Паўночна-Заходні раёны Расіі, Данецка-Прыдняпроўскі раён Украіны, да Масквы і Санкт-Пецярбурга дазволіла стварыць на тэрыторыі рэспублікі буйны матэрыяльна-тэхнічны і навукова-вытворчы патэнцыял, дасягнуць высокіх вынікаў у многіх галінах ведаў, тэхнікі, эканомікі. Дзякуючы гэтаму, рэспубліка спецыялізуецца на шэрагу даволі складаных і дакладных унікальных вырабаў у машынабудаванні, электроніцы, радыётэхніцы, хімічнай прамысловасці. Рэалізаваны многія дасягненні перадавой навуковай думкі ў галіне горадабудаўніцтва, раённай планіроўкі, арганізацыі прамысловых вузлоў і тэрытарыяльна-прамысловых комплексаў, у развіцці сельскага рассялення, рэгуляванні росту гарадоў і г. д.

Беларусь мае цесныя эканамічныя сувязі па лініі паставак сыравіны, паліва, энергіі, па збыту многіх вырабаў прамысловасці і прадукцыі сельскай гаспадаркі. Выгаднае эканоміка-геаграфічнае становішча садзейнічала таму, што ў новай Садружнасці Незалежных Дзяржаў Беларусь выбрана ў якасці цэнтра па каардынацыі міждзяржаўных сувязей. Цэнтральнае геаграфічнае становішча займае рэспубліка і ў адносінах да ўсяго Еўрапейскага кантынента, што вельмі важна для развіцця розных форм сувязей з замежнымі краінамі ў будучым.

Тэрыторыя Беларусі кампактная, раўнінная, што аблягчае развіццё ўнутраных шляхоў зносін і актыўных унутраных сувязей. Аснову структуры рассялення фарміруе сістэма планіровачных ліній і цэнтраў, якія гістарычна склаліся ўздоўж важнейшых транспартных камунікацый міжрэгіянальнага значэння: Масква—Мінск—Брэст—Варшава; Рыга—Вільнюс — Мінск — Гомель—Кіеў; Санкт-Пецярбург—Віцебск—Магілёў — Гомель—Кіеў; Варшава—Брэст—Гомель—Масква; Масква—Мінск—Гродна; Рыга—Віцебск—Масква. Гэтыя планіровачныя восі супадаюць з далінамі буйнейшых рэк: Дняпра, Заходняй Дзвіны, Прыпяці, Нёмана. На перасячэннях галоўных планіровачных ліній размешчана сталіца рэс-

публікі і ўсе астатнія буйнейшыя гарады. Гэтыя планіровачныя восі разам з гарадамі ўтвараюць каркас рассялення.

Прыродныя ўмовы і рэсурсы рэспублікі таксама спрыяюць жыццядзейнасці насельніцтва і развіццю населеных пунктаў (значныя залежы многіх карысных выкапняў, забяспечанасць ляснымі і воднымі рэсурсамі, спрыяльныя глебава-кліматычныя ўмовы).

У той жа час пры вызначэнні перспектыў далейшага развіцця гарадскіх і сельскіх пасяленняў неабходна мець на ўвазе, што ва ўмовах рэспублікі дзейнічаюць і такія фактары, якія ўскладняюць развіццё сістэмы рассялення.

Сярод вызначальных асаблівасцей, якія ўскладняюць развіццё сувязей і ў цэлым народнагаспадарчага комплексу, трэба адзначыць некаторыя рысы *планіровачнай структуры*. Першая — гэта эксцэнтрычнае становішча ўсіх абласных цэнтраў, акрамя Мінска, у адносінах да сваіх тэрыторый. Таму большая частка насельніцтва знаходзіцца за межамі сярэдняй транспартнай даступнасці ад горада-цэнтра, што ўскладняе кіраванне народнай гаспадаркай, ударажае транспартныя сувязі, стварае кантрастнасць узроўня абслугоўвання і даступнасці паслуг.

Другая рыса заключаецца ў тым, што вакол Мінска ў радыусе да 150 км не было дастаткова развітых прамысловых цэнтраў, што абмяжоўвала магчымасці стварэння агламерацыі і рэгулявання росту сталіцы. Таму арганізацыя сістэмы рассялення заснавана на вылучэнні дзвюх зон — субрэгіянальнай, якая фарміруецца на базе сталіцы з прыцягваемымі гарадамі, і перыферыйнай.

Субрэгіянальная зона ахоплівае тэрыторыю ў радыусе да 120—180 км вакол Мінска, у межах якой развіваюцца актыўныя сувязі непасрэдна з цэнтрам рэгіёну. У межах гэтай зоны забяспечваецца цеснае ўзаемаўвязанае развіццё вытворчага і сацыяльнага комплексаў сталіцы і яе акружэння з мэтай рэгулявання росту Мінска. Гэта дасягаецца шляхам пераразмеркавання часткі народнагаспадарчых функцый паміж Мінскам і гарадамі субрэгіянальнай зоны (Барысаў, Маладзечна, Жодзіна, Стоўбцы, Дзяржынск і інш.). Дзякуючы выгаднаму транспартнаму становішчу, Мінск забяспечаны ўсімі відамі сувязей з перыферыйнай зонай. У цэнтры рэспублікі ўтвараецца радыяльна-лінейны каркас, на якім актыўна фарміруецца буйная сістэма рассялення. Развіццё перыферыйнай зоны патрабуе далейшага ўмацавання і больш

актыўнага павелічэння яе эканамічнага і сацыяльна-культурнага патэнцыялу, паляпшэння ўмоў пражывання насельніцтва.

У параўнанні з іншымі краінамі ў Беларусі менш выражаны тыпова ўрбанізаваныя, агламерыраваныя зоны. Нават многія буйныя гарады (Віцебск, Гродна, Брэст) маюць тыпова сельскае акружэнне з невялікай прыгараднай зонай. Толькі сталічная Мінская сістэма можа прэтэндаваць на агламерыраваную тэрыторыю, дзе ўжо праглядваецца сетка гарадскіх і сельскіх спадарожнікаў сталіцы бліжэйшага і далейшага прыцягнення. Пры гэтым выразна акрэсліваюцца амаль усе формы сацыяльна-эканамічных прасторавых сувязей: вытворчыя (рэсурсныя, тэхналагічныя, экалагічныя); сацыяльна-вытворчыя (працоўныя, размеркавальныя, кіраўнічыя); сацыяльныя (падрыхтоўка кадраў, культурна-бытавое абслугоўванне, інфармацыя, кіраванне); дэмаграфічныя (сямейныя, шлюбныя, сваяцкія); турысцкія, рэкрэацыйныя. У дадзенай сістэме рассялення, як найбольш дасканалай, дзейнічаюць пабуджальныя сілы сацыяльна-эканамічных сувязей паміж цэнтрам сістэмы і яго акружэннем. Для ажыццяўлення гэтых сувязей склалася разгалінаваная і шматпрофільная сістэма камунікацый — транспартных, энергетычных, інфармацыйных. Па гэтых камунікацыях ідуць патокі людзей, прадукцыі, рэсурсаў, энергіі, інфармацыі да цэнтра ТСР і ад яго. На прыкладзе дадзенай сістэмы наглядна відаць, як узмацненне сувязей на новай горадаўтваральнай аснове набывае новыя формы і змест, пры якіх знікае аўтаномнасць пасяленняў, згладжваюцца адрозненні і дыспрапорцыі ва ўзроўні іх развіцця. Там, дзе гэтыя сувязі яшчэ не выяўлены ў такім поўным выглядзе, дзе не створаны ўмовы для іх праяўлення, стрымліваецца і фарміраванне сістэм рассялення.

Фарміраванне ТСР стрымліваецца іншы раз і суб'ектыўнымі фактарамі, калі сістэма гаспадарчага кіравання і планавання фармальна функцыяніруе ў межах адміністрацыйных граніц (абласцей, раёнаў, сельсаветаў), а сістэмы рассялення, якія складваюцца фактычна, не супадаюць з гэтымі граніцамі. Напрыклад, пры наяўнасці 118 раёнаў рэальна фарміруецца каля 20 сістэм рассялення; пры наяўнасці 1479 сельсаветаў фарміруецца не больш 400 мясцовых сістэм. Населеныя пункты асобных раёнаў, напрыклад Смаргонскага, Ашмянскага, больш імкнуцца да Маладзечна, чым да свайго абласнога цэнтра Гродна. Ва ўсіх абласцях, акрамя Мінскай, галоўныя

цэнтры зрушаны ў адносінах да кіруемай імі тэрыторыі, што ўскладняе сувязі, узмацняе ролю «дублёраў», міжраённых цэнтраў, як, напрыклад, Полацк з Наваполацкам у Віцебскай вобласці, Пінск і Баранавічы ў Брэсцкай, Бабруйск у Магілёўскай. Усе гэтыя прыклады гавораць аб тым, што тэрытарыяльная арганізацыя населеных пунктаў і нават адміністрацыйных граніц патрабуе далейшага ўдасканалення.

Адмоўна адбіваецца на рассяленні і такі падыход, калі капітальныя ўкладанні празмерна канцэнтруюцца ў некаторых цэнтрах без дастатковага ўліку іх рэсурсных магчымасцей, што выклікае «перахопліванне» гэтых рэсурсаў у суседняй ТСР, аслабленне зоны яе прыцягнення. Напрыклад, Жлобінская сістэма, якая фарміруецца, вельмі хутка накоплівае свой эканамічны патэнцыял, але яе працоўныя рэсурсы практычна вычарпаны, што выклікае іх прыцягненне з суседняй і без таго працанедастатковай Бабруйскай сістэмы і тым самым падрывае яе дэмаграфічную аснову. Гэты прыклад гаворыць аб тым, як важна сувымяраць аб'ём капітальных укладанняў з працоўным патэнцыялам, а галіновае і тэрытарыяльнае размяшчэнне вытворчасці — з інтарэсамі рассялення.

Паколькі ўсе гарадскія і сельскія населеныя пункты адначасова развіваць не дазваляе эканамічная база і дэмаграфічная аснова, неабходна дакладная ацэнка мясцовых рэсурсных магчымасцей, а ў некаторых выпадках і пераразмеркаванне рэсурсаў. Гэта праблема асабліва абвастрылася з пераходам на новыя ўмовы гаспадарання і зрухамі ў рассяленні, якія выклікала чарнобыльская катастрофа.

Далейшае развіццё сістэмы рассялення ставіць новыя запатрабаванні перад транспартнай інфраструктурай. Неабходна будаўніцтва новых магістралей, электрыфікацыя дарог, паляпшэнне транспартных сувязей паміж гарадамі і сельскімі пасяленнямі, удасканаленне прыгарадных зносін.

Сярод праблем інжынернага забеспячэння населеных пунктаў усё больш складанай з'яўляецца праблема вада- і энергазабеспячэння. Улічваючы, што рэспубліка не мае дастатковых запасаў энергарэсурсаў, складанасць праблемы на сучасным этапе яшчэ больш абвастрылася.

Пасля чарнобыльскай катастрофы у лік першачарговых увайшла праблема рэзервіравання і захавання рэкрэацыйных тэрыторый з каштоўнымі лячэбна-аздараўленчымі і культурна-пазнавальнымі рэсурсамі, якімі ка-

рысталася ці магло карыстацца насельніцтва не толькі Беларусі, але і суседніх краін.

У агульным комплексе рассяленчых праблем асабліую актуальнасць набывае экалагічная праблема, неабходнасць экалагічнай раўнавагі, аздараўлення прыроднага асяроддзя, у якім размешчаны населеныя пункты. Можна сказаць, што на сучасным этапе для рэспублікі гэта самая галоўная сацыяльная праблема.

Гаворачы аб будучым развіцці сістэмы рассялення на тэрыторыі Беларусі, неабходна адзначыць, што ў бліжэйшай перспектыве працэс развіцця населеных пунктаў будзе ажыццяўляцца ў іншых умовах, чым у папярэднія дзесяцігоддзі.

Па-першае, новымі будуць палітычныя ўмовы. Упершыню за ўсю гісторыю свайго існавання этнічная тэрыторыя беларусаў будзе развівацца як самастойная, суверэнная краіна — Рэспубліка Беларусь. Адраджэнне нацыянальнай самабытнасці магчыма знойдзе сваё адлюстраванне і ў некаторых рысах рассялення. Змяніліся ўмовы эканоміка-геаграфічнага становішча Беларусі і характар міжнародных сувязей, што будзе ўплываць на становішча многіх населеных пунктаў, фарміраванне іх насельніцтва.

Па-другое, пачынаюць мяняцца і сацыяльна-эканамічныя ўмовы. Спачатку гэта праявіцца ў гаспадарчай дзейнасці, калі ўсё большыя сферы жыцця ахопяць рыначныя адносіны. Калі пачне рэалізавацца прынцып прыватызацыі зямлі, хутчэй за ўсё зноў ажыве дысперсная (хутарская, фермерская) форма рассялення, якая рэальна магчыма ў першую чаргу ў самых дробнасяленных раёнах Беларускага Паазер'я з іх дробнаконтурнымі сельгасугоддзямі. Новыя формы гаспадарчай дзейнасці і эканамічных адносін паступова пачнуць мяняць вытворчую структуру і функцыі многіх населеных пунктаў. Напрыклад, развіццё індывідуальных форм дзейнасці, прыватызацыя ў сферы паслуг могуць даць стымул для актывізацыі эканамічнага развіцця малых гарадоў і нават малых вёсак.

У сучасны пераходны перыяд стварыліся і цяжкасці ў развіцці населеных пунктаў, паколькі новыя формы арганізацыі жыццядзейнасці яшчэ не ўзмацнелі, а старыя структуры пачалі разбурацца.

Ва ўмовах нарастаючай інфляцыі пагоршыліся фінансавыя магчымасці мясцовых органаў улады і саміх жыхароў, што стрымлівае рэалізацыю праграм па добраўпа-

радкаванню гарадоў і вёсак. Негатыўна выяўляецца і нарастаючы дэфіцыт рэсурсаў, у тым ліку будаўнічых.

Па-трэцяе, развіццё населеных пунктаў будзе ажыццяўляцца ва ўмовах неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі, таму што абсалютная большасць іх не можа нарошчваць свой працоўны патэнцыял, паколькі нясе страты насельніцтва.

Такім чынам, адны ўмовы будуць спрыяць сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму прагрэсу ў развіцці сістэмы рассялення, другія, наадварот, стрымліваць яго. Рэгуляваць гэтым складаным працэсам магчыма толькі з дапамогай эканамічных рычагоў, падмацаваных заканадаўчымі актамі і абгрунтаванымі навуковымі распрацоўкамі.

## 6. УЗДЗЕЯННЕ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ НА ГЕАГРАФІЮ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ

Аварыя, якая здарылася 26 красавіка 1986 г. на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, з'яўляецца самай вялікай катастрофай сучаснасці. Чарнобыльская катастрофа прычыніла страты насельніцтву Беларусі, яе гаспадарцы, прыродным рэсурсам, стварыла надзвычай небяспечнае радыяцыйнае становішча, новыя экалагічныя, сацыяльныя, эканамічныя ўмовы жыццядзейнасці.

Трагічныя вынікі аварыі праяўляюцца ў розных аспектах.

*Эколага-геаграфічны аспект* выражаны ў парушэнні натуральнага стану прыродна-геаграфічнага асяроддзя на многіх тэрыторыях рэспублікі.

Тэрыторыя радыеактыўнага забруджвання — гэта тая частка Беларусі, на якой адзначаецца ўстойлівае забруджванне навакольнага асяроддзя радыеактыўнымі рэчывамі і дзе патрабуецца прыняцце спецыяльных ахоўных мер. На гэтых тэрыторыях шчыльнасць забруджвання глебы радыенуклідамі цэзія-137, стронцыя-90 і плутонія складае адпаведна 1,0; 0,15; 0,01 Кі/кв. км і больш.

У выніку абследаванняў, якія праводзяцца Белгідраметам, інстытутамі Дзяржаграпрома і Акадэміі навук, да канца 1990 г. былі ўжо вядомы фактычна ўсе тыя тэрыторыі рэспублікі, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

У пачатку 1991 г. плошча тэрыторый, забруджаных цэзіем-137— асноўным дозаўтвараючым радыенуклідам,

*Табліца 6.1*

**Размеркаванне плошчы забруджвання цэзіем-137 на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (па стану на студзень 1991 г.)**

| Вобласці | Агульная плошча, тыс. кв. км | Шчыльнасць забруджвання, Кі/кв. км | | | | Усяго забруджана, тыс. кв. км | % ад агульнай плошчы |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1—5 | 5—15 | 15—40 | звыш 40 | | |
| Гомельская | 40,4 | 16,87 | 6,74 | 2,76 | 1,63 | 28,0 | 69,3 |
| Магілёўская | 29,0 | 5,49 | 2,90 | 1,45 | 0,53 | 10,4 | 35,8 |
| Брэсцкая | 32,3 | 3,80 | 0,47 | — | — | 4,3 | 13,2 |
| Мінская | 40,8 | 2,03 | 0,05 | — | — | 2,1 | 5,0 |
| Гродзенская | 25,0 | 1,69 | 0,01 | — | — | 1,7 | 6,8 |
| Віцебская | 40,1 | 0,03 | — | — | — | 0,03 | 0,07 |
| Усяго | 207,6 | 29,91 | 10,17 | 4,21 | 2,16 | 46,45 | 22,4 |

складала 46,5 тыс. кв. км, амаль 1/4 частку ўсёй плошчы Беларусі. На гэтай тэрыторыі знаходзіцца 1,5 тыс. населеных пунктаў, дзе пражывала звыш 1,5 млн. чалавек.

На апублікаваных картах радыяцыйнай абстаноўкі паказаны дзве асноўныя плямы. Адна з іх, найбольш забруджаная,— поўдзень Гомельскай вобласці: Хойніцкі, Брагінскі і Нараўлянскі раёны, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад зоны АЭС. Тут найбольш высокі ўзровень магутнасці дозы гамавыпраменьвання за кошт выпадання радыёнуклідаў у дні аварыі. Жыхары 107 населеных пунктаў з гэтых раёнаў былі эвакуіраваны яшчэ ў 1986 г. На захадзе вобласці радыяцыйная пляма ахапіла землі Ельскага і Лельчыцкага раёнаў, дзе выяўлены арэалы са шчыльнасцю забруджвання цэзіем-137 звыш 17 Кі/кв. км.

Другая вялікая пляма — поўнач Гомельскай і поўдзень Магілёўскай абласцей. Яна ўтварылася ў выніку выпадання радыеактыўных рэчываў з атмасфернымі ападкамі. У гэтай пляме — Веткаўскі, Добрушскі, Чачэрскі, Кармянскі, Буда-Кашалёўскі, Касцюковіцкі, Чэрыкаўскі, Краснапольскі, Слаўгарадскі, Клімавіцкі і Быхаўскі раёны.

Плямы з больш нізкім узроўнем забруджвання выяўлены таксама ў Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай абласцях. Адносна чыстай застаецца толькі тэрыторыя паўночнай часткі ў межах Віцебскай вобласці (табл. 6.1).

Больш за ўсіх пацярпела ад аварыі Гомельская вобласць. Амаль 70% яе плошчы ў той ці іншай ступені аказалася забруджанай. На зямлю Гомельшчыны выпала самая вялікая колькасць радыеактыўных рэчываў. Амаль кожны дзесяты квадратны кіламетр забруджаны такой дозай (больш за 15 і нават за 40 Кі), пры якой пражыванне чалавека з'яўляецца небяспечным. На долю Гомельскай вобласці прыпадае 3/4 такіх небяспечных зямель, дзе гаспадарчая дзейнасць немагчыма.

На зямлі Магілёўскай вобласці таксама ёсць такія арэалы. Яны складаюць 7% ад яе агульнай плошчы. Усяго тут забруджана 36% тэрыторыі. На дзве гэтыя вобласці прыпадае 9/10 агульнай плошчы радыеактыўнага забруджвання ў Рэспубліцы Беларусь.

У Брэсцкай вобласці шчыльнасць забруджвання глебы цэзіем-137 звыш 5 Кі/кв. км вызначана ў Лунінецкім, Пінскім і Столінскім раёнах; у Мінскай — у Валожынскім і Салігорскім. Сустракаюцца і іншыя арэалы, але ўжо з больш нізкай шчыльнасцю.

Паколькі тэрыторыя Беларусі пацярпела ад аварыі асабліва моцна, яна аб'яўлена зонай нацыянальнага экалагічнага бедства, зонай, небяспечнай для жыцця.

Каб забяспечыць больш арганізаваны навукова абгрунтаваны падыход да вырашэння праблемы радыяцыйнай аховы насельніцтва і пераадолення вынікаў аварыі, у 1991 г. быў прыняты спецыяльны Закон аб статусе тэрыторыі, якая падверглася радыеактыўнаму забруджванню. Гэты закон рэгулюе рэжым тэрыторыі, умовы пражывання, ажыццяўлення гаспадарчай, навукова-даследчай і іншай дзейнасці на ёй з мэтай памяншэння сілы ўздзеяння радыяцыі на здароўе насельніцтва.

*Сацыяльна-экалагічны аспект* праяўляецца ў рэзкім парушэнні натуральнага стану асяроддзя пражывання і ўмоў жыццядзейнасці людзей. У небяспецы знаходзіцца здароўе і жыццё цэлай нацыі.

Радыяцыйнае забруджванне ўжо з першых хвілін аварыі выклікала чалавечыя ахвяры (загінуўшыя пры тушэнні пажару, ад празмернага апраменьвання, ад захворванняў і г. д.).

Паводле інфармацыі НДІ радыяцыйнай медыцыны, на працягу 1986—1988 гг. радыенукліды яшчэ не выклікалі рэзкіх захворванняў насельніцтва, не выяўлены былі асаблівыя змены ў агульнай структуры захворванняў, у паказчыках смяротнасці, нават дзіцячай. Але паступова абазначаецца павелічэнне захворванняў шчытападоб-

най залозы (эндэмічны валляк), злаякасных новаўтварэнняў і інш.

Асаблівую трывогу выклікае забеспячэнне ўмоў пражывання людзей, якія засталіся жыць на пацярпеўшых тэрыторыях. Там забруджаны амаль усе прыродна-рэкрэацыйныя цэнтры, зоны адпачынку, лясныя і водныя рэсурсы. Насельніцтва гэтай часткі рэспублікі не мае магчымасці аднаўляць здароўе па месцу жыхарства, не можа карыстацца дарамі прыроды, адпачываць на сваіх рэках і азёрах і нават на свежым паветры. Не ўсе жыхары, як вядома, пападуць на адпачынак у Італію ці Грэцыю. Большасць з іх вымушана жыць у неспрыяльным асяроддзі. Пры гэтым яно не паляпшаецца, а пагаршаецца.

Яшчэ ў пачатку 1991 г. быў распрацаваны Закон «Аб сацыяльнай ахове грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». Ён накіраваны на ахову правоў і інтарэсаў тых грамадзян, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі вынікаў катастрофы, эвакуіраваны або адселены на новае месца жыхарства, ці пражываюць на забруджаных тэрыторыях.

Створаны Беларускі нацыянальны камітэт па радыяцыйнай ахове насельніцтва. Распрацаваны саюзныя і рэспубліканскія канцэпцыі пражывання ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі.

Гранічнай эквівалентнай дозай апраменьвання прыняты паказчык 0,1 бэр ў год. Калі гэты паказчык меншы — няма абмежавання для пражывання; калі большы — праводзяцца ахоўныя меры, у тым ліку і адсяленне з забруджаных тэрыторый на больш чыстыя.

Удзельнікам ліквідацыі вынікаў катастрофы Закон прадугледжвае многія сацыяльна-эканамічныя льготы, розныя формы матэрыяльнай дапамогі.

Грамадзяне, эвакуіраваныя і адселеныя (арганізавана ці самастойна), таксама маюць шмат ільгот. Ім выдаецца грашовая кампенсацыя за страчаныя матэрыяльныя каштоўнасці ці перадаюцца ва ўласнасць новыя. Кампенсуюцца затраты, звязаныя з перасяленнем. Такія грамадзяне ў першую чаргу забяспечваюцца жыллём і маюць ільготы на жыллёвае і культурна-бытавое абслугоўванне.

Тыя грамадзяне, якія пражываюць ці працуюць у небяспечнай зоне, маюць таксама шмат ільгот, атрымліваюць даплаты, якія павінны кампенсаваць прычыненыя ім страты.

Аб'ектам асаблівай увагі з'яўляюцца дзеці, цяжарныя маці, маладыя сем'і.

Чарнобыльская трагедыя стала болем не толькі нашай краіны, але і ўсяго чалавецтва. Генеральная Асамблея ААН у лютым 1991 г. прыняла рэзалюцыю, згодна з якой пашыраецца міжнароднае супрацоўніцтва ў справе пераадолення вынікаў аварыі. Рэспубліку не пакінулі ў бядзе. Яна з'яўляецца аб'ектам увагі і рознабаковай дапамогі як з боку краін Садружнасці, так і з боку замежных краін. Створаны спецыяльныя фонды дапамогі. Гэта чалавечае брацтва дапамагло выстаяць Беларусі ў гады ваеннага ліхалецця. Ёсць надзея, што іменна яно дапаможа выжыць і цяпер, патрэбна толькі ўсе сілы накіраваць на стваральную, а не разбуральную працу.

*Сацыяльна-геаграфічны аспект* праяўляецца праз змены ў рассяленні і тэрытарыяльнай арганізацыі жыццядзейнасці насельніцтва.

На тэрыторыі рэспублікі праведзена надзвычайнае заніраванне, у аснове якога ляжыць асаблівы крытэрый — шчыльнасць забруджвання глебы радыенуклідамі. Па гэтаму крытэрыю выдзелены наступныя зоны.

Зона эвакуацыі — 30-кіламетровая зона вакол Чарнобыльскай АЭС, найбольш пацярпеўшая ад аварыі. У гэтай зоне забараняецца ўсякая гаспадарчая дзейнасць (акрамя спецыяльнай па забеспячэнню радыяцыйнай бяспекі) і ўстанаўліваецца запаведны кантрольна-прапускны рэжым. Галоўная прыкмета зоны — бязлюддзе (паколькі жыхары эвакуіраваны). Зона надзейна абараняецца ад несанкцыяніраванага пранікнення ў яе людзей і ўсіх відаў наземнага транспарту. У гэтай зоне забараняецца пражыванне і знаходжанне людзей, вываз без дазволу дамашніх рэчаў, будаўнічых матэрыялаў, машын, абсталявання, зямлі, торфу, драўніны, раслінных кармоў, лекавых раслін, грыбоў, ягад і г. д.

Затым выдзелены дзве зоны, з якіх прадугледжана абавязковае адсяленне людзей (зона першачарговага адсялення і зона наступнага адсялення).

Зона першачарговага адсялення ўключае тыя землі, дзе шчыльнасць забруджвання цэзіем-137, стронцыем-90 і плутоніем складае адпаведна звыш 40, 3, 0,1 Кі/кв. км. У гэтай зоне без асобага дазволу забараняецца пражыванне насельніцтва, вываз любых матэрыяльных сродкаў, рэсурсаў, прагон і выпас жывёлы, праезд па-за дарогамі агульнага карыстання, правядзенне любых відаў работ, звязаных з парушэннем глебава-

га покрыва. Знаходжанне людзей дапускаецца толькі па спецыяльнаму дазволу і рэгламентуецца па часу адпаведнымі правіламі і нормамі. Таму жыхары населеных пунктаў, якія папалі ў гэту зону, абавязкова павінны быць выселены як мага хутчэй.

Зона наступнага адсялення ўключае тыя землі, дзе шчыльнасць забруджвання адпаведна перавышае 15, 2, 0,05 Кі/кв. км і доза апраменьвання чалавека можа перавысіць 0,5 бэр у год.

Парадак перасялення і віды гаспадарчай дзейнасці вызначаюцца урадам рэспублікі. На землях, якія папалі ў гэту зону, таксама забараняецца без асобага дазволу ўсякае рэсурсавыкарыстанне, правядзенне любых работ, звязаных з парушэннем глебавага покрыва. Для грамадзян, якія пацярпелі ад аварыі і вымушаны пакінуць свае месца жыхарства, пры перасяленні ў чыстыя раёны прадугледжаны рознабаковыя льготы: першачарговае працаўладкаванне, грашовыя і матэрыяльныя кампенсацыі, першачарговае забеспячэнне жыллём і абслугоўванне ўсімі відамі паслуг.

Гэтыя тры зоны знаходзяцца ў рэжыме жорсткага кантролю з дапамогай медыка-біялагічнага і экалагічнага маніторынгу, утрымання тэрыторыі ў належным санітарным і пажарабяспечным стане пры ўмове абмежаванай колькасці працуючых людзей.

Тэрыторыі, дзе шчыльнасць радыеактыўнага забруджвання глебы складае адпаведна ад 5 да 15; ад 0,5 да 2; ад 0,01 да 0,05 Кі/кв. км, а доза апраменьвання перавышае дапушчальную мяжу (0,1 бэр у год), выдзелены як зона з правам на адсяленне. У гэтай зоне ўводзяцца часовыя абмежаванні на ўмовы жыццядзейнасці. Напрыклад, забараняецца вытворчасць і нарыхтоўка прадукцыі, калі яна па ўтрыманню радыенуклідаў перавышае ўстаноўленыя нормы. Забараняецца любая дзейнасць, якая пагаршае радыелагічную сітуацыю. Выробленая ў зоне прадукцыя рэалізуецца толькі пасля радыеметрычнага кантролю. Каб знізіць рызыку захворвання пражываючага насельніцтва, праводзіцца пастаянны дазіметрычны кантроль, радыеэкалагічны маніторынг, дэзактывацыя тэрыторыі, суцэльная газіфікацыя населеных пунктаў, асфальтавае ці бетоннае пакрыццё дарог і г. д. Грамадзяне, якія не жадаюць пражываць на гэтай тэрыторыі, маюць права на перасяленне.

Тэрыторыя, дзе шчыльнасць забруджвання глебы цэзіем-137 менш за 5 Кі/кв. км і доза апраменьвання не

перавышае дапушчальную мяжу, класіфікуецца як з о н а п р а ж ы в а н н я. Але і тут прыродакарыстанне і ўсякая гаспадарчая дзейнасць павінны строга адпавядаць патрабаванням норм радыяцыйнай бяспекі. У гэтай зоне таксама праводзяцца ўсе тыя меры, якія накіраваны на зніжэнне рызыкі захворвання насельніцтва.

Астатняя тэрыторыя рэспублікі лічыцца ўмоўна чыстай, але і яна будзе рэгулярна падвяргацца радыелагічнаму кантролю.

Такім чынам, новае экалагічнае становішча падзяліла тэрыторыю рэспублікі на тры зоны: прыгодную, малапрыгодную і непрыгодную для жыцця. У першай (3/4 тэрыторыі) яшчэ параўнальна спрыяльнае і экалагічна чыстае асяроддзе. Гэта частка рэспублікі вымушана цяпер узяць на сябе ўсю адказнасць за жыццезабеспячэнне ўсяго насельніцтва і канцэнтраваць сілы, каб выйсці з цяжкага становішча. Ёй жа давядзецца прыняць і асноўную частку тых перасяленцаў, якія павінны назаўсёды ці часова пакінуць забруджаныя зоны.

Другая частка рэспублікі (20% яе плошчы) можа стаць прыгоднай для жыццядзейнасці, але пры ўмове вельмі значных дадатковых затрат і абмежаваных відаў рэсурсавыкарыстання. Каб вярнуць гэтай тэрыторыі ранейшы патэнцыял, пазбавіць ад радыяцыйнай небяспекі, спатрэбяцца сродкі і час.

Трэцяя частка (каля 3%) на доўгі час выбывае з гаспадарчага выкарыстання. Яна вернецца ў гэты стан тады, калі будзе экалагічна чыстай. Страчаны ёю дэмаграфічны і эканамічны патэнцыял неабходна кампенсаваць за кошт другіх тэрыторый рэспублікі. Частку гэтай кампенсацыі бяруць на сябе іншыя краіны СНД і нават замежныя дзяржавы, прадастаўляючы месца жыхарства, працы і матэрыяльную дапамогу перасяленцам.

*Экістычны аспект* праяўляецца ў геаграфіі населеных пунктаў.

Сельскія і гарадскія населеныя пункты, якія папалі ў адпаведныя зоны па шчыльнасці радыеактыўнага забруджвання і па прыгоднасці для жыццядзейнасці, дзеляцца на некалькі катэгорый (табл. 6.2).

У адпаведнасці з папярэднімі ацэначнымі нарматывамі ў першую чаргу адсяленню належаць жыхары тых пунктаў, якія знаходзяцца за мяжой празмерна высокага радыеактыўнага забруджвання, г. зн. больш за 40 Кі/кв. км. Налічвалася больш за 100 такіх вёсак, у іх пражывала амаль 8 тыс. сямей.

*Табліца 6.2*

**Размеркаванне населеных пунктаў Гомельскай і Магілёўскай абласцей па ступені радыяцыйнага забруджвання, 1989 г.**

| Раёны | Усяго населеных пунктаў на 1.01.1986 г. | З іх у зонах забруджвання, Кі/кв. км | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 30-кіламетровая зона адсялення | больш за 40 | ад 15 да 40 | ад 5 да 15 | менш за 5 |
| | | *Гомельская вобласць* | | | | |
| Брагінскі | 136 | 32 | 1 | 6 | 42 | 53 |
| Хойніцкі | 99 | 22 | 4 | 19 | 19 | 11 |
| Нараўлянскі | 74 | 20 | 2 | 34 | 14 | 4 |
| Веткаўскі | 141 | — | 29 | 51 | 60 | — |
| Добрушскі | 108 | — | 12 | 9 | 8 | 38 |
| Чачэрскі | 149 | — | 2 | 17 | 117 | 13 |
| Буда-Кашалёўскі | 279 | — | — | 11 | 82 | 124 |
| Кармянскі | 102 | — | — | 8 | 94 | — |
| Ельскі | 80 | — | — | — | 53 | 27 |
| Лельчыцкі | 75 | — | — | — | 11 | 64 |
| Лоеўскі | 84 | — | — | — | 21 | 62 |
| Мазырскі | 93 | — | — | — | 3 | 61 |
| Рагачоўскі | 215 | — | — | — | 12 | 37 |
| Гомельскі | 189 | — | — | — | — | 77 |
| Жыткавіцкі | 108 | — | — | — | — | 46 |
| Жлобінскі | 158 | — | — | — | — | 71 |
| Калінкавіцкі | 129 | — | — | — | — | 28 |
| Рэчыцкі | 195 | — | — | — | — | 195 |
| Светлагорскі | 102 | — | — | — | — | 9 |
| | | *Магілёўская вобласць* | | | | |
| Краснапольскі | 172 | — | 37 | 73 | 72 | — |
| Слаўгарадскі | 108 | — | 4 | 24 | 80 | — |
| Чэрыкаўскі | 121 | — | 4 | — | 20 | 97 |
| Крычаўскі | 116 | — | — | — | 46 | — |
| Магілёўскі | 296 | — | — | — | — | 93 |
| Чавускі | 172 | — | — | — | — | 114 |

Заўвага: у астатніх раёнах населеныя пункты і тэрыторыі вакол іх лічацца ўмоўна чыстымі.

Надзвычай забруджанымі лічацца таксама і населеныя пункты ў зоне ад 15 да 40 Кі/кв. км, яны ацэньваюцца як непрыгодныя для працяглага пражывання людзей. Усе астатнія пасяленні, дзе ўзровень радыяцыі параўнаўча нізкі, захоўваюць сваё існаванне, але патрабуюць пастаянных мер кантролю і аховы для падтрымання жыццяздольнасці.

Праблема вымушанага адсялення парадзіла шэраг не менш складаных сацыяльных праблем, сярод іх: забеспячэнне жыллём і прадуктамі харчавання, усім комплексам культурна-бытавога і транспартнага абслугоўвання, вытворчай базай для працаўладкавання мнагатысячнай масы людзей, якія перасяляюцца. У гэтай сувязі практыкуецца некалькі варыянтаў рашэння перасяленчых праблем.

Адзін з іх прадугледжвае падсяленне сямей ці цалкам вёсак да населеных пунктаў у незабруджаных раёнах рэспублікі з улікам магчымасцей працаўладкавання і выкарыстання гатовай вытворчай і сацыяльнай інфраструктуры. Гэты варыянт параўнаўча танны, але з ім звязаны многія іншыя сацыяльна-эканамічныя і маральна-псіхалагічныя праблемы ў сувязі з павелічэннем дэмаграфічнай нагрузкі.

Другі варыянт прадугледжвае будаўніцтва новых жылых зон, пасёлкаў і арганізацыю тэрыторый для перасялення цэлых гаспадарак і вёсак. Гэта форма больш прымальна для перасяленцаў, але самая дарагая для дзяржавы.

Трэці варыянт — індывідуальныя формы перасялення ў іншыя раёны СНД і нават у замежныя краіны.

Чацвёрты варыянт — стварэнне ахоўных мер для пражывання ў тых населеных пунктах, якія застаюцца на забруджаных тэрыторыях.

Трэба ўлічваць, што акрамя сельскіх пасяленняў на забруджаных тэрыторыях аказаліся і многія гарады. Так, у зоне ад 1 да 5 Кі/кв. км размяшчаецца самы буйны горад паўднёвай Беларусі — Гомель, з насельніцтвам 0,5 млн. чалавек, і іншыя буйныя прамысловыя цэнтры: Рэчыца (69 тыс.), Мазыр (100 тыс.), Калінкавічы (40 тыс.), Рагачоў (36 тыс.). На граніцы з гэтай зонай знаходзіцца Магілёў і Жлобін.

Яшчэ горшыя ўмовы склаліся для многіх малых гарадоў. Напрыклад, у зоне ад 5 да 15 Кі/кв. км знаходзяцца Добруш, Хойнікі, Ельск, Буда-Кашалёва, Чачэрск, Слаўгарад, Чэрыкаў, Краснаполле. У зоне з максімальным забруджваннем (звыш 15 і 40 Кі на кв. км) аказаліся Брагін, Нароўля, Ветка, Карма.

Нягледзячы на тое, што ва ўмовах гарадскога асяроддзя чалавеку лягчэй абараніцца ад радыяцыйнага ўздзеяння, і тут цяжкасцей узнікла вельмі многа. Аднак, улічваючы ахоўны патэнцыял гарадоў, іменна ў гарады накіроўваюцца ў першую чаргу перасяленцы з наваколь-

ных вёсак. Тут яны разлічваюць на лепшыя ўмовы жылля, харчавання, абслугоўвання і на больш бяспечную працу. Таму ні адзін з пералічаных гарадоў не змяніў яшчэ свайго становішча. Нават размешчаныя амаль у эпіцэнтры аварыі Брагін і Нароўля да пачатку 1991 г. не зменшылі колькасць насельніцтва, паколькі на месца выбываючых прыбываюць новыя жыхары, у першую чаргу з вёсак свайго раёна і нават з іншых раёнаў СНД, дзе, мабыць, умовы жыцця яшчэ горшыя.

Усе гэтыя перамяшчэнні выклікаюць змены ў характары рассялення: мяняецца колькасць населеных пунктаў як у зонах адсялення, так і ў зонах прыёму; адпаведна змяншаецца і павялічваецца люднасць населеных пунктаў; многія пасяленні мяняюць свой функцыянальны профіль, структуру гаспадарчай дзейнасці, насельніцтва і працоўных рэсурсаў. Таму другая палавіна 80-х гг. XX стагоддзя ўвойдзе ў гісторыю, як перыяд рэзкіх зрухаў у рассяленні на тэрыторыі рэспублікі.

*Дэмагеаграфічны аспект* чарнобыльскай катастрофы суправаджаецца неспадзяванымі зменамі ў працэсах узнаўлення і структуры насельніцтва. Гэтыя змены носяць як бы ступеньчаты характар. Спачатку яны рэзка праявіліся ў тых мясцовасцях, якія больш за ўсіх пацярпелі ад аварыі. Затым яны закранулі блізляжачыя і менш пацярпеўшыя раёны, якія першымі аказаліся на шляху перамяшчэння людскіх патокаў, атрымаўшых назву «экалагічныя бежанцы». На карце рэспублікі паявілася зона празмерных страт насельніцтва, якая паступова пераходзіць у «дэмаграфічную пустыню» (гл. рыс. 1.2, *б*). У далейшым хваля руху пераступіла межы Гомельскай і Магілёўскай абласцей і накіравалася ў цэнтральныя заходнія і паўночныя раёны.

Галоўны дэмаграфічны зрух выклікала міграцыя насельніцтва. Сведчаннем рэзкага парушэння жыллёвага асяроддзя з'явіліся в ы м у ш а н ы я  м і г р а ц ы і ў форме эвакуацыі, адсялення, перасялення, эміграцыі. Слова «эвакуацыя», яшчэ не забытае з часоў Айчыннай вайны, зноў увайшло ва ўжытак на беларускай зямлі. Гэта заўсёды самая нечаканая, экстранная і цяжкая акцыя перамяшчэння людзей, вымушаных пакінуць усё набытае гадамі і перасяліцца на новае месца.

У першы год пасля аварыі было эвакуіравана 25 тыс. жыхароў са 107 населеных пунктаў.

Формай вымушаных перамяшчэнняў з'явілася адсяленне жыхароў з найбольш пацярпеўшых вёсак. Гэты

працэс больш павольны, але не менш балючы для тых, хто павінен змяніць сваё прывычнае месца жыхарства. У зону адсялення пападае большасць населеных пунктаў трох раёнаў Гомельскай вобласці: Брагінскага, Нараўлянскага і Хойніцкага. Акрамя таго, неабходна правесці адсяленне з ачаговых пунктаў іншых раёнаў, дзе пражыванне небяспечна. Гэтыя арганізаваныя акцыі перамяшчэння многіх тысяч людзей пасля чарнобыльскай катастрофы атрымалі назву «экалагічная дэпартацыя».

Формай такіх жа вымушаных міграцый з'яўляюцца індывідуальныя, самастойныя перасяленні ў пошуках больш чыстага прыроднага асяроддзя, выкліканыя імкненнем захаваць жыццё і здароўе будучых пакаленняў. Гэта мэта штурхае людзей і на эміграцыю (аб эміграцыі гл. раздзел 2.2).

Асаблівыя зрухі ў міграцыі насельніцтва перажывае Гомельская вобласць. Можна сказаць, ёй уласціва «вялікае перасяленне народаў». Спачатку пасля аварыі гэты працэс ахапіў сельскую мясцовасць паўднёва-ўсходняй часткі вобласці. Толькі за адзін 1986 г. міграцыйныя страты сельскага насельніцтва павялічыліся ў 3 разы, а ў самых пацярпеўшых ад аварыі раёнах — у дзесяткі разоў, галоўным чынам за кошт эвакуацыі.

У 1990 г. аб'ём міграцыйнага выбыцця павялічыўся з тэрыторыі Веткаўскага, Буда-Кашалёўскага, Гомельскага, Чачэрскага, Рэчыцкага, Ельскага, Добрушскага раёнаў. Агульныя міграцыйныя страты дасягнулі рэкорднай за ўвесь пасляваенны час лічбы — 46 тыс. чалавек, з якіх амаль 12 тыс. прыпала на эміграцыю. Упершыню адмоўнае сальда міграцыі мелі гарады вобласці, у тым ліку г. Гомель (гл. табл. 2.2).

На тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў першыя гады пасля аварыі асаблівых зрухаў у міграцыі не было. Гэта тэрыторыя і без таго мела вялікія страты ў выніку міграцыі (20—25 тыс. чалавек у год). З 1989 г. адсяленне пачалося і з гэтай вобласці, у першую чаргу з найбольш пацярпеўшага Краснапольскага раёна.

Неспрыяльнае экалагічнае становішча вядзе да зніжэння натуральнага прыросту насельніцтва ўсёй рэспублікі. У 1990 г. ён упаў да адзнакі 3‰ галоўным чынам у выніку далейшага зніжэння нараджальнасці. У многім гэту карціну на сучасным этапе вызначаюць раёны паўднёвай зоны, дзе паказчыкі натуральнага прыросту насельніцтва рэзка пагоршыліся. Маладыя сем'і імкнуцца выехаць разам са сваімі дзяцьмі, а тыя, што засталі-

ся, баяцца нарадзіць дзяцей перад пагрозай вынікаў радыяцыі. У многіх вёсках засталіся адны пажылыя і старыя людзі, працэс узнаўлення насельніцтва замест дзвюх састаўляючых — нараджальнасці і смяротнасці — застаецца з адной — смяротнасцю. Працэс дэпапуляцыі ахапіў усе сельскія раёны Гомельскай вобласці, натуральныя страты дасягнулі адмоўнай адзнакі — 3‰, а ў самых пацярпеўшых раёнах ад — 4 да — 10‰. Знізіўся натуральны прырост і сярод гараджан, напрыклад, у Брагіне — у 4 разы (з 16 да 4‰), у Ветцы — у 3 (з 13 да 4‰), у Гомелі — у 2 разы.

Парушэнні адбываюцца як у працэсе нараджальнасці, так і смяротнасці. У выніку міграцыйных страт маладых сямей і змяншэння колькасці нараджэнняў сярод застаўшыхся хутка падае каэфіцыент нараджальнасці. Пагаршэнне стану здароўя насельніцтва і яго далейшае пастарэнне вядуць да павелічэння смяротнасці.

Адбываюцца парушэнні і ў структуры насельніцтва па ўзросту за кошт выбыцця маладых сямей і дзяцей.

Такім чынам, агульная дэмаграфічная сітуацыя ў рэспубліцы працягвае пагаршацца.

*Сацыяльна-эканамічны аспект* праяўляецца, з аднаго боку, у велізарных парушэннях і стратах усіх відаў рэсурсаў (тэрытарыяльных, прыродных, працоўных, матэрыяльных, тэхнічных, фінансавых), а з другога боку, у дадатковых затратах. І тое і другое ў канчатковым выніку негатыўна ўплывае на матэрыяльнае становішча і ўзровень жыцця насельніцтва.

Упершыню ў гісторыі беларускага этнасу многія яго этнічныя тэрыторыі становяцца непрыгоднымі для жыцця і гаспадарання. Яны вымушаны аддаць сваё галоўнае багацце — людскія рэсурсы, паколькі сталі небяспечнымі для выкарыстання прыродныя рэсурсы. Выходзяць са строю і становяцца безжыццёвымі створаныя ўпартай працай чалавека аб'екты матэрыяльнай культуры: населеныя пункты, іх жыллёвы фонд, вытворчыя збудаванні, аб'екты культурна-бытавога абслугоўвання і г. д. Большасць з іх пабудавана ў пасляваенныя 50-я гады, абноўлена, добраўпарадкавана — у 60—70-я гады. Гэта значыць, што вытворчыя і невытворчыя фонды былі «маладыя» па ўзросту і маглі яшчэ доўга служыць людзям.

Матэрыяльны ўрон вылічваецца ў мільярдах рублёў і напамінае страты ваенных гадоў. І гэта толькі адна частка агульнага ўрону.

Другая складаемая — новыя дадатковыя і неправ-

бачаныя расходы, якія патрабуюцца на забеспячэнне ўсім неабходным той масы людзей, якія перасяляюцца: будаўніцтва жылля, дарог, аб'ектаў абслугоўвання і вытворчасці, забеспячэнне прадуктамі і г. д.

Трэцяя складаемая — затраты на мерапрыемствы па аздараўленню навакольнага асяроддзя ў пацярпеўшых раёнах: дэзактывацыя, аграмеліярацыя, дазіметрычны і іншы кантроль, закупка прадуктаў харчавання, медыцынскага абсталявання і медыкаментаў, выплаты і льготы, аздараўленчы адпачынак і г. д.

Рэспубліка ў экстранным парадку вымушана пераразмеркаваць свае фінансавыя і іншыя рэсурсы ў карысць пацярпеўшых тэрыторый і іх «дублёраў» па адсяленню. У фінансавым бюджэце з'явіўся дадатковы расходны артыкул — на ліквідацыю вынікаў чарнобыльскай аварыі.

Асаблівы ўрон нанесены сельскагаспадарчай вытворчасці і харчовай базе. Радыеактыўнае забруджванне тэрыторыі стварыла такія ўмовы, пры якіх на працягу многіх дзесяцігоддзяў эксплуатацыя сельскагаспадарчых угоддзяў будзе патрабаваць перагляду структуры землекарыстання, правядзення спецыяльных аграхімічных і агратэхнічных мерапрыемстваў. У першыя гады пасля аварыі ў зоне адсялення было ліквідавана 20 калгасаў і саўгасаў, на плошчы ў 100 тыс. га спынена ўсялякая гаспадарчая дзейнасць. У пачатку 1990 г. з сельскагаспадарчага ўжытку было выведзена больш за 50 тыс. га сельгасугоддзяў, спісанню належыць яшчэ звыш 140 тыс. га, што прыкладна адпавядае плошчы 80 калгасаў. Значыць, рэспубліка страціць буйнейшы сельскагаспадарчы раён (табл. 6.3).

Самы вялікі працэнт страчаных угоддзяў (звыш палавіны) у Веткаўскім, Нараўлянскім, Кармянскім, Чачэрскім раёнах. Чацвёртую частку страцяць Добрушскі, Хойніцкі, Брагінскі раёны. Іх былыя плошчы з цягам часу ператворацца ў лясныя масівы.

Акрамя таго, радыяцыйная забруджанасць выключае з ужывання масу прадукцыі, зніжае аб'ём яе рэалізацыі, што ў сваю чаргу адбіваецца адмоўна на даходах рэспублікі і яе жыхароў.

Масавае выбыццё працаздольнага насельніцтва ставіць у цяжкае становішча выкананне работ на абжытых тэрыторыях. Гаспадаркі рэспублікі прыкладваюць вялікія намаганні, каб не знізіць вытворчасць прадукцыі. Нават у Гомельскай вобласці пры ўсіх яе стратах, дзякуючы павышэнню ўраджайнасці амаль да 30 ц/га, ва-

*Табліца 6.3*

**Узровень сельскагаспадарчай асвоенасці і радыеактыўнай забруджанасці раёнаў Гомельскай вобласці (1990 г.)**

| Раёны | Плошча, тыс. га | | Узровень заселенасці, чалавек на 100 га сельгасугоддзяў | Спісана ці належыць спісанню сельгасугоддзяў пасля аварыі | |
|---|---|---|---|---|---|
| | тэрыторыі | сельгасугоддзяў | | тыс. га | % |
| Брагінскі | 190 | 52 | 45 | 11,4 | 22,2 |
| Веткаўскі | 160 | 50 | 42 | 45,5 | 91,2 |
| Хойніцкі | 200 | 46 | 77 | 11,6 | 25,2 |
| Нараўлянскі | 160 | 20 | 99 | 11,5 | 57,5 |
| Чачэрскі | 120 | 39 | 57 | 23,5 | 60,0 |
| Кармянскі | 90 | 42 | 44 | 25,1 | 60,0 |
| Добрушскі | 150 | 80 | 59 | 23,0 | 28,7 |
| Буда-Кашалёўскі | 160 | 100 | 51 | 13,4 | 13,4 |
| Жыткавіцкі | 290 | 63 | 81 | 3,8 | 6,0 |
| Жлобінскі | 210 | 93 | 91 | 11,7 | 12,5 |
| Калінкавіцкі | 280 | 98 | 80 | 3,2 | 3,2 |
| Лельчыцкі | 320 | 45 | 75 | 2,6 | 5,8 |
| Лоеўскі | 100 | 48 | 40 | 1,6 | 3,3 |
| Мазырскі | 160 | 40 | 288 | 3,8 | 9,5 |
| Акцябрскі | 140 | 44 | 45 | 0,5 | 0,1 |
| Петрыкаўскі | 280 | 84 | 58 | 1,7 | 0,2 |
| Гомельскі | 210 | 87 | 689 | 0,3 | 0,2 |
| Рэчыцкі | 270 | 106 | 118 | 2,4 | 0,1 |
| Рагачоўскі | 210 | 109 | 69 | 0,7 | 0,7 |
| Светлагорскі | 180 | 64 | 151 | 0,2 | 0,3 |
| Ельскі | 140 | 40 | 66 | 0,3 | 5,7 |

лавы збор зерня ў 1986—1989 гг. быў самы вялікі за мінулыя 20 гадоў (1,1 млн. т). Увогуле за ўказаныя тры гады пасля аварыі, як сведчаць даныя статыстыкі, рэспублiцы ўдалося вырабіць нават больш зерня, цукровых буракоў, мяса, малака, яек.

Праблемай застаецца дэзактывацыя зямель і пошук тэхналогіі вытворчасці прадукцыі на забруджаных тэрыторыях, прыстасаванне жыццядзейнасці чалавека да незвычайнага навакольнага асяроддзя.

У ліку сацыяльна-эканамічных парушэнняў неабходна выдзеліць непрадбачаныя дадатковыя затраты працы, якія ўскладнілі і без таго напружаны працоўны баланс рэспублікі.

Вялікіх працоўных затрат каштаваў працэс эвакуацыі мнагатысячнай масы людзей. Для эвакуіраваных будаваліся новыя пасёлкі, кватэры, аб'екты абслугоўвання.

У зоне, дзе засталося насельніцтва, дэзактывацыяй былі ахоплены сотні населеных пунктаў, вывезены тысячы кубаметраў грунту, пабудаваны дарогі з цвёрдым пакрыццём, новыя лініі водаправода, водазабораў, знесена мноства старых забудоў і г. д.

Створана спецыяльная служба аховы здароўя, якая праводзіць масавыя абследаванні, дыспансерызацыю, аздараўленчыя меры, медыцынскія назіранні. Аб'ектам асаблівай увагі з'яўляюцца дзеці і цяжарныя маці. У цэлым на Міністэрства аховы здароўя ўскладзены адказныя і складаныя задачы па выратаванню ад бяды 10-мільённага насельніцтва.

Перад рэспублікай паўстала праблема вытворчасці новых відаў тэхнікі, спецадзення, дазіметрычных прыбораў, медпрэпаратаў і нават новай тэхналогіі вытворчасці чыстых прадуктаў харчавання.

Узнікла патрэба ў асаблівых навуковых даследаваннях, якія адцягнулі ад планавай тэматыкі асноўныя навуковыя сілы рэспублікі. Праведзена вялікая і многаразовая работа па абследаванню тэрыторыі, яе жыхароў, населеных пунктаў. Складзены падрабязныя карты радыяцыйнага становішча. Распрацоўваюцца новыя праектныя заданні па тэрытарыяльнай арганізацыі вытворчасці і насельніцтва.

Абвастрыліся праблемы, звязаныя з цякучасцю кадраў. Гэта тэма патрабуе спецыяльных даследаванняў, якія дапамаглі б адказаць на пытанні аб тым, якімі відамі працы рэальна магчыма і неабходна займацца на пацярпеўшых тэрыторыях; якія ўмовы неабходна ствараць для пражывання, каб захаваць здароўе людзей; як пазбегнуць празмернага абароту працоўнай сілы і не падвяргаць радыяцыйнаму ўздзеянню новыя кантынгенты працаўнікоў.

Непрадбачаныя карэктывы ўносіць жыццё і ў працоўны баланс тых раёнаў, якія прымаюць перасяленцаў. Ім неабходна даць магчымасць для працаўладкавання тым, хто перасяліўся, стварыць адпаведную вытворчую базу ці падзяліцца сваімі працоўнымі месцамі. Гэта ў сваю чаргу патрабуе арганізацыі перападрыхтоўкі кадраў. Трэба ўлічваць, што ўсе гэтыя праблемы абрушыліся на рэспубліку ў нялёгкі і без таго перыяд перабудовы, калі старыя структуры ўжо працуюць непаўнацэнна, а новыя яшчэ не ўступілі ў сілу.

*Маральна-псіхалагічны аспект* праяўляецца ў настроі і паводзінах людзей, што ў сваю чаргу адбіваецца на ра-

шэнні многіх іншых праблем. Напрыклад, праблема адсялення на справе аказалася намнога складанейшай (цяжэйшай), чым меркавалася ў папярэдніх праектных распрацоўках. Далёка не кожная сям'я выказвае жаданне пакінуць свае родныя мясціны, нават калі ў іх небяспечна жыць. Гэты настрой зразумелы, і яго неабходна ўлічваць. У сем'ях, якія засталіся, як правіла пажылыя людзі, аб іх неабходна паклапаціцца, ім патрэбна дапамога, паўсядзённыя паслугі.

Рэальны пераезд для многіх людзей звязаны з вялікімі цяжкасцямі, і яны пры ўсім жаданні не могуць перасяліцца. Псіхалагічным бар'ерам часта з'яўляецца непрымальнасць іншага асяроддзя пражывання, боязь адаптацыі ў новых умовах, перамены работы ці прафесіі, ізаляцыі ад родных і блізкіх. Таму ўсё часцей узнікае неабходнасць перасялення цалкам усёй гаспадаркай, прадпрыемствам ці ўсёй вёскай. Гэта ў сваю чаргу стварае праблему комплекснай арганізацыі новай тэрыторыі для жыццядзейнасці калектыву.

У працэсе перасялення не заўсёды супадаюць інтарэсы дзяржавы і асобы. Напрыклад, з эканамічнага пункту гледжання мэтазгодна перасяляць працоўныя рэсурсы туды, дзе яны найбольш патрэбны, у той час як большасць сямей накіроўваецца туды, дзе лепшыя ўмовы жыцця. Так, многія сем'і выказваюць жаданне перасяліцца толькі ў гарады, другія жадаюць выехаць за межы рэспублікі ў краіны СНД, трэція накіроўваюцца ў замежныя краіны.

Каб прыдаць працэсу перасялення больш арганізаваны характар і накіраваць міграцыю ў патрэбным напрамку, неабходна, па-першае, вывучаць і ведаць пажаданні людзей, па-другое, у месцах прыёму перасяленцаў ствараць такія ўмовы жыцця і працы, якія маглі б кампенсаваць страты месца былога жыхарства. Сацыяльная справядлівасць патрабуе, каб і без таго вымушаныя перасяленні не ператварыліся ў прымусовыя, каб у людзей быў выбар жаданага месца працы і жыхарства.

Праблемай з'яўляецца не толькі перасяленне, але і працаўладкаванне на новым месцы з улікам прафесійнай падрыхтоўкі перасяленцаў і рэальнай магчымасці дадзенай мясцовасці. Таму многія працаздольныя адчуваюць маральны ўрон ад незадаволенасці ўмовамі працы, вымушаны прыстасоўвацца да тых, якія ёсць.

Тыя сем'і, якія пражываюць на забруджанай тэрыторыі, заўсёды адчуваюць нервовы стрэс і страх перад

небяспекай анкалагічных захворванняў, прыроджаных анамалій, генетычных уздзеянняў, што таксама адбіваецца на паводзінах, настроях і стане здароўя людзей. Радыефобія — гэта не толькі форма неўрозу, але і сацыяльная праблема.

Асабліва цяжка перажываюць разрыў сямейных сувязей дзеці, якія вымушаны жыць падоўгу без сваіх бацькоў у санаторыях, інтэрнатах, аздараўленчых цэнтрах, у чужых сем'ях і г. д. Змена ўмоў іх быту, харчавання, адаптацыя ў новых калектывах — усё гэта патрабуе значнага напружання дзіцячага арганізму і адбіваецца на здароўі дзяцей.

